

Нягледзячы на дзейную сістэму кантролю за будаўнічымі работамі і расходаваннем на іх сродкаў, арганізацыі часта дапускаюць парушэнні, якія прыводзяць да завышэння кошту работ. СТАР 4



Чым бліжэй да быццам бы прадказанай календаром індзейцаў мая даты заканчэння ўсяго існага, тым больш інфармацыйны ціск з гэтай нагоды мы адчуваем. СТАР 5



Дэльфіны надзвычай чулыя, яны па-сяброўску ставяцца да людзей. А дэльфінатэрапія цяпер з'яўляецца ўжо прызнаным ва ўсім свеце неспецыфічным метадам узмацнення ахоўных сіл арганізма і рэабілітацыі. СТАР 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

19 СНЕЖНЯ 2012 г. СЕРАДА № 244 (27359) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА НАКІРАВАЎСЯ Ў МАСКВУ ДЛЯ ЎДЗЕЛУ Ў САМІТАХ АДКБ, ЕЎРАЗЭС І МЫТНАЙ «ТРОЙКІ»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваўся з рабочым візітам у Расійскую Федэрацыю, дзе 19 снежня прыме ўдзел у сесіі Савета калектыўнай бяспекі АДКБ, пасяджэнні Міждзяржаўнага савета ЕўрАзЭС, а таксама пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета.**

Чакаецца, што на сесіі СКБ АДКБ будуць падведзены вынікі дзейнасці арганізацыі за 2012 год, вызначаны прыярытэтныя напрамкі работы на будучы год, абмеркаваны тэндэнцыі развіцця міжнароднай абстаноўкі і меры па ўдасканаленні сістэмы калектыўнай бяспекі. У час пасяджэння Міждзяржсавета ЕўрАзЭС плануецца разгледзець актуальныя пытанні дзейнасці супольніцтва, выканання і планавання яго бюджэту. На пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета ўвага прэзідэнтаў Беларусі, Казахстана і Расіі будзе засяроджана на пытаннях далейшага развіцця і паглыблення інтэграцыйных працэсаў.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## У БЕЛАРУСІ ДА КАНЦА ГОДА БУДУЦЬ РЭКАНСТРУЯВАНЫ 723 МАЛОЧНАТАВАРНЫЯ ФЕРМЫ

**У Беларусі да канца 2012 года будуць рэканструяваны 723 малочнатаварныя фермы, што складае 60 працэнтаў ад запланаванага. Аб завяршэнні рэканструкцыі МТФ ішла размова ўчора на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў, якое прайшло пад старшынствам прэм'ер-міністра Міхаіла Мясніковіча, перадае БЕЛТА.**

Міхаіл Мясніковіч нагадаў, што па ўдакладненым плане рэканструкцыю і мадэрнізацыю неабходна правесці на 1208 малочнатаварных фермах. «Гэта павінны быць не проста фермы, на якіх будуць выкананы нейкія касметычныя работы, на іх павінна быць праведзена глыбокая мадэрнізацыя, каб гэта былі сучасныя аб'екты малочнатаварнай вытворчасці», — сказаў прэм'ер. У адпаведнасці з праграмай мадэрнізацыі ў Брэсцкай вобласці неабходна стварыць 188 сучасных ферм, Віцебскай — 228, Гомельскай — 191, Магілёўскай — 170, Гродзенскай — 108, найбольш у Мінскай — 323.

Як адзначыў міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Леанід Заяц, згодна з даручэннем кіраўніка дзяржавы, мадэрнізацыя ферм праводзіцца пераважна за кошт уласных сродкаў сельгасарганізацый пры абавязковай устаноўцы сучаснага даільна-малочнага абсталявання. Паводле папярэдняй ацэнкі аблвыканкамаў, для выканання работ у 2012 годзе неабходна Br10,2 трлн. Цяпер на аб'ектах асвоена Br4,4 трлн, або 43 працэнты ад запланаванага. Тым не менш арганізацыі адзначаюць недахоп сродкаў на рэканструкцыю, у тым ліку на закупку абсталявання. Аблвыканкамы правялі карэкціроўку пералікаў сельгасарганізацый, у якіх у 2012 годзе будзе ажыццёўлена рэканструкцыя МТФ за кошт уласных сродкаў. Цяпер з 1208 ферм рэканструкцыя праводзіцца на 995.

На рэканструкцыі і мадэрнізацыі ферм у рэспубліцы задзейнічана 15,8 тыс. чалавек. Праводзіцца дадатковая работа па стварэнні праектна-каштарыснай дакументацыі на аб'екты, якія рэканструююцца. Але распрацавана толькі 1072 камплекты дакументацыі з неабходных 1088. Найменшая гатоўнасць праектнай дакументацыі адзначана ў Віцебскай вобласці.

Паводле даных на 7 снежня, фактычна гатовы да эксплуатацыі 617 даільных залаў з запланаваных 1164 даільна-малочных блокаў. Леанід Заяц падкрэсліў, што ўрадам прыняты неабходныя меры па выкананні даручэння кіраўніка дзяржавы па арганізацыі фінансавання, закупцы даільнага абсталявання, патанненні будаўнічых матэрыялаў і праектных работ.

■ Стыхія

## СУПРАЦЬ НАВАЛЫ — УСЕ СІЛЫ І СРОДКІ

**У сувязі з рэзкім пагаршэннем умоў надвор'я, выкліканых узмацненнем халоднага антыцыклону, на тэрыторыі Мінска ўведзены рэжым функцыянавання гарадской падсістэмы дзяржаўнай сістэмы папярэджання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый «Павышаная гатоўнасць».**

Згодна з адпаведным распараджэннем Мінгарвыканкама, усім кіраўнікам прадпрыемстваў і арганізацый, незалежна ад формаў уласнасці і ведамаснай падпарадкаванасці, ва ўзаемадзеянні з камунальнымі службамі неабходна прыцягнуць усе сілы і сродкі, што маюцца, для ліквідацыі наступстваў снегападаў. Міністэрства па надзвычайных сітуацыях нагадвае, што пры выхадзе на вуліцу грамадзянам неабходна ўлічваць умовы надвор'я і быць гранічна ўважлівымі да сябе і навакольных. Пры выяўленні надзвычайных сітуацый неабходна паведаміць пра іх у МНС па тэлефоне «101».

## ЭХ, ДАРОГІ: ЗАВЕЯ ДЫ МАРОЗ

**За апошнія суткі на тэрыторыі краіны (у Брэсцкай, Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях) работнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях 47 разоў прыходзілі на дапамогу тым, хто трапіў у снежныя заносы.**

З сумётаў яны дапамаглі выцягнуць 47 транспартных сродкаў, у якіх знаходзіліся 132 чалавекі (у тым ліку 6 дзяцей). На шчасце, ніхто не пацярпеў. У Віцебскім раёне выратавальнікам давялося выцягваць з кювета фуру, якая ехала без грузу з Санкт-Пецярбурга ў Каўнас. Гэтае дарожна-транспартнае здарэнне адбылося на аўтадарозе Віцебск — Орша паблізу вёскі Бандары. Каб зноў паставіць грузавы «Мерседэс» на ачышчаную праезную частку, выратавальнікам давялося задзейнічаць у тым ліку кран з максімальнай грузападымальнасцю 50 тон.

Супрацоўнікі ДАІ таксама аказваюць дапамогу ў аператыўнай эвакуацыі няспраўнай і пашкоджанай тэхнікі з праезнай часткі. Тым удзельнікам, хто замерз, яны прапануюць гарачую гарбату. І, па магчымасці, дастаўляюць да бліжэйшага населенага пункта.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ДЗЕ СНЕГ, ТАМ І ЛЫЖЫ!



Фота БЕЛТА.

**У Магілёве пачала працаваць сучасная, добра падрыхтаваная лыжная траса спартыўнага комлексу «Тарпеда». Тут адкрыты пункт пракату лыж. За першы тыдзень паслугамі скарысталіся больш за 200 чалавек.**

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Ірына НАРКЕВІЧ, намеснік міністра гандлю:**

***«У праект новай рэдакцыі закона аб гандлі ўключаны палажэнні, рэалізацыя якіх дасць магчымасць стварыць у Беларусі цывілізаваную сістэму продажу аўтазапчастак з выразнай арыентацыяй на абарону правоў спажыўцоў. Гандаль ужыванымі аўтазапчасткамі на рынках рэспублікі ў той ці іншай форме, хутчэй за ўсё, будзе існаваць і ў далейшым, бо спажывец павінен мець права выбару — купляць новую дэталь або тую, якая была ў карыстанні. Задача ў тым, каб зрабіць гэты бізнэс легальным. Індывідуальны прадпрымальнік, які гандлюе на рынку, павінен несці адказнасць за продаж аўтазапчастак, уключаючы дакладнасць інфармацыі пра іх. Таму ён абавязаны выдаваць пакупніку дакумент, які пацвярджае факт продажу».***

### НАДВОР'Е СЁННЯ

| | | |
|---|---|---|
| Брэст | – 11° | |
| Віцебск | – 11° | |
| Гомель | – 13° | |
| Гродна | – 12° | |
| Магілёў | – 13° | |
| Мінск | – 13° | |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.12.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8570,00 | ▲ |
| Еўра | 11280,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 276,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1057,70 | ▲ |

■ Падпіска-2013

## МЫ ЕДЗЕМ!

### За блізкі свет, не ў найлепшае надвор'е, перад святамі...

**Але ж нідзе не дзенешся, калі клічуць: Шчучынскі раённы вузел паштовай сувязі (вул. 17 верасня, 2) у чацвер, 20 снежня, з 11 да 13 гадзін праводзіць Дзень падпісчыка — падпісчыка газеты «Звязда». А значыць без нас — ніяк.**

І без вас, спадзяёмся, таксама, калі вы жывяце ў Шчучыне ці дзесь непадалёк і можаце прыехаць... Каб пазнаёміцца, задаць свае пытанні і атрымаць адказы, каб падпісацца і паўдзельнічаць у розыгрышы прызоў, каб пасмяяцца, каб атрымаць у падарунак добрыя кнігі (у тым ліку — Валянціны Доўнар «Каб сказаць... І пачулі». Нават з аўтографам...)

Так што прыязджайце, запрашайце сваіх блізкіх. І тады, магчыма, гэтая сустрэча не проста адбудзецца, але і запомніцца.

### ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

20 снежня 2012 года ў 15.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца заключнае пасяджэнне першай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

■ Сустрэча без абцасаў



Фота Надзеі БУЖАН.

## «У МАЁЙ ПРАЦОЎНАЙ КНІЖЦЫ АДЗІН ЗАПІС — «СВІТАНАК»

**ТРЫКАТАЖНЫЯ вырабы жодзінскага «Світанка» добра вядомыя як у нашай краіне, так і за яе межамі. Ужо 12 гадоў прадпрыемства з такой мілагучнай і жыццесцвярджальнай назвай узначальвае Іна МАЛІНОЎСКАЯ. Перш чым заняць крэсла кіраўніка, Іна Віктараўна, як і гераіня любімага многімі фільма «Масква слязам не верыць», прайшла ўсе прыступкі кар'ернай лесвіцы: была і майстрам, і інжынерам-тэхнолагам, і начальнікам бюро планавання цэн, і галоўным эканамістам.**

### Пра гузакі, прамую дарогу і жаночы калектыў

**Прыйшла на фабрыку** адразу пасля Віцебскага тэхналагічнага інстытута лёгкай прамысловасці ў 1979 годзе. Мяне паставілі майстрам у другім швейным цэху. Спачатку было вельмі складана. Па асноўнай спецыяльнасці я тэхнолаг трыкатажнай вытворчасці, у інстытуце больш вывучала вязальнае, аддзелачнае абсталяванне, а справу давялося мець са швейным. Але самае цяжкае было тое, што ў мяне ў падпарадкаванні апынулася каля 30 чалавек. Працаваць з людзьмі нас у інстытуце не вучылі. Хоць я лічу, што такі курс для будучых тэхнолагаў і інжынераў павінен быць абавязкова. Калі малады чалавек без вопыту пачынае кіраваць іншымі людзьмі, колькі «гузакоў» можна набіць на гэтым шляху! Мне яшчэ пашанцавала, што ўсе падначаленыя былі практычна маімі аднагодкамі. СТАР 3

## ДЗІЦЯЧАЯ ЦАЦКА — СІМВАЛ БЯСПЕКІ?

### Эколагі ставяць пад сумненне нарматывы ЕС, а дзяржаўныя эксперты раяць купляць толькі сертыфікаваныя цацкі

**НАБЛІЖАЮЦЦА самыя любімыя святы — Новы год і Каляды. Асабліва радуюцца ім дзеці, якіх у гэтыя дні чакае шмат падарункаў і новых цацак. Ды і многім з нас, дарослых, падабаецца хадзіць у перадсвяточнай мітусні па крамах, выбіраючы падарункі для сваіх блізкіх. А купляючы дзіцячыя цацкі, мы і самі на кароткае імгненне вяртаемся ў дзяцінства. І менш за ўсё пры гэтым задумваемся пра нейкія пагрозы, бо ў нашай свядомасці цацка з'яўляецца сімвалам бяспекі. Ці так гэта на самой справе? Давайце разбярэмся.**

### Кожная чацвёртая цацка небяспечная?

Беларускія эколагі з грамадскай арганізацыі «Цэнтр экалагічных рашэнняў» лічаць, што кожная чацвёртая цацка ў краінах Мытнага саюза можа быць патэнцыйна небяспечнай. Нядаўна яны прэзентавалі вынікі тэсціравання дзіцячых цацак, пачаўшы гэтым кампанію «Няшкодныя цацкі», якая тычыцца бяспекі дзіцячых тавараў. СТАР 3

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### МЕРКЕЛЬ: ЕЎРОПЕ ПАГРАЖАЕ СТРАТА КАНКУРЭНТАЗДОЛЬНАСЦІ

Канцлер ФРГ Ангела Меркель заявіла, што еўрапейцы рызыкуюць страціць канкурэнтаздольнасць на сусветным рынку. У якасці засцярогі яна прывяла прыклад былых сацыялістычных краін, якія перажылі калапс з-за няздольнасці вытрымаць глабальную канкурэнцыю. Пра гэта кіраўнік урада Германіі заявіла ў апублікаваным інтэрв'ю брытанскай газеце «Файнэншл таймс». На думку Ангелы Меркель, каб захаваць канкурэнтаздольнасць, жыхары краін ЕС павінны працаваць больш інтэнсіўна і абмежаваць сацыяльныя выдаткі.

«На долю Еўропы цяпер прыходзіцца 7% сусветнага насельніцтва, 25% глабальнага ВУП, але пры гэтым яна павінна фінансаваць 50% сацыяльных выдаткаў у свеце. Улічваючы гэта, цалкам зразумела, што мы павінны працаваць больш напружана, каб захаваць свой росквіт і свой лад жыцця, — падкрэсліла канцлер ФРГ. — Усё, што мы павінны зрабіць, — гэта спыніць марнаваць больш, чым мы зарабляем кожны год».

### ЯЙКІ ПАВЫШАЮЦЬ УЗРОВЕНЬ «КАРЫСНАГА ХАЛЕСТЭРЫНУ»



Доўгі час лічылася, што яйкі небяспечныя з-за рызыкі павышэння халестэрыну. Аднак апошнія даследаванні паказалі: уключэнне ў рацыён яек спрыяе зніжэнню вагі і пазітыўна ўплывае на сітуацыю з ліпапратэінамі ў асоб з метабалічным сіндромам, перадае News-medical.net. У рамках навуковай працы асоб сярэдніх гадоў з гэтым захворваннем прасілі на працягу 12 тыдняў штодня з'ядаць тры цэлыя яйкі. Хоць у арганізм людзей паступала ў два разы больш халестэрыну, паказчыкі яго не выраслі. Наадварот, павысілася канцэнтрацыя «добрага халестэрыну». Дарэчы, раней было афіцыйна абвешчана, што, на самой справе, у яйках не так ужо і шмат халестэрыну. Лічылася, 215 міліграмаў, а аказалася — 185 міліграмаў. Плюс, у яйках на 64% больш вітаміну D, чым меркавалася. Акрамя гэтага вітаміну, у іх можна знайсці бэта-карацін, халін, лютэін і зеаксанцін (антыаксіданты, якія абараняюць ад мышачнай дэгенерацыі і ўзроставай слепаты).

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ПРОДАЖ ЗБРОІ Ў ЗША Б'Е РЭКОРДЫ



**Трагедыя ў пачатковай школе ў штаце Канектыкут з новай сілай узняла ў ЗША хвалю дыскусій аб неабходнасці прыняцця закона, які абмяжоўваў бы продаж зброі. У нядзелю за гэта выказаліся адразу некалькі членаў Кангрэса, а на сайце Белага дома была апублікавана адпаведная петыцыя.**

Аб значэнні, якое амерыканцы надаюць гэтаму пытанню, сведчыць той факт, што ўсяго за тры дні петыцыю падпісалі 123 тыс. чалавек. Па правілах, якія дзейнічаюць сёння ў ЗША, для таго каб падобныя дакументы маглі быць прыняты да разгляду урадам, неабходна 25 тыс. подпісаў.

Цікава, што трагедыі ў Портлендзе і Ньютаўне выклікалі ў грамадзян ЗША дзве дыяметральна супрацьлеглыя рэакцыі: пакуль адны з іх кінуліся патрабаваць узмацнення жорсткасці заканадаўства ў дачыненні да звароту агнястрэльнай зброі, іншыя — наадварот, паспешліва набываюць зброю.

Афіцыйнай статыстыкі няма, але ўладальнікі зброевых крам сцвярджаюць, што пасля масавых расстрэлаў попыт на агнястрэльную зброю расце хуткімі тэмпамі. У тым жа Портлендзе ён дасягнуў «астранамічнага» ўзроўню, цытуе USA Today ўладальніка крамы Northwest Armory Карла Дуркхеймера. «Мы ўжо зрабілі самую вялікую выручку за 20 апошніх гадоў», — кажа ўладальнік. «Да нас прыходзяць кліенты, якія вельмі занепакоены сваёй бяспекай», — кажа Дуркхеймер, адзначаючы, што, несумненна, рост продажаў звязаны са стральбой у Канектыкуце і Арэгоне.

КОРАТКА

Чысты прыбытак сельгасарганізацый Беларусі ў студзені—кастрычніку 2012 года павялічыўся ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года ў 2,5 раза і склаў больш за Br7,916 трлн.

Савет Міністраў Беларусі прыняў прапанову Нацыянальнай акадэміі навук аб аб'яўленні калекцыі штамаў грыбоў Інстытута лесу навуковым аб'ектам, які складае нацыянальны здабытак.

Колькасць беспрацоўных, зарэгістраваных у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Беларусі, на канец лістапада гэтага года склала 26 тыс. чалавек. Гэта на 12,4 працэнта менш, чым на канец лістапада 2011 года і на 2 працэнты менш, чым на канец кастрычніка 2012 года.

У Гродне 12-гадовы хлопчык абкрадаў незамкнутыя кватэры, у якіх знаходзіліся гаспадары. З кватэр знікалі рэчы, пераважна сумачкі з дакументамі і грашыма. Знайсці зладзюжку міліцыі дапамагла відэакамера, усталяваная жыхарамі аднаго з пад'ездаў. Хлопчык выхоўваецца ў шматдзетнай сям'і.

## ЦІ ЗАЎСЁДЫ ВЫ БЕРАЦЕ БАЛЬНІЧНЫ?



**Валянціна ГЕРАСІМОВІЧ, загадчык аддзела сацыяльна-эканамічнай работы ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі:**

— У паліклініку я звяртаюся толькі ў экстраннай сітуацыі, калі ногі ўжо самі не ідуць (смяецца). Так было, напрыклад, калі я была на мяжы гіпертанічнага крызу. Бо што такое паліклініка? Гэта сапраўдны канвеер з пацыентаў. У маёй паліклініцы вельмі часта змяняюцца ўчастковыя ўрачы. А кожнаму новаму ўрачу няма часу, каб унікаць ва ўсе нюансы твайго стану. З-за дэфіцыту кадраў працаваць на ўчастак часта ідуць урачы-пенсіянеры. Не хачу нікога пакрыўдзіць, але такія ўрачы часта прызначаюць састарэлыя і малаэфектыўныя прэпараты. Я лячылася-лячылася, але эфекту ніякага не было. А малады ўрач змог падабраць прэпарат, дзякуючы якому мне ўдалося ўзяць пад кантроль артэрыяльны ціск. Увогуле, абстаноўка ў паліклініцы раздражняе: чэргі, адсутнасць уважлівага стаўлення да цябе з боку доктара... А калі бярэш бальнічны ў сувязі з прастудай, цябе чакаюць адны нязручнасці — амаль усе тры дні праводзіш у паліклініцы: аналізы, флюараграфія і гэтак далей. Пра якое лячэнне тут можа весціся размова?



**Алена САКАЛОЎСКАЯ, прэс-сакратар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі:**

— Бальнічны бяру вельмі рэдка. Гэтаму ёсць некалькі тлумачэнняў. Па-першае, я разумею, што з-за маёй адсутнасці пацерпіць работа, а падвесці людзей я не хачу і не магу. А калі сіл ужо зусім няма і ты літаральна расклейваешся на хаду, то кіраўніцтва можа ўвайсці ў становішча і адпусціць дамоў падлячыцца. Ударная лекавая тэрапія — і назаўтра ты зноў у страі. Другая прычына — шкада свайго часу на паходы ў паліклініку. Яшчэ невядома, што табе скажа ўрач. А раптам у цябе тэмпература не такая высокая, каб даваць бальнічны? Яшчэ і няёмка будзе, што «адрываеш» спецыяліста ад работы са сваёй пусцяковінай. Можна, вядома, калі ў цябе тэмпература, выклікаць урача на дом. Але затым зноў давядзецца не адзін раз хадзіць у паліклініку. Таму стараюся пазбягаць бальнічных, бо як лячыць прастуду, напэўна, усе і самі ведаюць.



**Сяргей СІДАРОВІЧ, праграміст ІТ-кампаніі:**

— У выпадку, калі ты захварэў, у нас дазваляецца пабыць дома без звароту да ўрача і адкрыцця бальнічнага тры дні. Галоўнае — паставіць пра гэта ў вядомасць сваё кіраўніцтва. Заробак за гэтыя дні за табой захоўваецца. Але на працягу года без медыцынскай даведкі можна прапусціць не больш як 10 дзён. У чым плюс такой сістэмы? Чалавек не марнуе свой час на паходы ў паліклініку, затое ў яго ёсць магчымасць паляжаць дома, бо ўсе ведаюць, што галоўнае пры лячэнні прастуды — гэта пасцельны рэжым. Трох дзён пры звычайнай прастудзе, як правіла, дастаткова для таго, каб падлячыцца. А ў тым выпадку, калі ты не хварэў на працягу года, то 10 дзён становяцца для цябе своеасаблівым бонусам. Ты можаш гэтыя дні выкарыстаць па нейкіх сямейных абставінах. У нас усе актыўна карыстаюцца прапанаванай магчымасцю, таму ў паліклініку звяртацца не спяшаюцца.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## УЛАДЗІМІР АНДРЭЙЧАНКА ВЫБРАНЫ ПЕРШЫМ НАМЕСНІКАМ СТАРШЫНІ ПАРЛАМЕНЦКАГА СХОДУ САЮЗА БЕЛАРУСІ І РАСІІ



Фота БЕЛТА.

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір Андрэйчанка выбраны першым намеснікам старшыні Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі. Такое рашэнне прынята ўчора ў Маскве на 43-й сесіі сходу, перадае БелТА.**

Таксама з беларускага боку намеснікамі старшыні Парламенцкага сходу выбраны намеснік старшыні Савета Рэспублікі Анатоль Русецкі і старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Мікалай Самасейка. Змяненні ў складзе кіраўніцтва Парламенцкага сходу адбыліся ў сувязі з праведзенымі восенню 2012 года ў Беларусі парламенцкімі выбарамі. З расійскага боку намеснікам старшыні Парламенцкага сходу выбраны першы намеснік старшыні Дзярждумы Іван Мельнікаў замест Леаніда Слуцкага, які займаў гэту пасаду раней.

## У ДРУГІМ ЧЫТАННІ ПРЫНЯТЫ БЮДЖЭТ САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ НА 2013 ГОД

Парламенцкі сход Саюза Беларусі і Расіі на сесіі ў Маскве прыняў у другім канчатковым чытанні бюджэт Саюзнай дзяржавы на 2013 год, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Бюджэт складае 4 млрд 872 млн расійскіх рублёў. Бюджэтам прадугледжана фінансаванне 37 праграм і мерапрыемстваў: 11 праграм Саюзнай дзяржавы і 26 мерапрыемстваў, многія з якіх праводзяцца штогод.

«Бюджэт Саюзнай дзяржавы на 2013 год мае відавочную сацыяльную накіраванасць», — сказаў журналістам па выніках сесіі старшыня Парламенцкага сходу спікер Дзярждумы Расіі Сяргей Нарышкін. Адначасова значныя сродкі ў бюджэце выдзяляюцца на рэальны сектар эканомікі.

Сяргей Нарышкін паведаміў, што ў 2013 годзе запланавана фінансаванне трох новых праграм. Прычым, падкрэсліў ён, дзве з гэтых праграм звязаны з развіццём новых навукова-тэхнічных напрамкаў. Акрамя таго, у бюджэце зарэзерваваны сродкі для фінансавання дзвюх праграм, якія знаходзяцца ў заключнай стадыі падрыхтоўкі: «Распрацоўка касмічных і наземных сродкаў забеспячэння спажыўцоў Расіі і Беларусі інфармацыяй дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі» і «Інавацыйнае развіццё вытворчасці бульбы і тапінамбуру».

Адначасова з прыняццем бюджэту Парламенцкі сход зрабіў шэраг рэкамендацый Савету Міністраў Саюзнай дзяржавы. У прыватнасці, прапанавана ўнесці ў першым квартале ў Парламенцкі сход новую рэдакцыю парадку фарміравання бюджэту Саюзнай дзяржавы. Рэкамендавана таксама разгледзець магчымасць уключэння з 2014 года ў саюзны бюджэт мерапрыемстваў па падтрымцы міжрэгіянальнага супрацоўніцтва і пяці так званых «пунктаў росту эканамічнага развіцця», аб якіх дамовіліся прэм'ер-міністры Беларусі і Расіі на нядаўнім пасяджэнні саюзнага Саўміна.

■ Парламенцкі дзённік

# ДЭПУТАТЫ АДСТАЯЛІ ІНТАРЭСЫ ВЫБАРШЧЫКАЎ У ЗАКОНЕ АБ РЭКЛАМЕ

**Дапаўненні ў дзеючы закон аб рэкламе былі разгледжаны ў першым чытанні 2 гады таму. Стуль доўгая дапрацоўка законапраекта сведчыць пра тое, як не проста было знайсці баланс паміж інтарэсамі выбаршчыкаў і камерцыйнымі інтарэсамі СМІ і рэкламадаўцаў.**

### Менш часу, гуку, эротыкі і алкаголю

Адным з самых важных дасягненняў праекта парламентарыі лічаць скарачэнне рэкламы ў прайм-тайм на дзве хвіліны. Паводле дзеючага закона, на працягу 1 гадзіны ў прайм-тайм на тэлебачанні рэклама можа займаць да 18 хвілін. Законапраект прапануе скараціць гэты час да 16 хвілін.

— Эканамічныя інтарэсы тэлевізійных кампаній і нашых выбаршчыкаў кардынальна разыходзяцца, — сказаў, прадстаўляючы законапраект, **дэпутат Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве Юрый ДАРАГАКУПЕЦ.** — Таму змяншэнне часу тэлевізійнай рэкламы на 2 хвіліны на працягу кожнай гадзіны — сур'ёзны крок на гэтым шляху. Напрыклад, у Расійскай Федэрацыі скарачэнне рэкламнага часу ў прайм-тайм праходзіла ў некалькі этапаў.

У законапраекце знайшлі сваё адлюстраванне і нормы, якія рэгламентуюць узровень гуку рэкламы на тэлебачанні. Ён павінен быць эквівалентны ўзроўню гуку праграмы, якая транслюецца і перарываецца рэкламай, і будзе вызначацца абавязковымі тэхнічнымі патрабаваннямі.

Праект закона дапаўняе дзеючы закон тэрмінам «мультымедыйная рэклама». Уводзіцца забарона на размяшчэнне рэкламы эратычнай прадукцыі на тэлебачанні і радыё з 4 да 24 гадзін. Спрашчаецца працэдура атрымання дазволу на размяшчэнне рэкламы на аўтамабілях, трамваях і тралейбусах, а для размяшчэння рэкламы на трактарах і аўтапаяздах уводзіцца неабходнасць атрымання дазволу.

Новаўвядзенні закранаюць патрабаванні да рэкламы лекавых сродкаў, медыцынскіх метадаў і паслуг, біялагічна актыўных дадаткаў да ежы. Адмяняецца працэдура ўзгаднення рэкламы ліцэнзійных медыцынскіх паслуг і дазваляецца рэклама лекаў і медыцынскіх вырабаў, якія праходзяць клінічныя выпрабаванні з мэтай дзяржаўнай рэгістрацыі ў Міністэрстве аховы здароўя.

Праект закона забараняе рэкламу, якая змяшчае непасрэдны зварот да непаўналетніх і матэрыяльна заахвочвае набыццё імі прадукту, які рэкламуецца. Абноўлены закон больш поўна рэгламентуе давядзенне да спажыўцоў інфармацыі аб шкодзе алкагольных напояў. Час рэкламы піва і слабаалкагольных напояў на радыё і тэлебачанні скарочаны на 2 гадзіны. Такая рэклама будзе забаронена з 7 да 22 гадзін, зараз — з 7 да 20 гадзін.

### Сакрэт фірмы

У другім чытанні таксама быў разгледжаны Закон «Аб камерцыйнай тайне». Праблема для нашай краіны новая, заўважыў **старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Генадзь ПАЛЬЧЫК.** У савецкія часы не толькі не было такой нормы, але і заахвочвалася бязвыплатная перадача ўнутры краіны перадавога вопыту і навукова-тэхнічных дасягненняў. Такое стаўленне да камерцыйнай тайны захоўваецца на многіх сучасных прадпрыемствах, што часта прыводзіць да сур'ёзных эканамічных страт.

За мяжой ахова сведчанняў, якія складаюць камерцыйную тайну, заўсёды мела асаблівае значэнне, бо ўцечка такой інфармацыі наносіць вялікую эканамічную шкоду і можа паставіць пад пагрозу існаванне прадпрыемства. Паводле экспертаў, да 15% выдаткаў замежных фірмаў складаюць мерапрыемствы па абароне сакрэтаў.

Камерцыйная тайна ўключае ў сябе як сведчанні тэхнічнага і вытворчага (чарцяжы, мадэлі, тэхналагічныя прыёмы), так і дзелавога характару (каналы паставак і збыту прадукцыі, спісы кліентаў і падобнае). Усё гэта мае пэўную эканамічную каштоўнасць і важнае значэнне для ўладальніка, таму ў дачыненні да такой інфармацыі ўладальнік усталёўвае рэжым камерцыйнай тайны.

— Неабходнасць закона аб камерцыйнай тайне абумоўлена тым, што дзеючае заканадаўства Беларусі не забяспечвае эфектыўнай прававой абароны інтарэсаў юрыдычных і фізічных асоб, якія валодаюць канфідэнцыйнай інфармацыяй, маючай значэнне для гаспадарчай і прадпрымальніцкай дзейнасці, — патлумачыў калегам Генадзь Пальчык.

### Закон для выдаўцоў

Яшчэ адзін важны прабел у заканадаўстве быў запоўнены на чарговым пасяджэнні першай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу пятага склікання. У другім чытанні дэпутаты разгледзелі закон аб выдавецкай справе.

— Дагэтуль у нас не было заканадаўчага акта такога ўзроўню, які вызначае дзяржаўную палітыку ў гэтай сферы, — пракаментаваў журналістам праект закона **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы Марат ЖЫЛІНСКІ.** — Згодна з законапраектам, дзеючы механізм ліцэнзавання выдавецкай дзейнасці замяняецца на дзяржаўную рэгістрацыю, якую не трэба будзе прадаўжаць праз пэўны час. Звесткі аб выдаўцах, вытворцах і распаўсюджвальніках друкаванай прадукцыі будуць уносіцца ў адзіны рэестр. У выпадку перарэгістрацыі, змены юрыдычнага адраса або назвы юрыдычнай асобы інфармацыя будзе занесена ў рэестр за лічаныя гадзіны, што значна аблегчыць жыццё тых, хто займаецца выдавецкай справай.

Міністэрствам інфармацыі і дэпутатамі была праведзена вялікая работа па падрыхтоўцы гэтага законапраекта (толькі пасяджэнняў працоўных груп адбылося 15), распрацоўшчыкі ўважліва вывучылі замежны вопыт.

«Прыняцце гэтага законапраекта дасць магчымасць упарадкаваць выдавецкую справу ў Беларусі, павысіць канкурэнтаздольнасць удзельнікаў рынку друкаваных выданняў краіны», — лічаць парламентарыі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## БАНКНОТЫ Ў АБАРАЧЭННІ АПОШНІЯ МЕСЯЦЫ



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Нагадаем, што з 1 верасня гэтага года спыніўся выпуск у абарачэнне банкнот наміналам 10 і 20 рублёў узору 2000 года. У кашальках беларусаў яны будуць прысутнічаць лічаныя месяцы.

Да 28 лютага 2013 года «дзясяткі» і «дваццаткі» застаюцца ў абарачэнні на тэрыторыі краіны і абавязковыя да прыёму пры ўсіх відах плацяжоў. Пасля 28 лютага абарачэнне названых банкнот будзе спынена. Але хвалявацца не варта: з 1 сакавіка 2013 года па 30 верасня 2013 года, калі яны ў некага застануцца, банкноты наміналам 10 і 20 рублёў можна будзе абмяняць у любой суме, кратнай 50 рублям, у Нацыянальным банку і банках краіны, а з 1 кастрычніка 2013 года па 31 сакавіка 2014 года — у Нацыянальным банку. З 1 красавіка 2014 года гэтыя банкноты будуць выведзены з абарачэння і стануць несапраўднымі. Гэтае рашэнне прымалася з мэтай скарачэння дзяржаўных выдаткаў на іх выраб, немэтазгоднасцю далейшага выкарыстання ў наяўным грашовым абарачэнні.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

## ДАПАМОГУЦЬ ЭВАКУАТАРЫ

Эвакуатары для перамяшчэння падчас убірання снегу транспартных сродкаў, прыпаркаваных уздоўж праезнай часткі вуліц, закуплены ў кожным раённым прадпрыемстве «Рэмаўтадар». Пра гэта паведаміў намеснік генеральнага дырэктара «Гаррэмаўтадара» Мінгарвыканкама Анатоль Жамоздзік. Гаворачы пра складанасці, звязаныя з аўтамабілямі, прыпаркаванымі ўздоўж праезнай часткі, ён патлумачыў, што ўзнікаюць сур'ёзныя перашкоды для спецыялізаванай тэхнікі як падчас убірання снегу, так і пры яго далейшай пагрузцы. Спецыяліст нагадаў, што ў сталіцы рэгулярна складаюць графікі прыбірання снегу, якія абнародуюць праз СМІ.

**«Мінск—Навіны».**

**Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі чацвёртага склікання па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Моравай Антаніне Пятроўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

**РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» выказвае глыбокія спачуванні старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі чацвёртага склікання па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Моравай Антаніне Пятроўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

**Калектыў Інстытута журналістыкі Белдзяржуніверсітэта выказвае шчырыя спачуванні намесніку дэкана факультэта журналістыкі па навуковай рабоце, дацэнту кафедры гісторыі журналістыкі Зубчонак Наталлі Анатольеўне з прычыны напаткаўшага яе гора — смерці МАЦІ.**

## Беларусы адзначаюць паляпшэнне матэрыяльнага становішча

**Аб гэтым сведчыць сацыяльнае апытанне, праведзенае ў лістападзе Інфармацыйна-аналітычным цэнтрам пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, паведамілі БЕЛТА ў цэнтры.**

Згодна з атрыманымі дадзенымі, за мінулы месяц сацыяльнае самаадчуванне насельніцтва палепшылася. Так, павялічылася колькасць грамадзян, якіх задавальняе іх жыццё (79 працэнтаў). У сярэднім на 5 працэнтаў стала больш рэспандэнтаў, якія выказваюць упэўненасць у заўтрашнім дні і адзначаюць паляпшэнне свайго матэрыяльнага становішча.

Па-ранейшаму большая частка рэспандэнтаў станоўча ацэньвае сацыяльна-эканамічную абстаноўку ў рэспубліцы. Грамадска-палітычную сітуацыю як спакойную характарызуюць 72,5 працэнта грамадзян.

Як і раней, найбольш высокі ўзровень даверу насельніцтва -- Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь (81 працэнт).

■ На кантролі

## ЖЫЛЛЁ ЖАДАНАЕ: НЕ СВАЁ, ДЫК АРАНДАВАНАЕ

**У наступным годзе на Міншчыне мяркуецца пабудаваць 1 млн 400 тыс. квадратных метраў жылля, у тым ліку 500 тыс. квадратаў за кошт выкарыстання льготных крэдытаў для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Пра гэта паведаміў на прэс-канферэнцыі для прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі губернатар вобласці Барыс Батура.**

Гэта самыя вялікія планы сярод рэгіёнаў рэспублікі ў 2013 годзе. Губернатар упэўнены, што яны будуць выкананы: практычна вырашаны ўсе праблемы па ўзвядзенні інфраструктуры. Мінулыя гады менавіта па гэтай прычыне жыллё ўводзілася ў дзеянне з затрымкай. Акрамя таго, як адзначыў Барыс Батура, у будучым годзе будуць вырашаны праблемы з будаўніцтвам інжынерных сетак пад індывідуальнае жыллё, асабліва ў Мінскім раёне. «Таму няма ніякіх сумненняў, што мы ўвядзём 1млн 400 тыс. квадратаў», — лічыць старшыня Мінаблвыканкама.

На 1 студзеня 2012 года ў чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў у вобласці стаялі 113 тыс. чалавек. За пяць папярэдніх гадоў іх колькасць павялічылася ўдвая. Але з 2010-га па сённяшні дзень з чаргі знялі каля 9 тыс. чалавек. І тым не менш яна ўзрасла на 10 працэнтаў. «Мы спадзяёмся, што насельніцтва будзе больш актыўна ўдзельнічаць ў забеспячэнні сябе жыллём. З павышэннем узроўню заработнай платы, на маю думку, гэтае пытанне можна будзе вырашаць больш хуткімі тэмпамі», — адзначыў губернатар.

Акрамя таго, ён канстатаваў, што ўлады сур'ёзна займаюцца выдзяленнем участкаў пад індывідуальнае будаўніцтва. Толькі ў адным Мінскім раёне больш за 20 тыс. чалавек на чарзе на атрыманне зямлі пад індывідуальную забудову. «Мы сёння маем прыкладна каля 6 тысяч участкаў у Мінскім раёне. І пастаянна працуем над тым, каб іх знаходзіць. Але людзі, як правіла, вельмі пераборлівыя і хочуць атрымаць надзел бліжэй да сталіцы — у Бараўлянах, Ждановічах. Таму мы прынялі рашэнне: адмовіўся ад прапановы — значыць, здымем з чаргі», — канстатаваў губернатар.

Разам з тым ва ўсіх буйных гарадах вобласці ў 2013-2014 гадах плануецца таксама і будаўніцтва арэнднага жылля. «У гэтым напрамку ўжо рухаюцца Барысаў, Маладзечна», — адзначыў Барыс Батура.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ** ■

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

## БАЛОН ПРЫВЯЗУЦЬ НЕ Ў ПАНЯДЗЕЛАК, А Ў СУБОТУ

**З вёскі Іканы Барысаўскага раёна на «гарачую лінію» нашай газеты патэлефанавала Таісія Пятроўна Салсанава з просьбай дапамагчы... заказаць газ у балоне. Паводле яе слоў, калі яна спрабавала замовіць патрэбнае ў гаргазе, ёй адказалі, што даставяць газ толькі 14 студзеня, і не патлумачылі прычыну.**

— Адзін балон у нас ужо стаіць пусты, другі — заканчваецца. У нас двое маленькіх дзетак (якія актыўна агучвалі сваю прысутнасць на «заднім фоне» нашай размовы. — **С.Р.**). Звычайна газ прывозяць кожны панядзелак. Чаму зараз так — незразумела, — гаварыла заяўніца.

Між тым прычына як быццам была на паверхні — перанос працоўных дзён напярэдадні Каляд: 24 снежня, бліжэйшы панядзелак, — выхадны. Што, уласна, і пацвердзіў у тэлефоннай гутарцы начальнік службы дастаўкі Барысаўскага міжраённага вытворчага ўпраўлення газавай гаспадаркі Валянцін Сівак, які дадаў, што і панядзелак 31 снежня, як і першы панядзелак новага года — 7 студзеня, — таксама выхадныя.

Суразмоўца выказаў здзіўленне, што жанчына звярнулася ў рэдакцыю, а не ў службу дастаўкі прадпрыемства. Нумар тэлефона, паводле яго слоў, жыхарка вёскі Іканы магла спытаць у тых людзей, якія дастаўляюць балоны.

— У сувязі з пераносам працоўных дзён газ вашай заяўніцы, якая пражывае за 70 кіламетраў ад Барысава, даставяць 22 снежня, — паабяцаў Валянцін Канстанцінавіч, занатаваўшы ўсе патрэбныя звесткі абанента.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## НА ВІРУСЫ ХВАРЭЕМ МЕНШ

**У Беларусі адзначаецца нізкі ўзровень актыўнасці вострых рэспіраторных інфекцый, паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве аховы здароўя Беларусі.**

Этыялагічная структура вострых рэспіраторных інфекцый у Беларусі прадстаўлена негрыпознымі віруснымі агентамі. Сітуацыя па захваральнасці на ВРІ знаходзіцца на пастаянным кантролі. Аднак, як адзначылі ў міністэрстве, многае залежыць ад стаўлення кожнага чалавека да ўласнага здароўя.

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении 04 января 2013 г. аукциона по продаже в частную собственность земельных участков для индивидуального жилищного строительства в Чернавчицком сельском Совете Брестского района, Брестской области**

| № лота | Предмет аукциона | Площадь, га | Начальная стоимость земельного участка (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) | Целевое назначение земельных участков |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок в д. Смуга, ул. Озерная, 3 121284607601000144 | 0,1498 | 7 625 688 | 762 568 | строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома |

**Аукцион будет проводиться 04.01.2013 в 11.00 по адресу: Брестский район, аг. Чернавчицы, ул. Сикорского, 22 (здание сельисполкома).**

Для участия в аукционе необходимо подать заявление об участии в аукционе, копию платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет Чернавчицкого сельисполкома № 3600213110108 в филиале 100 АСБ «Беларусбанк», код 246, УНП 200676206, код платежа 4901 залога в размере 10% от начальной цены земельного участка, документ (паспорт), подтверждающий личность покупателя.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения, осуществляется победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: аг. Чернавчицы, ул. Сикорского, 22 (здание сельисполкома) с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням. Последний срок подачи заявлений 27 декабря 2012 года.**

**МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ 5 января 2013 г. повторно проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе**

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка | Целевое назначение | Инженерная инфраструктура * | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена земельного участка (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Горанский с/с, п. Звенячи | 623681306101000071 | 0,1500 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 2 704 389 | 39 000 000 | 7 800 000 |
| 2 | Острошицко-Городокский с/с, д. Околица, участок № 1 | 623685205601000516 | 0,1500 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество, газ | 3 000 000 | 900 000 000 | 180 000 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **05.01.2013 г. в 10.00.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **28.12.2012 г. в 17.00.** Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лот 1 перечисляется на расчетный счет № 3641900000150 Горанского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052360, код платежа – 04901.

На Лот 2 перечисляется на расчетный счет № 3641000000047 Острошицко-Городокского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600208279, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.
2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет с отметкой банка.
3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в частную собственность единственному участнику несостоявшегося аукциона, при его согласии, с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов).

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Местный исполнительный комитет не позднее 2 рабочих дней после внесения победителем аукциона платы за предмет аукциона, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения и выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выдает ему выписку из названного решения, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона.

** В разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, к которым возможно подключение в указанном населенном пункте.*

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении аукциона по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности Республики Беларусь**

| | |
|---|---|
| **Лот № 1** Недвижимое имущество, место нахождения имущества, информация о земельном участке | **Капитальное строение (инв. № 421/С-4752), расположенное по адресу: Гродненская область, Вороновский район, г.п. Вороново, ул. Горького, 1. Земельный участок площадью 0,0067 га с кадастровым номером 421355100004000008, срок аренды земельного участка 50 лет** |
| **Начальная цена недвижимого имущества – 15 916 736 руб., сумма задатка – 2 000 000 руб.** | |
| **Продавец недвижимого имущества:** Белорусское республиканское унитарное страховое предприятие «Белгосстрах», контактные телефоны: 8 (017) 208 79 12, 8 (0152) 74 17 69 | |
| **Сведения о недвижимом имуществе:** капитальное строение (инв. № 421/С-4752) – здание гаража одноэтажное, 1989 г.п., S общ. – 39.2 м², фундамент железобетонный, наружные, внутренние капитальные стены – кирпичные, перегородки – кирпичные, перекрытие чердачное – деревянное, подшито железом, крыша – шиферная, полы – дощатые, проемы – деревянные, ворота – деревянные, внутренняя отделка стен – оштукатурены | |
| **Условия использования недвижимого имущества*** | вовлечение в хозяйственный оборот в течение двух лет с момента заключения договора купли-продажи |
| **Условия использования земельного участка**:** использование победителем аукциона в установленном порядке земельного участка под складские помещения, гаражи, производственные объекты (в случае изменения целевого назначения); заключение с райисполкомом договора аренды земельного участка сроком и осуществлением в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении земельного участка, государственной регистрации права на земельный участок, занятие земельного участка не позднее 6 (шести) месяцев после получения свидетельства о государственной регистрации прав на него | |
| **Вид вещного права на земельный участок –** право аренды | |
| **Организатор аукциона:** Гродненский областной территориальный фонд государственного имущества (фонд «Гроднооблимущество»), 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней), тел.: (8 0152) 74 53 86, 72 15 29, 74 53 82; **www.region.grodno.by, gki.gov.by** | |

** В случае невыполнения покупателем условий аукциона продавец вправе расторгнуть в одностороннем порядке договор купли-продажи в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь без возмещения победителю аукциона затрат, расходов, убытков, связанных с его расторжением.*

*** В договоре аренды земельного участка будут предусмотрены штрафные санкции и возможность расторжения договора аренды в одностороннем порядке с изъятием земельного участка, без компенсации затрат, в случае невыполнения победителем аукциона условий использования земельного участка.*

1. Аукцион состоится **21 января 2013 года в 11.00** по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

2. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39. Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **16 января 2013 года до 15.00**.

3. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и земельного участка в частную собственность или права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462 «О некоторых мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 27 декабря 2007 г. № 667».

Аукцион является открытым, его участниками могут быть граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, а также иностранные инвесторы (иностранные государства, объединения, международные организации, иностранные юридические лица, иностранные граждане, граждане Республики Беларусь, имеющие постоянное место жительства за границей, и лица без гражданства).

Участник аукциона, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких предметов аукциона, вносит задатки в размере, установленном для каждого из предметов аукциона.

4. **К заявлению прилагаются следующие документы:**

документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет организатора аукциона – фонда «Гроднооблимущество» № 3642900000187, МФО 152101752 в филиале 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 500044549, участник аукциона, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких объектов недвижимого имущества, вносит задатки в размере, установленном для каждого из объектов;

**юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем –** копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

**физическим лицом** – документ, удостоверяющий личность;

**иностранным юридическим лицом** – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

**иностранным гражданином или лицом без гражданства** – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

**представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель)** – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

**Консолидированными участниками** для участия в аукционе к соответствующему заявлению прилагаются следующие документы:

копия договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе;

сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью.

При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя.

5. Желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

6. Организатор аукциона, опубликовавший извещение, вправе отказаться от проведения аукциона (продажи конкретного предмета аукциона) в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения. При этом сумма задатка, внесенная участником аукциона, подлежит возврату в течение 5 рабочих дней со дня отказа организатора аукциона от проведения аукциона.

7. Аукцион начинается с объявления аукционистом порядка проведения аукциона, начальной цены предмета аукциона, его наименования, места нахождения и краткой характеристики недвижимого имущества, условий, с которыми продается данный предмет аукциона (в случае продажи на аукционе с условиями), шага аукциона. Шаг аукциона определяется аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей названной аукционистом цены предмета аукциона. Первая объявленная аукционистом цена предмета аукциона определяется в соответствии с шагом аукциона от начальной цены предмета аукциона.

Не допускаются начало торгов и продажа предмета аукциона по начальной цене. Если по объявленной аукционистом цене предмета аукциона аукционные номера подняли два участника аукциона и более, аукционист объявляет новую цену предмета аукциона в соответствии с шагом аукциона. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды последнюю цену и объявляет о продаже предмета аукциона, а участника аукциона – победителем аукциона в отношении соответствующего предмета аукциона.

Если два и более участника аукциона согласились с объявленной аукционистом ценой, но ни один из них не согласился со следующей объявленной им ценой, аукционист предлагает участникам аукциона объявить свою цену, которая должна быть выше последней цены, с которой согласились участники аукциона. После объявления участником аукциона своей цены аукционист называет аукционный номер этого участника и предложенную им цену. При этом предложенная участником аукциона цена, равная цене, предложенной другим участником аукциона, не принимается. Участники аукциона объявляют свою цену до тех пор, пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды предложенную им цену и при отсутствии предложений иных участников аукциона объявляет о продаже предмета аукциона, а участника аукциона – победителем аукциона по соответствующему предмету аукциона. Если после предложения аукциониста участникам аукциона объявить свою цену только один из участников объявит свою цену, аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды предложенную им цену и при отсутствии предложений иных участников аукциона объявляет о продаже предмета аукциона, а участника аукциона – победителем аукциона по соответствующему предмету аукциона. Если ни один из участников аукциона не предложил свою цену, аукцион в отношении соответствующего предмета аукциона признается нерезультативным.

8. Аукцион по конкретному предмету аукциона признается **несостоявшимся**, если заявление на участие в нем подано только одним участником, или для участия в аукционе не было подано ни одного заявления, или на аукцион явился один из участников, или ни один из участников не явился на аукцион.

В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Аукцион по конкретному предмету аукциона признается **нерезультативным**, если:

ни один из его участников после трехкратного объявления первой цены не поднял аукционный номер;

ни один из участников аукциона не предложил свою цену за предмет аукциона.

9. **В течение 10 рабочих дней** после утверждения в установленном порядке протокола победитель аукциона (претендент на покупку) обязан внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этих участков, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

10. После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) действий, предусмотренных **в п. 9**, и представления организатору аукциона, продавцу и в местный исполнительный комитет копий платежных документов, **но не позднее 2 рабочих дней**, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества.

В тот же срок местный исполнительный комитет передает победителю аукциона (претенденту на покупку) выписку из решения об изъятии земельного участка и предоставлении его в аренду победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выдает экземпляр протокола и заключает договор аренды земельного участка.

При уклонении одной из сторон от заключения договора купли-продажи недвижимого имущества или договора аренды земельного участка другая сторона вправе обратиться в суд с требованием о понуждении заключить договор, а также о возмещении убытков, причиненных уклонением от его заключения.

11. Оплата стоимости приобретенного предмета аукциона осуществляется в установленном законодательством порядке:

победителем аукциона (претендентом на покупку), являющимся резидентом Республики Беларусь, – в рублях;

победителем аукциона (претендентом на покупку), являющимся нерезидентом Республики Беларусь, – в рублях либо в иностранной валюте по курсу Национального банка на дату платежа.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## ЁЛКІ ДЗІЦЯЧЫХ ЖАДАННЯЎ

Збор падарункаў для выхаванцаў інтэрнатаў, дзіцячых дамоў і іншых сацыяльных устаноў Гомеля пройдзе ў абласным цэнтры 21-29 снежня.

Навагоднія ёлкі жаданняў будуць усталяваны ў гэтыя дні ў гандлёвых цэнтрах, універмагах, на рынках горада. Упрыгажэннем незвычайных ёлак стануць фотаздымкі дзяцей з інтэрнатных устаноў і лісты, адрасаваныя Дзеду Марозу. Як паведаміла старшыня Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Ала Смаляк, часцей за ўсё дзеці звяртаюцца з просьбай атрымаць да свята цацкі, ласункі і іншыя падарункі. У якасці дабрачыннай дапамогі любы чалавек можа набыць падарункі, а валанцёры Чырвонага Крыжа напярэдадні Новага года перададуць іх дзецям. Такая акцыя праводзіцца шосты год запар, і да яе ахвотна далучаюцца жыхары раённых цэнтраў Гомельшчыны.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## У ПАМЯЦЬ САЛДАТАЎ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ

У вёсцы Скокі Брэсцкага раёна прайшоў першы міжнародны ваенна-гістарычны фестываль, прысвечаны перамовам 1917-1918 гг., якія завяршыліся падпісаннем Брэсцкага міру.

Скокаўскі сядзіба Нямцэвічаў — аб'ект надзвычай цікавы. На працягу стагоддзяў ён пераважыў не адну эвакуацыю, рабаванне, занепад і росквіт. Тут спыняўся ў свой час Тадэвуш Касцюшка, гасцяваў Напалеон Бана. Менавіта тут 15 снежня 1917 года было падпісана перамір'е паміж Савецкай Расіяй і Германіяй, якое азначала канец Першай сусветнай на ўсходнім напрамку. Палац у Скоках не так даўно здадзены пасля рэстаўрацыі. І на яго раскошу ўжо некалькі тэматычных мерапрыемстваў. Так было і на гэты раз: фэст адкрыўся навукова-практычнай канферэнцыяй «Вялікая еўрапейская вайна на тэрыторыі Беларусі».

А ў старадаўнім парку сядзібы прайшла відовішчная частка мерапрыемства. Маштабную рэканструкцыю баёў 1917-1918 г. на Усходнім фронце паказалі члены ваенна-гістарычных клубаў.

**Яна СВЕТАВА.**

## ТРЫЛЬЁН РУБЛЁЎ ПАДАТКУ НА ПРЫБЫТАК

Як паведамілі рэдакцыі ў прэс-цэнтры Міністэрства па падатках і зборах Беларусі, сёлета за 11 месяцаў у кансаліданы бюджэт Брэсцкай вобласці паступіла 1 трлн 25,2 млрд рублёў падатку на прыбытак.

Гэта амаль на 261,6 млрд рублёў у супаставальных цэнах больш, чым за адпаведны перыяд летась. Спецыялісты падатковай галіны падлічылі, што тэмп росту паступлення такіх падаткаў склаў сёлета 134,3%. Удзельная вага падатку на прыбытак у структуры даходаў бюджэту Брэсцкай вобласці за студзень—лістапад 2012 года склала 17,4%.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## КОЖНЫ ПЯТЫ РУБЕЛЬ — АД БІЗНЭСУ

Бюджэт Віцебскай вобласці прыблізна на 20% напаўняецца падаткамі ад арганізацый сярэдняга і малога бізнесу. Зараз у рэгіёне дзейнічаюць больш як 8,8 тысячы фірмаў.

І толькі ў перыяд са студзеня па кастрычнік г.г. імі выплачана ў бюджэт вобласці 1702,3 млрд рублёў. Паводле інфармацыі абласной падатковай інспекцыі, гэта 19,7% ад агульных паступленняў падаткаў і збораў за гэты перыяд.

Найбольшыя сумы паступілі ад арганізацый малога і сярэдняга бізнесу, якія стаяць на ўліку ў інспекцыях МПЗ Беларусі па Наваполацку — 433,7 млрд рублёў, Кастрычніцкім раёне Віцебска — 364,4 млрд рублёў, а таксама Чыгуначным раёне абласнога цэнтра — 167,1 млрд рублёў.

## МАКУЛАТУРА... ЯК СПОСАБ МЕНЕЙ ПЛАЦІЦЬ ЗА КВАТЭРУ

«Кожны жыхар гарадскога пасёлка і раёна мае магчымасць паменшыць плату за камунальныя паслугі, калі ён збярэ макулатуру і здасць яе на вытворчую базу прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі», — з такім заклікам Расонскі выканаўчы камітэт звярнуўся да землякоў.

Адпаведная аб'ява размешчана і на афіцыйным сайце райвыканкама. З макулатурай чакаюць на вуліцы Калгаснай, дзе гатовы купіць яе па цане 300 рублёў за 1 кілаграм. Такім чынам у раёне цяпер можна зменшыць суму квартплаты, дзякуючы макулатуры, якая прымаецца ў кошт аплаты камунальных паслуг.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ВЫРАШЫЛІ ПАДЗАРАБІЦЬ НА ПІРАТЭХНІЦЫ...

А ў выніку гандляры пазбавіліся партыі тавару ў памеры звыш 20 тысяч адзінак на агульную суму больш за 230 мільёнаў рублёў. І гэта не лічачы штрафных санкцый, якія іх чакаюць.

Падчас правядзення комплексных мерапрыемстваў па спыненні незаконнага гандлю піратэхнічнымі вырабамі аператыўнікі ўпраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі Сталінскага ГУУС разам з калегамі з аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі Цэнтральнага РУУС г. Мінска, супрацоўнікамі інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах і МНС праводзілі праверку захавання правілаў утрымання піратэхнікі ў адным з гандлёвых павільёнаў на рынку «Ждановічы». У выніку высветлілася, што гэтае памяшканне не адпавядае вызначаным патрабаванням да такіх гандлёвых аб'ектаў. Больш за тое, пытанне рэалізацыі ў гэтым павільёне піратэхнікі ўвогуле не ўзгадняліся з органамі выканаўчай улады: па дакументах тут вёўся продаж зусім іншых тавараў. Але перад навагоднімі святамі ўладальнікі вырашылі падзарабіць на піратэхніцы. Матэрыялы накіраваны ў суд.

Дарэчы, за дзень да гэтага аператыўнікі ў Кастрычніцкім раёне сталіцы канфіскавалі яшчэ ў аднаго падпольнага гандляра салютамі і петардамі амаль 8 тысяч адзінак піратэхнічных вырабаў. У дачыненні да затрыманага складзены адміністрацыйны пратакол за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ПАЛЯВАННЕ НА НАВІГАТАРЫ

Гамяльчаніна, які мае вопыт у крымінальным аўтабізнэсе і быў раней асуджаны за крадзяжы з аўто, зноў затрымала міліцыя. Аўтамабільны злодзей «працаваў» у спальных раёнах горада над Сожам.

Вечарам абыходзіў дваровыя тэрыторыі ў пошуках нажывы. Заўважаў аўто, у салоне былі якія пакінуты навігатары і аўтарэгістратары. Зламысьнік вяртаўся да іх ноччу, узломваў бакавое шкло і забіраў дарагую тэхніку. Пры гэтым аўтамагнітолы яго не цікавілі. Выкрадзенае збываў сярод іншых аўтааматараў, якіх не цікавіла «цёмнае» паходжанне каштоўнага гаджэта. Кругласутачна ўзмоцнены затрыманы, грошы за прададзены тавар ён збіраў для таго, каб добра сустрэць Новы год. На гэты час вядома, што мужчына здзейсніў больш за дзесяць крадзяжоў, — паведамілі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## І СТАЛА АЎТО ПАДВОДНАЙ ЛОДКАЙ

Целы двух загінулых мужчын з аўтамабіля, які зваліўся ў раку, дасталі выратавальнікі ў Чашніках.

Паводле інфармацыі Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях, трагедыя адбылася ў раённым цэнтры на вуліцы Гагарына а чацвёртай гадзіне дня. Пра тое, што ў рацэ Ула ў перакуленым стане ляжыць легкавы аўтамабіль, у пажарную службу паведаміў дыспетчар «хуткай дапамогі». Па прыбыцці да месца здарэння было ўстаноўлена, што ў рацэ знаходзіцца «Мазда 626». Супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях з пашкоджанага аўтамабіля вынялі двух загінулых мужчын. Потым групай пазаштатных вадалазаў Чашніцкага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях было абследавана дно ракі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

# «У МАЁЙ ПРАЦОЎНАЙ КНІЖЦЫ АДЗІН ЗАПІС — «СВІТАНАК»



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Кажуць, што** дрэнны той салдат, які не марыць стаць генералам. Але, калі шчыра, то 34 гады таму і падумаць не магла, што стану дырэктарам «Світанка». Не настолькі я самаўпэўнены чалавек. Прыйшла з настроем працаваць на сумленне, з поўнай аддачай. У мяне не было жадання бегаць, шукаць нешта лепшае і лягчэйшае. Я наогул лічу, што найбольшых поспехаў дасягае той, хто не блукае ў жыцці, а выбірае прамую дарогу.

**Назапашаны вопыт,** безумоўна, дапамагае мне цяпер на пасадзе кіраўніка. Не трэба нічога тлумачыць: прыйду на вытворчасць — і адразу ўсё зразумела. Дакладна так і ў побыце: не трэба расказваць, з якімі праблемамі даводзіцца сутыкацца жыльцам нашых інтэрнатаў. Усе гэтыя пытанні мне вядомыя не па чутках. Лічу, што будучы кіраўнік прадпрыемства, каб ведаць вытворчасць знутры, павінен прайсці папярэднія прыступкі кар'ернай лесвіцы.

**Праводжу на працы** як мінімум 8 гадзін. У мяне кожны дзень распісаны на месяц уперад. Калі выбіваюся з графіка, застаюся пасля працы. А як па-іншаму? За мной жа стаяць людзі, яны павінны нармальна, рытмічна працаваць.

**Узначальваю калектыў,** які на 85% складаецца з жанчын. У гэтым больш плюсоў. Бо большасць жанчын — вельмі старанныя, адказныя, сур'ёзна ставяцца да выканання нормаў. Акрамя таго, у нас практычна няма праблем з-за злоўжывання спіртным, чым часам «грашаць» мужчынскія калектывы. Мае работніцы спяшаюцца пасля змены дадому, да дзяцей. Разам з тым жанчыны больш эмацыйныя, чым мужчыны, так што да іх трэба больш старанна шукаць падыход. Што і казаць, сучасным жанчынам даводзіцца нялёгка. Іх «на поўную катушку» ўцягнулі ў вытворчы працэс, але ніхто не вызваліў ад хатніх спраў. У выніку даводзіцца разрывацца паміж сям'ёй і працай. Усё гэта я ведаю з уласнага досведу. Таму імкнуся быць строгім, але справядлівым кіраўніком.

**Кожны работнік** можа прыйсці да мяне ў кабінет, расказаць пра свае праблемы, выказаць свае прапановы. Штотыдзень ажыццяўляю прыём па асабістых пытаннях. Акрамя таго, практычна кожны дзень праходжу па вытворчасці, так што, калі ёсць нейкія пытанні — любы можа мне іх задаць. Лічу, што дырэктар ні ў якім выпадку не павінен адгароджвацца ад сваіх супрацоўнікаў, гэта дрэнна адбіваецца на клімаце ў калектыве.

### Пра добры густ, начную бялізну і непаваротлівасць

**Калі сустракаю на вуліцы** людзей, адзетых у мадэлі «Світанка», думаю, што ў іх добры густ і яны ведаюць, як правільна выдаткаваць свае грошы. Прычым такія сустрэчы бываюць не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі — у Расіі, у еўрапейскіх краінах, дзе мы рэалізуем сваю прадукцыю. Перыядычна бачу жанчын у нашых вырабах і па тэлебачанні, і на старонках газет і часопісаў. Вядома, гэта мне як кіраўніку вельмі прыемна.

**Мая сям'я** таксама з задавальненнем носіць адзенне «Світанка». Што тычыцца начной бялізны, дык іншую мы ніколі і не набывалі, бо ведаем, што яна зроблена з якаснай бавоўны, што фарбавальнікі, якія выкарыстоўваюцца на фабрыцы, не аказваюць шкоднага ўздзеяння ні на арганізм чалавека, ні на прыроду.

**Не люблю, калі** людзі мне навязваюць сваю думку. Таму і гардэроб сабе падбіраю самастойна. Навошта напружваць мужа або сяброўку, калі ў кожнага з нас свой густ, свой кашалёк. Часам параяць нешта такое, што ты ніколі не надзенеш або ты сябе ў гэтым адзенні будзеш адчуваць некамфортна. Асабіста мне падабаюцца практычныя мадэлі, такія, напрыклад, як вось гэты чорны світар, што цяпер на мне.

**У нас вельмі высокая канкурэнцыя,** бо толькі ў Беларусі 4 прадпрыемствы, якія вырабляюць аналагічную прадукцыю, няхай і ў меншых маштабах. Вядома, мы з цікавасцю сочым за іх развіццём. Што тычыцца кітайскага, турэцкага, польскага і іншага трыкатажу, што пастаўляецца на наш рынак, то часцяком яго якасць выклікае вялікія сумневы. І называць іх вытворцаў нашымі канкурэнтамі проста смешна. Галоўны ж канкурэнт любога вытворцы, перакананa, гэта яго лянота і непаваротлівасць.

**У 25 фірмовых крамах** прадстаўляем усю лінейку сваіх мадэляў. Гандаль жа выбірае тое, што лічыць магчымым прадаць у сябе. Беларусы — нацыя дастаткова працалюбівая і эканомная. Яны не будуць траціць грошы бяздумна. Акрамя таго, беларусы ў асноўным патрыёты. Пра гэта сведчыць тое, што нашы летнія майкі з нацыянальнай сімволікай вельмі добра разыходзяцца. Беларусы, у адрозненне ад, напрыклад, немцаў, якія апранаюцца ў адзенне спакойных колераў, аддаюць перавагу яркім мадэлям. Свае густы і ў кожным рэгіёне Расіі. У Маскве, напрыклад, нарасхват белы колер, чаго не скажаш пра рэгіёны. Хоць машыны пральныя і там, і там ёсць.

**Бацькі, і ў Беларусі і за мяжой,** ахвотна разбіраюць нашы дзіцячыя калекцыі. Моладзь больш капрызная, ёй хочацца яшчэ і лэйбл, што называецца, каб адвярнуць і паказаць. Але вясной, калі праязджала па праспекце ля БАТУ і БНТУ, звярнула ўвагу на тое, што хлопцы ходзяць у нашых фуфайках.



**Плануем асвоіць** выраб тэрмабялізны. Упэўнена, яна будзе карыстацца папулярнасцю як у людзей рабочых прафесій, так і аматараў спорту. Бо аўстрыйскія камплекты для гарналыжнікаў каштуюць 300 еўра. Магчыма, для еўрапейцаў гэта і нядорага. Для нас жа... Наўрад ці хто адважыцца аддаць за тэрмабялізну месячны заробак.

### Пра ўпушчаных дзяцей, веласіпед і чысціню

**Асобным жанчынам,** ведаю, даводзіцца стаяць перад выбарам: альбо кар'ера, альбо сям'я. Мне пашанцавала, бо ў мяне былі тут бацькі, пасля свёкар са свякрухай пераехалі ў Жодзіна з Нараўлянскага раёна, і сястра мужа тут жыве. Заўсёды было з кім дзяцей пакінуць. Ды і муж з садка іх мог забраць, калі я вымушана была затрымацца на працы.

**Сям'я не пакутавала** ад таго, што я кіраўнік. Дзеці больш пакутуюць, калі бесталковыя бацькі. Калі бацькі працуюць, да нечага імкнуцца, дзецям ад гэтага толькі лепш. Яны, акрамя таго, што матэрыяльна забяспечаны, дык і вучацца ад іх працалюбству. Таму я ніколі не пагаджуся, што калі жанчына кіраўнік, то дзеці ўпушчаныя. Упушчаныя яны па нейкай іншай прычыне.

**У мяне «лёгкапрамысловая» сям'я**. Сын працуе ў аддзеле рэкламы і дызайну на «Світанку», дачка скончыла Санкт-Пецярбургскі ўніверсітэт тэхналогій і дызайну. Любім збірацца сям'ёй проста так, без нагоды, бо нам добра і цікава разам. Я люблю сваю прафесію, таму толькі рада, што дзеці пайшлі па маіх слядах.

**Маё галоўнае дасягненне** як кіраўніка і заслуга ўсяго калектыву ў цэлым тое, што «Світанак» працуе рэнтабельна. Наш «сакрэт поспеху» просты: працаваць, працаваць і яшчэ раз працаваць. Першарадную ўвагу надаём дызайну. Увесь час ідзе абнаўленне асартыменту, нашы дызайнеры ездзяць на выставы ў Расію, Германію, іншыя краіны, дзе знаёмяцца з апошнімі моднымі тэндэнцыямі. Калі раней было 500-560 мадэляў, то на 2013 год у нас запланавана 800 мадэляў. Стараемся пастаянна нечым здзіўляць свайго кліента, не паўтарацца. Расшыраем рынкі збыту, цяпер, пасля таго, як зніклі мытныя бар'еры, пашырылі пастаўкі ў Казахстан. Пастаянна нешта ўдасканальваем, усталёўваем сучаснае, якаснае, энергазберагальнае абсталяванне. Бо, вобразна кажучы, праца фабрыкі — гэта як язда на веласіпедзе: круціш педалі — значыць, едзеш, спынішся — падаеш. Нават калі «расслабіцца» на адзін год, то ўпушчаны час будзе адчувацца яшчэ доўга.

**У мяне, як і ў любога кіраўніка**, зразумела, вольнага часу вельмі мала. Галоўная мая аддушына — гэта кветкі. Люблю, калі яны цвітуць. Раніцай, калі выходжу на двор і бачу кветкі, адразу ж настрой падымаецца. Зімой даглядаю пакаёвыя.

**Больш за ўсё люблю** падарожнічаць разам з унукам. Мы штогод выязджаем за мяжу дзён на 10, стараемся выбіраць для адпачынку розныя месцы. Вельмі люблю экскурсіі і плаваць, а вось шматгадзіннае ляжанне на пляжы — гэта не для мяне.

***(На развітанне не вытрымліваем і робім Іне Віктараўне камплімент: «У прыёмнай сустрэлі вашых работніц. Усе, як адна, дагледжаныя, з прычоскамі, манікюрам. Яны, пэўна, з вас прыклад бяруць».)***



**Магчыма, гэта я з іх** (*смяецца*). Кожная жанчына павінна сачыць за сабой, а жанчына-кіраўнік — тым больш. Калі жанчына выглядае добра, то, як правіла, парадак і на яе ўчастку. Я люблю чысціню. Стараюся яе падтрымліваць і ў кабінеце, і дома. Не ведаю, як у вас на Мёршчыне кажуць. Але мая мама, яна таксама родам з Віцебшчыны, з Дубровенскага раёна, любіла паўтараць: «Бруд, дачушка, бядзе не дапамога».

**Надзея ДРЫЛА.**
**Фота Надзеі БУЖАН.**

### БЛІЦ-АПЫТАННЕ

**— Якія якасці дапамагаюць кіраваць такім вялікім прадпрыемствам?**

— Усе (*смяецца*), нічога не перашкаджае. Але, думаю, больш за ўсё пачуццё адказнасці.

**— Любімы горад?**

— Я люблю падарожнічаць, адкрываць для сябе новыя месцы. Але ўсё роўна з задавальненнем вяртаюся дадому. Лічу, што Жодзіна — лепшы горад на зямлі для жыцця.

**— Што для вас шчасце?**

— Сям'я. Калі чалавек адзінокі, гэта страшна. Так што і дзеці патрэбны, і «мілы побач». Я лічу сябе моцнай жанчынай, але часам так важна адчуваць, што побач ёсць муж, які зразумее і падтрымае. Наогул, на мой погляд, калі чалавек здаровы, у яго ёсць любімая праца, нармальная сям'я, не здарылася ніякай трагедыі — гэта і ёсць шчасце.

# ДЗІЦЯЧАЯ ЦАЦКА — СІМВАЛ БЯСПЕКІ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У рамках рэгіянальнага праекта «Таксічныя металы ў таварах для дзяцей» было праведзена тэсціраванне цацак і іншых тавараў для дзяцей, набытых у крамах і на рынках Беларусі, Расіі, Казахстана, Кыргызстана, Украіны, Арменіі, на наяўнасць цяжкіх металаў.

— Мы закупілі цацкі, вырабленыя з розных матэрыялаў: метал, пластык, воўна, кардон, кампазітныя матэрыялы. Куплялі мы і некаторыя іншыя тавары для дзяцей, якія не адносяцца да дзіцячых цацак, але разам з тым дзеці з імі гуляюць, — распавяла **супрацоўнік праграмы па экалагічна дружалюбным ладзе жыцця Цэнтра экалагічных рашэнняў Дар'я ЧУМАКОВА.** — Куплялі цацкі мы як у буйных гандлёвых цэнтрах і крамах Мінска, так і на аптовых рынках. У некаторых іншых краінах былі даследаваны і цацкі, якія былі набытыя ў інтэрнэт-крамах. Усяго было набыта 569 тавараў.

Затым усе цацкі былі абследаваны пры дапамозе партатыўнага рэнтгенафлуарэсцэнтнага аналізатара (РФА) на прадмет наяўнасці цяжкіх металаў: свінцу, ртуці, мыш'яку і сурмы. Потым гэтыя вынікі параўноўвалі з нарматывамі, якія рэгулююць колькасць цяжкіх металаў у глебе.

Чаму менавіта нарматывы, зацверджаныя для глебы? «Урады краін сур'ёзна ставяцца да небяспекі, якую нясуць цяжкія металы здароўю людзей, — тлумачыць **намеснік дырэктара па праграмнай дзейнасці Цэнтра экалагічных рашэнняў Яўген ЛАБАНАЎ.** — Гэта пацвярджаецца высокімі стандартамі, якія ўстаноўлены ў краінах УЕКЦА

**МАЙЦЕ НА ЎВАЗЕ**

***Бяспечней за ўсё купляць цацкі не на рынку, а ў буйных крамах.***

(г.зн. краінах рэгіёна Усходняй Еўропы, Каўказа і Цэнтральнай Азіі) для таксічных металаў, якія змяшчаюцца ў глебах. З цацкамі дзіця праводзіць дастаткова шмат часу, таму можа падвяргацца ўздзеянню цяжкіх металаў, удыхаючы пыл з іх паверхні або, напрыклад, падчас «жавання» іх. Менавіта таму тавары для дзяцей павінны быць, па меншай меры, гэтак жа бяспечныя для дзіцяці, як і глеба, па якой яно ходзіць».

Як заяўляюць эколагі, вынікі тэставання даюць сур'ёзныя падставы для незапакоенасці: з 569 тавараў, узятых для праверкі, у 164 узорах змяшчаецца, прынамсі, адзін цяжкі метал з шасці



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

(свінец, мыш'як, ртуць, сурма, кадмій і хром) у канцэнтрацыях, якія перавышаюць «узровень заклапочанасці», гэта значыць нарматыў, які рэгулюе колькасць цяжкіх металаў у глебе.

Тут маецца яшчэ адзін нюанс. Частка дзіцячых тавараў дзіцячымі цацкамі не лічыцца і, адпаведна, не ўваходзіць у Тэхнічны рэгламент Мытнага саюза «Аб бяспецы цацак». Гэта дзіцячая біжутэрыя, спартыўны інвентар, сродкі для абароны — акуляры для плавання, сонцаахоўныя акуляры, прыстасаванні для плавання...

— Нягледзячы на тое, што гэтыя тавары цацкамі не лічацца, дзеці часта гуляюць з імі, і ўзровень кантактавання пры гэтым не меншы, — сцвярджае Дар'я Чумакова. — Падчас нашага даследавання ў гэтых таварах былі знойдзеныя таксічныя металы, напрыклад, у «пасярэбраных» і «пазалочаных» упрыгожаннях, у дзіцячай губной памадзе, у фарбе, якая нанесена на кубак...

### «У нас вельмі строгія стандарты», — сцвярджаюць дзяржэксперты

**Прадстаўніка Беларускага дзяржаўнага інстытута метралогіі Ірыну ЗАХАРАНКАВУ** здзіўляе, чаму пры тэсціраванні цацак за аснову быў узяты нарматыў, які рэгулюе колькасць цяжкіх металаў у глебе. Ніякай сувязі з ім яна не бачыць. «Цацак зусім без цяжкіх металаў не бывае, — заяўляе Ірына Захаранкава. — Усе цацкі ярка афарбоўваюць, а ў фарбе якраз-такі і змяшчаюцца цяжкія металы, але — у дапушчальным аб'ёме». Пры гэтым колькасць цяжкіх металаў у цацках па дзяржстандартах разлічваецца на кілаграм вагі дзіцяці, дадае спецыяліст.

— У нас вельмі строгія стандарты, — кажа Ірына Захаранкава. — Яны абсалютна такія ж, як і ў краінах ЕС,

**ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»**

***Калі ў вас узніклі пытанні, якія тычацца якасці цацак, задаць іх можна спецыялістам Інфармацыйнага цэнтра па хімічнай бяспецы і адходах па гарадскім тэлефоне ў Мінску (8 017) 237 40 70 або па электроннай пошце toys@ecoidea.by.***

а абавязковая сертыфікацыя дзіцячых цацак у Беларусі была прынята яшчэ ў 1994 годзе.

За гэты час, па яе словах, было шмат адмоў у сертыфікацыі цацак. «Каля трох мільёнаў цацак за час існавання нашага органа не прайшлі працэдуру пацвярджэння адпаведнасці як па санітарна-гігіенічных паказчыках (міграцыі шкодных рэчываў), так і па фізіка-механічных, — заяўляе Ірына Захаранкава. — Так што цацкі, якія прайшлі сертыфікацыю і дапушчаны да продажу, бяспечныя для дзіцячага здароўя».

Спецыяліст лічыць, што ацэнка наяўнасці цяжкіх металаў па методыках, якія адрозніваюцца ад тых, што прыняты цяпер, з'яўляецца некарэктнай. Тым больш што прыбор, якім праводзілася даследаванне, не ўнесены ў рэестр сродкаў, якімі можна праводзіць вымярэнні на тэрыторыі Беларусі. «У нас жа лічацца сапраўднымі толькі тыя даследаванні, якія праведзены на прыборах, што ўнесены ў такі рэестр», — кажа дзяржаўны эксперт.

❍ ❍❍

**— А вы дапускаеце, што на наш рынак пранікаюць несертыфікаваныя цацкі? Бо ў суседняй Расіі такое здараецца нярэдка...** — задаём пытанне прадстаўніку Беларускага дзяржаўнага інстытута метралогіі.

— Гэтыя пытанні — кампетэнцыя кантрольных органаў. Мы адказваем толькі за тое, што прайшло стандартызацыю, — гаворыць спецыяліст.

❍ ❍❍

Вядома, даследаванні, праведзеныя эколагамі, выклікаюць шэраг пытанняў, але разам з тым адмахвацца ад іх зусім было б, напэўна, неразумна. Бо гэта не спроба паставіць пад сумнеў працу дзяржаўных сертыфікацыйных органаў. Гэта — імкненне зірнуць на праблему бяспекі нашых дзяцей свежым позіркам.

Дарэчы, у пераважнай большасці — у трох чвэрцях — цацак адсутнічалі таксічныя рэчывы, канцэнтрацыі якіх перавышалі мяжу дапушчальнасці. Гэта значыць, «чыстыя» цацкі ёсць, і вытворцы ў стане — і тэхнічна, і эканамічна — іх вырабляць. «Мы толькі спрабуем звярнуць увагу на тое, што нормы з часам варта змяняць», — кажуць эколагі.

### «Галасуйце» сваім кашальком толькі за якасныя цацкі

Як бачыце, да выбару дзіцячых цацак трэба падыходзіць адказна. Як раіць **старшыня Беларускага таварыства абароны спажыўцоў Ганна СУША,** каб купіць бяспечную цацку, важна навучыцца чытаць інфармацыю на ўпакоўцы. На ёй абавязкова павінна быць пададзена не толькі назва цацкі, але і краіна-вытворца, імпарцёр, інфармацыя для сувязі, таварны знак (калі маецца), мінімальны ўзрост дзіцяці, для якога прызначана цацка (на гэта абавязкова трэба звяртаць увагу), матэрыял, з якога выраблена цацка, спосабы догляду, а таксама дата вырабу, тэрмін службы ці тэрмін прыдатнасці, умовы захоўвання. У залежнасці ад віду цацкі яшчэ ўключаюцца ў маркіроўку правілы эксплуатацыі, меры бяспекі, інструкцыя па зборцы і папераджальныя надпісы.

Патрабуйце ў прадаўца дакументы, якія пацвярджаюць якасць цацкі. Пажадана таксама захаваць чэк і ўпакоўку, каб у выпадку ўзнікнення сумненняў па пытаннях якасці і бяспекі была магчымасць даказаць, дзе набыта цацка.

**Святлана БУСЬКО.**

# АВАРЫЯ НА ТРУБАПРАВОДЗЕ Ў ГРОДНЕ

**Адзінаццаць жыхароў прыватных дамоў, падтопленых у выніку аварыі на трубаправодзе па вуліцы Белуша ў Гродне, у тым ліку трое дзяцей, выратаваны работнікамі МНС. Пры гэтым два выратавальнікі атрымалі апёкі і шпіталізаваны, паведаміла карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС Наталля Жывалеўская.**

Паведамленне аб разрыве трубаправода цеплазабеспячэння дыяметрам 700 мм каля аднаго з жылых дамоў па вуліцы Белуша паступіла ў цэнтр аператыўнага кіравання абласнога ўпраўлення МНС у 3 гадзіны 1 хвіліну. На месца здарэння былі адразу ж накіраваны 26 работнікаў МНС, 7 адзінак тэхнікі, быў абвешчаны экстранны збор гарадской камісіі па надзвычайных сітуацыях для каардынацыі дзеянняў па ліквідацыі наступстваў аварыі, прыцягнення неабходных сіл і сродкаў. Вышыня гарачага вадзянога патоку дасягала метра. Выкарыстоўваліся выратавальныя дошкі, дзяцей выносілі з падтопленых дамоў на руках. Аварыйныя брыгады заняліся адпампоўваннем вады і забеспячэннем жылога сектара цяплом па абводных трубаправодах. Жыхары пацярпелых дамоў на перыяд аднаўленчых работ у асноўным пераехалі да сваякоў, некалькі чалавек — у гасцініцы.

На 12 гадзін учарашняга дня адключанымі ад ацяплення былі 19 жылых будынкаў, аднак у выніку аднаўленчых работ, якія каардынуюцца штабам на чале з намеснікам старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзімірам Дзяшко, гэтая колькасць да канца дня, відавочна, павінна была зменшыцца.

Паводле інфармацыі Наталлі Жывалеўскай, стан здароўя работнікаў МНС, якія атрымалі апёкі, здавальняючы. Медыцынская дапамога спатрэбілася таксама двум жыхарам пацярпелых дамоў, аднак траўмы аказаліся нязначнымі і абышлося без шпіталізацыі. Акрамя таго, прычынена шкода пяці легкавым аўтамабілям, якія праваліліся пад дарожнае пакрыццё з-за падмывання дарогі, і яшчэ тром машынам, што былі падтоплены на падворках.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**



Фота БЕЛТА.


**Шаноўныя сябры!**

**Працягваецца падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2013 года!**

Спадзяёмся бачыць вас сярод нашых чытачоў і падпісчыкаў і ў наступным годзе.
А напярэдадні навагодніх святаў хочам нагадаць вам, што падпіска на «родную газету на роднай мове» можа стаць добрым падарункам родным вам людзям!

| Індэкс/перыяд | | 1 месяц | 3 месяцы | 6 месяцаў |
|---|---|---|---|---|
| 63850 | (для індывідуальных падпісчыкаў) | 33 000 | 99 000 | 198 000 |
| 63145 | (для ветэранаў ВАВ і пенсіянераў) | 29 700 | 89 100 | 178 200 |
| 63858 | (для ведамасных падпісчыкаў) | 61 000 | 183 000 | 366 000 |
| 63239 | (ведамасная падпіска для ўстаноў міністэрстваў адукацыі, культуры і аховы здароўя) | 54 900 | 164 700 | 329 400 |

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

■ Капейка рубель беражэ

# КУДЫ ЗБЯГАЮЦЬ ГРОШЫ?

## Парушэнні пры будаўніцтве: тыповыя і нетыповыя

**НЯГЛЕДЗЯЧЫ на дзейную сістэму кантролю за будаўнічымі работамі і расходаваннем на іх бюджэтных сродкаў, будаўнічыя арганізацыі часта дапускаюць парушэнні, якія прыводзяць да завышэння кошту выкананых работ. І, як канстатуюць рэвізоры, гэта ўжо, на жаль, традыцыя.**

Камітэтам дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці падчас праверак выяўляюцца факты завышэння кошту выкананых работ у будаўніцтве.

— Асноўнай прычынай у камітэце лічаць недастатковы кантроль за ходам будаўнічых работ з боку заказчыка, тэхнічнага нагляду і непасрэдна прараба. Напрыклад, пры ўзвядзенні першай чаргі раённай бальніцы ў гарадскім пасёлку Шаркаўшчына, разлічанай на 165 ложкаў, з паліклінікай на 200 наведванняў за змену кошт выкананых работ толькі па агароджы тэрыторыі быў завышаны на 152,6 мільёна рублёў, — расказваюць супрацоўнікі камітэта. — Вага секцый агароджы аказалася завышанай аж на дзве тоны. Аплацілі работы за ўстаноўку 173 слупоў і 211 секцый, а фактычна ўстанавілі толькі 166 слупоў і 204 секцыі. У выніку бюджэт страціў 45 мільёнаў рублёў.

Разам з тым, як упэўнены рэвізоры, для прадухілення такіх парушэнняў ні прадстаўніку заказчыка, ні прадстаўніку тэхнічнага нагляду, якія маюць вышэйшую будаўнічую адукацыю, не патрабуецца якіх-небудзь спецыяльных ведаў у галіне будаўніцтва. Ад іх патрабуецца толькі адно — добрасумленна выконваць свае абавязкі.

Быў выяўлены факт завышэння аплаты работ па ўсталяванні пакрыцця падлогі ў радзільным аддзяленні: работа падрадчыкам не была выканана, а сродкі ў суме 11 мільёнаў рублёў атрыманы. І зноў ні з боку заказчыка, ні з боку тэхнічнага нагляду прэтэнзій да падрадчыка не было прад'яўлена.

А вось нетыповы прыклад завышэння кошту работ. Будаўніцтва аб'екта ажыццяўлялася на тэрыторыі ўстановы, якая ўваходзіць у сістэму Дэпартамента выканання пакаранняў Міністэрства ўнутраных спраў. Аб'ект размяшчаўся за межамі горада, а таму падрадная арганізацыя прад'яўляла да аплаты выдаткі, звязаныя з раз'язным характарам работ. Але пры праверцы аб'екта высветлілася, што падрадчыкам да будаўніцтва былі прыцягнуты асуджаныя, якія пражываюць на тэрыторыі гэтай папраўчай установы. А значыць, выплата кампенсацыі за раз'язны характар работ не прадугледжвалася.

Аднак факт застаўся чамусьці незаўважаным падраднай арганізацыяй і заказчыкам, УКБ Віцебскага аблвыканкама, прадстаўнікі якога неаднаразова наведвалі аб'ект...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# НАВАГОДНІЯ ПРЫГОДЫ З ЧАРАЎНІКОМ

**НА Міншчыне стартавала навагодняя дабрачынная акцыя «Нашы дзеці». Святочнымі мерапрыемствамі будуць ахоплены дзеці-сіроты, інваліды, выхаванцы з малазабяспечаных і шматдзетных сем'яў, адораныя і таленавітыя дзеці, а таксама дзеці, якія маюць патрэбу ў дзяржаўнай падтрымцы.**

Галоўнай падзеяй, бясспрэчна, стане свята «Навагоднія прыгоды чараўніка» з удзелам губернатара Барыса Батуры, якое адбудзецца 22 снежня ў Палацы культуры г. Салігорска. Навагодняя ёлка збярэ разам больш за 740 дзяцей з усіх рэгіёнаў вобласці. Іх чакаюць салодкія падарункі, вялікая забаўляльная праграма. У прыватнасці, шэсце Дзедаў Марозаў і Снягурак, сустрэчы з героямі любімых казак, карагод вакол ёлкі і вандроўка па алеі «Лядовыя скульптуры». Падчас акцыі будзе працаваць майстэрня па вырабе навагодніх сувеніраў, упрыгажэнняў, цацак, роспісе рук і твараў адпаведна ў тэхніцы «мэндзі» і «аквагрым», майстар-клас «Далонька сяброўства», латарэя «Зімовыя забавы», караоке «Музычная хатка».

Для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, з Грозаўскай сярэдняй школы-інтэрната спонсары з Міністэрства па падатках і зборах ладзяць прадстаўленне «Зімовай казачнай парой». Прадугледжана таксама экскурсія на завод Coca-Cola. У Радашковіцкай школе-інтэрнаце для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, ансамбль Міністэрства ўнутраных спраў арганізуе канцэртную праграму і навагоднюю казку «Незвычайныя прыгоды чароўнага посаха Дзеда Мароза». Курсанты Ваеннай акадэміі наведаюць з канцэртам і падарункамі выхаванцаў Уздзенскай дзяржаўнай школы-інтэрната для дзяцей з саматычнай паталогіяй.

Усяго ж у навагодняй акцыі прымуць удзел больш за 10 тыс. дзяцей сталічнага рэгіёна.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

■ Адходы і даходы

# «ГАРАЧЫ» РАЗЛІК

**ПАД Новы год на ААТ «Клімавіцкі камбінат хлебапрадуктаў» мяркуюць атрымаць першае цяпло ад спальвання адходаў, якія раней тут адпраўлялі на сметнік.**

На прадпрыемстве заканчваецца мантаж двух сучасных катлоў, для якіх палівам будуць... непрыдатныя збожжавыя адходы (ад вытворчасці мукі і камбікорму). Раней іх утылізавалі, што патрабавала дадатковых выдаткаў: і транспарт для вывазу, і адлічэнні камунальнікам. А гэта ўсё грошы.

— Цяпер мы будзем спальваць гэтыя адходы і атрымліваць энергію, — расказаў галоўны інжынер Клімавіцкага камбіната хлебапрадуктаў Сяргей Краўчанка. — Ёй мы збіраемся ацяпляць адміністрацыйны будынак і інтэрнат, падаграваць гарачую ваду для ўсяго камбіната.

Новыя катлы літоўскай вытворчасці ўсталёўваюць беларускія спецыялісты. Абсталяванне каштавала прадпрыемству 3,3 мільярда рублёў уласных грошай. Эканомія складзе, паводле папярэдніх падлікаў, 30 тысяч долараў за год.

— Але гэта толькі пачатак, бо ў нас запланавана мадэрнізацыя ўсёй ацяпляльнай сістэмы камбіната, — удакладніў начальнік парасілавога цэха Дзмітрый Пракапенка. — Далей думаем усталяваць вадагрэйны кацёл на газе і парагенератар. Мы ліквідуем усе страты цяпла. Эканомія стане больш адчувальнай.

Цяпер каля парасілавога цэха ўзводзяць склад для захоўвання збожжавых адходаў. Самі катлы перадавога чырвонага колеру ўжо ўсталяваныя і хутка запрацуюць. Усе працэсы тут поўнасцю аўтаматызаваныя. Безумоўна, газ і мазут застаюцца: яны вытворча неабходныя для камбіната, але і свае, мясцовыя віды паліва варта выкарыстоўваць.

— Стратэгія эканоміі важная для нас, — падкрэсліў галоўны інжынер. — Праўда, усе гэтыя новыя тэхналогіі каштуюць дорага, а эфект атрымліваецца не адразу. Але ён ёсць, і будзе яшчэ большы.

Таму нездарма ў прахадной Клімавіцкага камбіната хлебапрадуктаў вісіць лозунг: «Эфектыўнасць у выкарыстанні электраэнергіі павышае эфектыўнасць працы нашага прадпрыемства». Ён не страціць сваю актуальнасць і ў 2013-м, які аб'яўлены Годам беражлівасці.

**Ілона ІВАНОВА**

■ Эканомім энергію

# ГЕРМЕТЫЧНАЯ КВАТЭРА?..

## Чаму нельга ігнараваць прапісныя ісціны

**ДАВОЛІ тыповая сітуацыя: у кватэры — сучасныя герметычныя вокны. Ды толькі чаму радавацца, калі на сценах вільгаць? Зразумела, жыльцы скардзяцца ў розныя інстанцыі, абвінавачваючы будаўнікоў і жыллёва-камунальную службу. Але пры гэтым нікога не цікавяць прапісныя ісціны, якія яшчэ з дзіцячых гадоў вывучаюцца ў школе, лічыць галоўны інжынер інстытута «Гроднаграмадзянпраект» Рышард КАЦЫНЕЛЬ. Што маецца на ўвазе?**

— Элементарны закон фізікі заключаецца ў тым, што вакууму ў кватэры быць не можа. І для таго, каб выцягваць паветра з кватэры, неабходна арганізаваць туды яго прыток. А што нярэдка адбываецца? Жыльцы, атрымаўшы пры герметычных вокнах магчымасць значнага скарачэння цепластрат (асабліва пры сістэмах з пакватэрным улікам), не хочуць прыадчыняць вокны для забеспячэння прытоку паветра і работы вентыляцыі. Так бы мовіць, закупорваюцца ў кватэрах. У выніку не адбываецца абмену паветра, і назапашваюцца таксічныя рэчывы. Адсюль і вільгаць на сценах, асабліва ў кутках і месцах, што застаўлены мэбляй. Пры гэтым жыльцы не могуць зразумець, чаму трэба, здавалася б, цудоўныя герметычныя вокны прыадчыняць, ствараючы шчыліны для паступлення халоднага паветра? Ці прымальна зніжаць зацверджаную ў рэспубліцы нарматыўную тэмпературу ў кватэры (+ 18 градусаў), якая падтрымліваецца цеплавымі сеткамі? Асабліва калі ў сям'і маленькія дзеці...

Тут варта прывесці звесткі з некаторых нарматыўных дакументаў. Прычым, звяртаем увагу: устаноўлена норма не толькі тэмпературы паветра ў кватэрах, але і вільготнасці (не больш за 60 %). Пры гэтым, згодна з пабудаванай у названым інстытуце дыяграмай, пункт расы (тэмпература, пры якой пара паветра выпадае ў кандэнсат) складае 9 градусаў. А тэмпература на паверхні вонкавых сцен (і па разліку, і па замерах) складае 14-15 градусаў. Такім чынам, умоў для кандэнсату няма.

— Затое пры цалкам зачыненых вокнах і адсутнасці абмену паветра вільготнасць заўсёды павышаецца. Пры праверцы скаргаў фактычна яна ў кватэрах складае 70-80, а іншым разам і 90 %. Пры такой вільготнасці кандэнсат выпадае ўжо пры тэмпературы 15-16 градусаў, што мае месца на паверхні сцен. Між іншым першы раз мы сутыкнуліся з такой праблемай 20 гадоў таму пры будаўніцтве гарадка ў Росі, дзе ўпершыню ў рэспубліцы пабудавалі дамы са сценамі, удвая цяплейшымі, чым па нормах, і з нямецкімі герметычнымі вокнамі. Аднак пасля засялення на верхніх двух паверхах масава назіраўся кандэнсат па сценах, — кажа Рышард Кацынель.

Тут варта адзначыць, што ў Еўропе іншая разліковая тэмпература паветра ў жыллі +22 градусы, што з'яўляецца больш камфортным паказчыкам і дае магчымасць адчыняць вокны для праветрывання.

Дарэчы, сёння, пры пераходзе з ранейшых агульнадамавых сістэм ацяплення на пакватэрныя — з рэгуляваннем, улікам і аўтаматыкай, насельніцтва не гатова да самастойнай эксплуатацыі складаных прылад. У жыллёва-будаўнічых кааператывах часта карыстаюцца паслугамі не інжынернага персаналу з рэгулюючай і кантрольна-вымяральнай тэхнікай, а выпадковых слесараў. У выніку парушаецца наладжаны будаўнікамі рэжым працы сістэм ацяплення і гарачага водазабеспячэння.

— Як жа стварыць камфортныя ўмовы пражывання, пазбягаючы лішніх затрат цеплавой энергіі?

— Адзіна правільным і эканомным рашэннем, на мой погляд, можа быць толькі паўсюднае будаўніцтва энергаэфектыўных дамоў з прыточна-выцяжной механічнай вентыляцыяй накшталт эксперыментальнага 69-кватэрнага дома па вуліцы Дзяржынскага ў Гродне. Тут ніхто з жыльцоў не можа ні на каго паскардзіцца, бо ён сам кіруе тэмпературна-вільготнасным рэжымам у кватэры і яе вентыляцыяй.

Мяркую, што неабходна на дзяржаўным узроўні прыняць рашэнне аб будаўніцтве кватэр толькі з сістэмамі механічнай вентыляцыі і цеплаўтылізацыі выцяжнога паветра, прадугледзеўшы стымулы для забудоўшчыкаў такога жылля, субсідаванне дадатковых затрат уладальнікам кватэр. Каб аблегчыць фінансавую нагрузку на жыльцоў, дзяржаве мэтазгодна свае датацыі на кампенсацыю затрат жыллёва-камунальнай гаспадаркі накіраваць на ўстаноўку сістэм цеплаўтылізацыі. Тым самым значна скароціцца спажыванне цеплавой энергіі, а значыць, і газу (не нашага!) на яе выпрацоўку. Выгада усебаковая!

Важна таксама забяспечыць правільнае абслугоўванне інжынерных сістэм дамоў. Для гэтага жыллёва-будаўнічыя кааператывы адразу ж пры здачы дамоў у эксплуатацыю павінны перадаваць інжынерныя сістэмы спецыяльным службам жыллёва-камунальнай гаспадаркі, якія неабходна ўкамплектаваць падрыхтаваным персаналам. Пры гэтым афіцыйным дзяржаўным органам павінна быць зацверджана абавязковая да выканання інструкцыя для жыльцоў па правілах эксплуатацыі кватэр і іх інжынерных сістэм. Трэба, каб пры здачы дамоў праводзіўся адпаведны інструктаж уладальнікаў кватэр з уручэннем пад распіску гэтага дакумента. Бо неабходна ведаць, што сёння, у адрозненне ад 60-70-х гадоў мінулага стагоддзя, кватэра начынена рознымі тэхнічнымі сродкамі, выканана больш дакладна, і кожнае адступленне ад правілаў эксплуатацыі можа прывесці да непрыемных вынікаў.

Акрамя таго, упэўнены Рышард Кацынель, трэба змяніць будаўнічыя нормы і ўстанавіць больш камфортную разліковую тэмпературу паветра ў жылых памяшканнях — 22 °С. Гэта асабліва важна для першых двух гадоў эксплуатацыі кватэр, паколькі тэмпы будаўніцтва высокія, і дамы здаюцца з канструкцыямі ў непрасушаным стане. І перш за ўсё гэта датычыцца кватэр у тарцах дамоў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

■ Во сказаў!

# А СТРЭЛЬБУ... У СНЕЗЕ ЗНАЙШОЎ

**Супрацоўнікі Гомельскай міжрайінспекцыі затрымалі двух грамадзян з незарэгістраванымі паляўнічымі стрэльбамі. Адна з іх была знойдзена пры аглядзе асабістага аўтамабіля. А далей — проста навагодняя казка з элементамі дэтэктыва...**

— Уладальнік машыны — жыхар Гомеля — заявіў, што знайшоў незараджаную стрэльбу некалькі гадзін таму непадалёку ад месца яго затрымання. Гэта пры тым, што моцны снегапад у той момант імгненна замятаў нават свежыя сляды, не тое што кінутую на зямлю стрэльбу, — паведаміла «Звяздзе» прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч. — Так што інспектары на слова парушальніку не паверылі і цяпер па гэтым факце праводзіцца праверка. Другі затрыманы, жыхар вёскі Краўцоўка Гомельскага раёна, калі ўбачыў дзяржінспектараў, паспрабаваў уцячы і выкінуць боепрыпасы, бо дазволу на паляванне грамадзянін не меў. Ад сваёй стрэльбы, якая таксама аказалася незарэгістраванай, парушальнік пазбавіцца не паспеў. Абодвух затрыманых чакае адміністрацыйная адказнасць.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

| МАГІЛЁЎСКІ АБЛАСНЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ | МОГИЛЕВСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ |
|---|---|
| **ВЫПІСКА З РАШЭННЯ** | **ВЫПИСКА ИЗ РЕШЕНИЯ** |

30.11.2012 № 18-51

г. Магілёў г. Могилев

О внесении изменений и дополнения в решение облисполкома от 25 февраля 2011 г. № 4-2 и признании утратившими силу некоторых решений облисполкома

На основании подпункта 1.13[1] пункта 1 Декрета Президента Республики Беларусь от 20 марта 1998 г. № 3 «О приватизации государственной собственности в Республике Беларусь» Могилевский областной исполнительный комитет РЕШИЛ:

1. Внести в решение облисполкома от 25 февраля 2011 г. № 4-2 «Об утверждении плана преобразования унитарных предприятий областной коммунальной собственности в открытые акционерные общества и плана приватизации объектов областной коммунальной собственности на 2011–2013 годы» следующие изменения и дополнение:

раздел «2012 год» плана преобразования унитарных предприятий областной коммунальной собственности в открытые акционерные общества на 2011–2013 годы, утвержденного этим решением, дополнить подразделом следующего содержания:

**«Управление идеологической работы облисполкома**

Унитарное полиграфическое коммунальное предприятие «Мстиславская укрупненная типография».

Председатель Могилевского областного исполнительного комитета П.М. Рудник

Управляющий делами Могилевского областного исполнительного комитета Г.А. Воронин

## «Антыкварныя» міны

Двое жыхароў Гарадоцкага раёна паспрабавалі зарабіць на продажы трох мін работніку крамы антыкварыяту ў Віцебску. Боепрыпасы перыяду Вялікай Айчыннай вайны знайшоў адзін з мужчын, але ў міліцыю не здаў. Знаёмы антыквар «пагадзіўся» набыць міны за 300 000 рублёў, а сам тым часам паведаміў у міліцыю. Прадаўцоў затрымалі. Экспертыза ўстанавіла, што канфіскаваныя міны адносяцца да катэгорыі выбуховых прылад і боепрыпасаў і на момант правядзення даследавання былі прыдатныя для выбуху. Пры прызначэнні пакарання суд улічыў, што ад дзеянняў абвінавачаных не наступіла цяжкіх наступстваў. Суд прысудзіў ім 3 і 4 гады абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

■ Крымінал

# СЫН БАЦЬКУ «ЗАКАЗАЎ»

**Раскрыта заказное забойства гомельскага 45-гадовага прадпрымальніка і яго маці. 20-гадовы сын камерсанта і яго сябар затрыманы па падазрэнні ў здзяйсненні злачынства.**

На пачатку снежня ў Гомелі пры тушэнні пажару ў прыватным доме былі знойдзены два трупы: мужчыны і жанчыны. Як высветлілася — маці і сына. Апошні здаваў у пракат дарагія аўтамабілі: у яго было два «Мерседэсы 500», «Фальксваген-Пасат Б6» і яшчэ тры машыны. Пры правядзенні шэрагу аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў і следчых дзеянняў супрацоўнікі крымінальнага вышуку і Следчага камітэта ўстанавілі асобы падазраваных. Імі сталі 20-гадовы непрацуючы гамяльчанін і яго аднагодак, грамадзянін Расіі — сын і ўнук забітых. Высветлілася, што апошні з 5-га класа пражываў з маці ў Расіі, і толькі часам — у горадзе над Сожам. Намеснік начальніка ўпраўлення Следчага камітэта па Гомельскай вобласці Юрый Дзям'янчык расказаў, што расійскі сын прадпрымальніка марыў займець аўтамабілі ў спадчыну і затым прадаць іх. На атрыманыя грошы хацеў адкрыць покерны клуб. Сам жа перыядычна падзарабляў дыджэем у розных забаўляльных установах. Бацьку ён лічыў скнарам і меў з ім нацягнутыя адносіны. Малады чалавек рыхтаваўся да забойства родных на працягу паўгода. Думаў пра розныя спосабы здзяйснення злачынства і нават спрабаваў намазаць ядам камп'ютарную клавіятуру. Не дапамагло. Пасля знайшоў прыяцеля, які пагадзіўся забіць сваякоў за $10 тысяч.

Злачынства было здзейснена на 45-годдзе бацькі, уначы. У яго дом зайшоў прыяцель сына і на пытанне: «Што ты тут робіш?», адказаў, што прынёс ключы. Адной рукой працягнуў іх, а другой ударыў мужчыну малатком па галаве. Маці кінулася на дапамогу і таксама атрымала ўдары па галаве. У гэты час сын знаходзіўся на дыскатэцы. Пасля здзяйснення зверскай расправы выканаўца запрасіў яго і паказаў вынікі сваёй «працы». З дома былі вынесены рэчы і грошы, а трупы маладыя людзі перанеслі ў багажнік аўтамабіля. Праўда, не змаглі іх вывезці з-за галалёду. На працягу дзесяці дзён забітыя ляжалі ў аўтамабілі, які стаяў у двары дома. Іх ніхто не шукаў, бо сваякоў у Гомелі не было. Забойцы ўрэшце вырашылі спаліць трупы ў доме. Але ж пасля падпалу аператыўна прыехалі выратавальнікі і не далі магчымасці дому згарэць цалкам. Злачынцаў затрымалі на працягу тыдня, хоць адзін з іх выехаў у Расію, а другі хаваўся ў Гродне з часткай грошай, якія атрымаў у якасці ганарара за забойства.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ**

■ Рэверс з сеціва

# «ЗАДАЧА ЎНІВЕРСІТЭТА — НАВУЧЫЦЬ ЧАЛАВЕКА ВУЧЫЦЦА»


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У 2013 годзе Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі цалкам плануе перайсці на двухступеньчатую сістэму падрыхтоўкі кадраў па схеме 4+2: чатыры гады навучання на першай ступені і два — на другой (чытай артыкул у «Звяздзе» «Тэхнічная адукацыя — пад мікраскопам» у нумары за 5 снежня). Гэта стала магчымым дзякуючы аптымізацыі колькасці гадзін, што выдзяляюцца для вывучэння цыкла сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, змяншэння цыкла прыродазнаўча-навуковых дысцыплін і аптымізацыі колькасці гадзін, якія адводзяцца на вывучэнне агульнапрафесійных дысцыплін. Па словах рэктара БДУІР Міхаіла Батуры, пачынаючы з 2-3 курса прыкладна палова студэнтаў дзесьці працуюць, а на чацвёртым курсе іх колькасць павялічваецца ўжо да 80 працэнтаў. А што пра падрыхтоўку спецыялістаў у БДУІР думаюць яго былыя выпускнікі і цяперашнія студэнты?**

@

**Heding:**

А чым цяперашняя сістэма дрэнная? Я магістр у IT-сферы, магу сказаць, што толкам нічога не змянілася. Хіба што хутчэй будуць штампаваць «айцішнікаў»?

@

**NGans:**

Я — выпускнік факультэта радыёэлектронікі, а працую праграмістам. Цяпер разумею, што філасофія таксама не проста так была ў курсе лекцый. Гэта ўсё важна, толькі не ўсе гэта разумеюць...

@

**paparazzo:**

Першыя чатыры гады пасля заканчэння ВНУ — самыя напружаныя, калі трэба набірацца досведу, вучыцца многім рэчам занава, так бы мовіць, на практыцы. А далей, калі ты добры спецыяліст, то цябе і знойдуць, і прапануюць работу, і будзеш зарабляць!

@

**vkurse:**

Мне здаецца, што вучыць чатыры гады — памылка, асабліва скарачаючы гуманітарныя дысцыпліны. Бо на выхадзе з універсітэта будуць неадукаваныя і неначытаныя «кодары»...

@

**Ko4egar:**

Палову гуманітарных дысцыплін складаюць нікому не патрэбныя «Асновы паліталогіі», «Асновы псіхалогіі і педагогікі» і гэтак далей. Лічу, калі камусьці цікавая псіхалогія, паліталогія ці ідэалогія, той і сам знойдзе магчымасць усё гэта вывучыць. А каму гэтыя прадметы нецікавыя — той усё роўна нічога рабіць не будзе.

@

**1003:**

ВНУ павінна выпрацаваць іншы склад думак, даць хоць бы «азы» чагосьці новага, што, можа, ніколі і не спатрэбіцца, але вучыць чалавека аналізаваць, думаць, і не эмпірычна, а абгрунтавана.

@

**thebinoklya:**

Калі чалавеку патрэбны веды, то ён іх возьме. А калі ты чакаеш, што ўсё ў галаве само сабой з'явіцца, то спадзявацца на ўніверсітэт — глупства. Я бачу гэтаму мноства доказаў кожны дзень — і на прыкладзе выпускнікоў БДУІР, і на прыкладзе выпускнікоў БДУ.

@

**Жук:**

Звычайна тое, чаму навучаюць ва ўніверсітэце, у штодзённай рабоце ніхто не выкарыстоўвае. Задача ўнівера — навучыць чалавека вучыцца.

@

**nevski17:**

За ўсе факультэты казаць не стану, але на факультэце камп'ютарнага праектавання, напрыклад, сур'ёзна перапрацавалі вучэбную праграму ў бок менавіта праграмавання. А ўвогуле, як паказвае практыка, веды, атрыманыя ва ўніверсітэце, рэдка патрэбны для работы, так што трэба больш практыкі ў рэальных кампаніях.

@

**riCh99:**

На гуманітарныя прадметы ўсё роўна ніхто ніколі не ходзіць з «тэхнароў», так што пагаршэння ведаў баяцца не варта...

@

**Metalor:**

Сам вучуся на трэцім курсе. Падпрацоўваю па спецыяльнасці па меры наяўнасці часу, якога катастрафічна не хапае, таму што з трэцяга курса пачаліся самыя патрэбныя і цікавыя прадметы. І выкладчыкі, як ні дзіўна, — маладыя, талковыя спецыялісты (напэўна, па размеркаванні адпрацоўваюць), ставяць актуальныя для сённяшняга дня задачы.

@

**Monzo:**

Заканчваю БДУІР вочна, не праграміст, маю працу. Веды і ўменні, атрыманыя ў ВНУ, дапамагаюць. За заробленыя грошы плачу за ўніверсітэт, не крыўджу сябе ў плане харчавання, маю магчымасць адпачываць, жыву адзін. Мой наймальнік вельмі задаволены ўзроўнем падрыхтоўкі і прыглядаецца да іншых выпускнікоў. У маёй групе яшчэ як мінімум трое маюць такія ж умовы ў плане заробку. Але ёсць адчуванне, што многія толькі дзеля «коркі» пайшлі ў ВНУ. Паступайце хоць у Гарвард, хоць у Маскоўскі ўніверсітэт — розніцы не будзе. Праблема ў кожным асобна ўзятым «разумніку», які так і не зразумеў, навошта яму навучанне ў ВНУ? А такіх зараз вельмі шмат.

@

**Grupen:**

Заканчваю сёлета факультэт камп'ютарных сістэм і сетак. Размеркаванне ўжо прайшло. Працэнтаў 80 «аднапалчан» былі размеркаваны на сваё цяперашняе месца працы. Але і на дзяржпрадпрыемствах спіс быў «топавы»: «Агат», Беларуская чыгунка, МАЗ і г.д. І тыя хлопцы, што не працавалі, пойдуць на дзяржаўныя прадпрыемствы. Заробкі нішто сабе — прыстойныя. Па 4—4,5 мільёна абяцаюць. Вядома, не тое, на што можна было разлічваць у IT, маючы хоць нейкі практычны досвед, але для дзяржаўнага сектара — нядрэнна. Не ведаю, як на іншых факультэтах, але за пяць гадоў навучання на факультэце камп'ютарных сістэм і сетак нас добра прымусілі папакутаваць, але галоўнае — змясцілі ў акружэнне людзей, якія таксама хочуць займацца IT.

@

**yuzefovich_egor:**

Навучаюся на 3 курсе факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ. Цалкам расчараваўся ў нашай сістэме адукацыі. Мноства бескарысных прадметаў, бескарысных заданняў, а з кожным курсам яшчэ і ўсё больш бескарысных выкладчыкаў. Першыя тры семестры вучыцца стараўся. Потым канчаткова пераканаўся ў бессэнсоўнасці гэтага занятку. Маю на ўвазе навучанне ва ўніверсітэце. Уладкаваўся на работу ў праграмісцкую кантору. Вядома 3 «штукі» не атрымліваю, але на жыццё хапае. Да таго ж і ведаў праца нашмат болей дае.

@

**6401003:**

Заканчваю пяты курс універсітэта. У маёй групе паяльнік трымалі ў руках 3 чалавекі. Ну і што гэта за інжынеры-электроншчыкі?

@

**-gor-:**

Адны кажуць, што «N працэнтаў нашых студэнтаў працуюць». Іншыя кажуць: «Вы — студэнт, вы абавязаны вучыцца, а не працаваць». Мне гэта заявілі ў дэканаце, дзе браў «паперку» на адпрацоўку прапушчанай лабараторнай. Вось было б здорава, калі б усе нарэшце вызначыліся са сваім стаўленнем да студэнтаў, што працуюць!

**Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА**

■ Мая праўда

# КАНЕЦ СВЕТУ — У НАШЫХ ГАЛОВАХ



**ПАЧАЦЬ хацелася б у стылі сатырыка Задорнава. Крыўдна, што канец свету прыпадае на пятніцу. Выхадныя прападуць. Ды і ў панядзелак падзяліцца на працы з калегамі ўражаннямі не зможам. Дарэчы, а ці трэба ўвогуле ісці на працу ў пятніцу? Трэба ж вызначыцца загадзя, каб не было рознычытанняў. Калі ўсё пойдзе не па «сцэнары», што тады пісаць у тлумачальнай: не было на рабочым месцы, бо чакаў канца свету? Колькі можна чакаць афіцыйна і па якім сігнале спыняць чаканне? З іншага боку, мне тут дзяжурства па нумары менавіта на 21-е паставілі па графіку. Выходзіць, апошнім давядзецца святло выключаць?!. Вядома, гэта жарт. Хоць пра святло яшчэ пагаворым.**

А калі сур'ёзна — канец свету будзе. Праўда, не абавязкова 21 снежня і для ўсіх адначасова (як жартуюць, індзейцы мая проста дашлюць нам новы кішэнны каменны каляндарык). Ён ужо даўно ў нечым надыходзіць: для асобных людзей, асобных краін. Ён адбываецца найперш у галовах і толькі пасля выліваецца ў рэчаіснасць...

Так званая паліткарэктнасць прыводзіць да таго, што, напрыклад, у адной замежнай краіне забаранілі бацькоў называць «маці» і «бацька». У іх жа сям'я можа быць і з двух мужчын, і з двух жанчын, калі хто не ведаў... Дык вось, каб нікога не пакрыўдзіць, там вырашылі: будуць «бацькі №1 і №2»... А, аднаполыя шлюбы, выходзіць, норма... Як па мне, дык гэта і ёсць самы сапраўдны канец свету. Ці забаранілі ў іншай краіне з моцнай мусульманскай дыяспарай казку пра трох парасят. Зноў жа — паліткарэктнасць. Дагэтуль нікога — казка ж! — не абражала, а тут на табе... Ці ў іншай краіне мусульманская частка таварыства ўласнікаў пастанавіла: няма чаго марнаваць паўтысячы еўра на ўстаноўку навагодняй ёлкі для гэтых... карэнных. А тое, што перад тым некалькі тысяч еўра з агульных грошай усіх жыльцоў пайшло на святкаванне іх рэлігійнага свята, дык гэта як?.. Канец свету ў маім разуменні, гэта калі за зацікаўлены погляд жанчына там можа падаць на цябе ў суд за сэксуальнае дамаганне.

...Памятаеце, як пасля выбуху ў метро павялі сябе беларусы? Як кідаліся на дапамогу пацярпелым і ў прамым, і ў пераносным сэнсе слоў: спачатку дапамагалі выносіць параненых на паверхню, а потым усім светам збіралі ім грошы. Мы адчулі сябе адзіным цэлым, згуртаваным агульнай бядой. А праз нейкі час, не выключана, тыя ж самыя людзі душыліся, кідаліся ў бойку ў чэргах па валюту, спрабуючы вырашыць свае маленькія ўласныя клопаты. І неяк рубам паўстала пытанне: гэта мы, тыя самыя — талерантныя?.. Калі пад коламі машыны літаральна ля ганка школы загінула дзіця, усе былі ўзрушаны гэтай трагедыяй. І неяк сарамліва прамаўчалі, што яшчэ ўчора лічылі цалкам прымальным самім «падкінуць» такім жа чынам уласнага сына ці дачку да навучальнай установы.

Мы аднадушныя ў тым, як не цэніць, «заціскае» па ўсіх «фран-

**Па мне, дык любы «канец свету» — гэта магчымасць пераасэнсаваць тую ці іншую сітуацыю. Зразумець, што галоўнае, а што — другаснае, не вартае ўвагі, сіл, нерваў.**

тах» нас кіраўніцтва, але як толькі самі трапляем у начальніцкае крэсла, чамусьці пачынаем з навядзення дысцыпліны. А талент арганізатара і здольнасці гаспадарніка, выходзіць, атрымліваем разам з партфелем кіраўніка. Чалавек з роўнага табе пераўтвараецца ў «раўнейшага». Мы хочам атрымліваць шмат грошай і мець такую працу, каб той працы было паменей. Галоўнымі становяцца не вопыт, стараннасць, адказнасць, а тарыфны разрад. І задавальненне ўласных амбіцый.

Мы ўсе вельмі любім малых дзетак, не прамінем пры выпадку выказаць імі сваё замілаванне. А месца ў транспарце цяжарнай жанчыне можам і не саступіць... Кажам, што старасць павінна быць прыгожай — як у замежных краінах. А самі раздражняемся на бурчанне пажылых людзей. Канец свету — гэта калі здаровы дарослы дзяцюк, замест таго, каб годна даглядаць маці, жорстка забівае чалавека, які падарыў яму жыццё, толькі за тое, што яму не далі грошай на чарговую бутэльку... Мы гаворым, што любім братоў нашых меншых, гатовы ўзяць дадому сабачку ці коціка. Адкуль тады процьма бадзяжных жывёл на вуліцах нашых гарадоў і вёсак?.. Нам хочацца ўзнёслых пачуццяў, але ў інтэрнэце мы перапісваемся прымітыўнымі сімваламі-смайлікамі, якія замяняюць усю неабсяжнасць эмоцый. Гатовыя гадзінамі «вісець» на тэлефоне, але не ў стане выслухаць чалавека, гледзячы яму ў вочы... На словах ганарымся сваім горадам, але не плацім за праезд у гарадскім транспарце... Любы, каго не спытай, выкажа абурэнне заторамі на дарогах: маўляў, нагу няма ўжо куды паставіць з-за гэтых машын. А потым спакойна ідзём на стаянку ці ў гараж заводзіць уласны аўтамабіль, каб даехаць — з асабістым камфортам! — да працы. Нам гарантаваны пэўныя правы, а мы часам бачым абыякавасць чыноўнікаў — служак народа.

Кожная такая сітуацыя і ёсць — канец свету. Любая з іх можа давесці нас да шаленства і справакаваць ланцужковую рэакцыю, як, напрыклад, стаянне ў тых жа заторах. Галоўнае, якія высновы мы можам зрабіць. Па мне, дык любы «канец свету» — гэта магчымасць пераасэнсаваць тую ці іншую сітуацыю. Зразумець, што галоўнае, а што — другаснае, не вартае ўвагі, сіл, нерваў. І тады ў нас сапраўды можа з'явіцца шанц пазбегнуць канца свету — глабальнага. Трэба толькі, каб асабісты «каляндар» кожнага з нас паасобку быў у парадку.

...Цяпер колькі слоў уласна пра канец святла. Маці ўвесь час просіць трымаць яе ў курсе: дык ці ўвядуць ліміты на электраэнергію ці не, якімі будуць нормы, з якой даты чакаць змяненняў? Яна пенсіянерка, але гатовая плаціць больш, абы толькі не эканоміць. Дарэчы, пра тое ж выказалася і большасць грамадзян, калі пытанне дастаткова шырока абмяркоўвалася з падачы энергетыкаў. Так, мы гатовыя да паступовага павышэння тарыфаў, але нормы спажывання ўводзіць не трэба, сказалі людзі. Чыноўнікі тут жа ўзнялі як сцяг фразу «гатовыя да павышэння тарыфаў», але і ад увядзення лімітаў... не адмовіліся. Цікава, праўда? Хоць дагэтуль ніхто так і не патлумачыў, як разлічваліся меркаваныя нормы на сям'ю. У маёй, напрыклад, вельмі эканомна ставяцца да ўсіх энергарэсурсаў — тое ж святло, у прыватнасці, у пакоях проста так не гарыць. І я вам скажу, што ўсё роўна ў прапанаваныя ліміты мы не ўпішамся. Наяўнасць пральнай машыны, халадзільніка, карыстанне мікрахвалевай печчу — гэта што, раскоша зараз? Мы не карыстаемся дома электрачайнікам, не мыем асобна адну кашулю ў пральнай машыне, з ранку да вечара — на працы. Дык як вылічваўся той ліміт і як, на чым нам зэканоміць? Жыць, як справядліва пытаюцца людзі, пры лучыне? Дык гэта ж не толькі канец святла, гэта больш нагадвае... Ну, вы самі здагадваецеся.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**



*«Сувеніры да прышэсця, сувеніры да прышэсця!»... Мужчына круціў у руках нейкія шары, якія пераліваліся агнямі, ззялі ўсімі колерамі вясёлкі, і казаў, вядома ж, пра надыход Новага года. Але гэтае яго адмысловае слоўца чамусьці выклікала толькі адну асацыяцыю — пра канец свету... Магчыма, таму, што, чым бліжэй да быццам бы прадказанай календаром індзейцаў мая даты заканчэння ўсяго існага, тым большы інфармацыйны ціск з гэтай нагоды мы адчуваем. Ад турагенцтваў, якія прапануюць сустрэць канец свету, напрыклад, у Мексіцы — як той казаў, на радзіме прадказальнікаў. Або ў бункеры Сталіна, каб яго перачакаць. Ці ад гандляроў — набыць спецыяльны набор да гэтага моманту, у які ўваходзяць пляшка гарэлкі, грэцкія крупы, шпроты, свечкі, нататнік, вяроўка, мыла... У нас прапаноўвалі, напрыклад, сертыфікат, які будзе сведчыць, што чалавек перажыў канец свету. Ці падарачны магніцік з такім жа надпісам. Прыкладаў можна прывесці безліч: чым бліжэй да 21 снежня, тым большая колькасць людзей — і простых, і публічных — жадаюць і спяшаюцца выказацца па азначаным пытанні.*

*Журналісты «Звязды» вырашылі не адставаць ад «трэнду» і скарыстацца момантам (ну, а калі сапраўды больш магчымасці не будзе?), каб пагаварыць на гэтую тэму. Думкі, як заўсёды, падзяліліся...*

# АПАКАЛІПСІС ЯК МАРКЕТЫНГАВЫ ХОД



*Ніхто не ведае, калі колькасць злосці і граху ў свеце дасягне такой крытычнай масы, што Бог не вытрывае...*

**УСЕ гавораць пра канец свету, але ніхто не ведае, што гэта такое і што трэба рабіць у выпадку, калі ты думаеш, што канец свету сапраўды прыйдзе 21 снежня 2012 года. Дакладней, усе якраз ведаюць, што рабіць. Дзякуючы агоніі ў сродках масавай інфармацыі, сацыяльных сетках і народным чуткам-плёткам. Калі меркаваць па ўсіх гэтых рэкамендацыях, то канец свету — гэта нешта надзвычайна забаўнае і вясёлае. Гэткі захапляльны экстрым, кшталту незвычайнага віду адпачынку. Або нават нейкай тэлевізійнай гульні ў стылі «Форт Баярд». Або перадачы «Выжыць любой цаной» па канале «National Geographic» з амерыканцам Бэрам Грылзам, які вучыць тэлегледачоў, як выжыць у самых экстрэмальных умовах у самых экзатычных кутках свету і ў самых пабытавых сітуацыях таксама. Даўно не сачу за яго «творчасцю», але не здзіўлюся, калі акажацца, што зараз па ТБ ідуць чарговыя серыі яго супер папулярнай перадачы, прысвечаныя акурат таму, як жа выжыць, калі канец свету і праўда надыдзе.**

Цікава толькі, як гэта — выжыць пасля канца свету? Па-мойму, канец — гэта значыць канец. Канчатковы і беспаваротны. Пра якое яшчэ выжыванне тут можа ісці гаворка?! Або вось паводле прадказання Далай-Ламы таксама цікава атрымліваецца. Маўляў, скончыцца энергія: пагасне святло ва ўсім свеце, адключыцца ўся электрычнасць, перастане працаваць любая тэхніка. Але гэта больш падобна на нейкую энергетычную катастрофу новага веку, чым на канец свету. Тым больш што нібыта ў сакавіку наступнага года ўсё павінна будзе цалкам аднавіцца. Вядома, гэта прывяло б да безлічы міні-катастроф, павышэння ўзроўню злачыннасці і г. д. Але ці канец гэта свету?..

Калі падсумаваць усе парады па выжыванні падчас канца свету, якія толькі можна знайсці ў сеціве і пачуць ад людзей, то атрымаецца прыблізна наступнае: запасіцеся кансервамі і пітной вадой; купіце сабе бункер дзе-небудзь у элітным раёне горада, калі няма грошай купіць, зрабіце самі (у інтэрнэце мноства інструкцый, як гэта зрабіць!); набудзьце дастаткова свечак, запалак і ліхтарыкаў і — наперад, выжываць падчас канца свету!

Выглядае неяк камічна, праўда? І трагічна адначасова. Калі тыя, хто хоча зарабіць грошы на чарговым канцы свету, робячы з яго маркетынгавую фішку, разлічваюць на нейкую выгаду, то я ўмываю рукі... У выпадку, вядома, калі яны сапраўды вераць у гэты канец свету. Бо калі вераць, то на якую трасцу ім тады чарговыя мільярды свабодна канверсаванай, калі ёю нават нельга будзе распарадзіцца пасля. Значыць — не вераць. А людзі вядуцца, жартуюць, купляюць сувеніры. Купляюць — тут галоўнае слова. Нармальная рэклама, нармальныя законы рынку. Можна нават перафразаваць славутае — калі абвяшчаюць чарговы канец свету, шукай, каму гэта выгадна.

Усе даюць парады, што рабіць, калі надыдзе канец свету. Але ніхто шырока, папулярна не гаворыць пра тое, што насамрэч варта было б зрабіць. Як у тым анекдоце. Правядзіце гэты дзень, як апошні дзень у вашым жыцці! Схавайцеся ў бункеры і ешце ежу для касманаўтаў. Але што б вы рабілі, калі б нейкі дзень быў сапраўды апошнім? Памятаю, як чытала інтэрв'ю з акцёрам Ксаўе Даланам, у якім ён сказаў, што апошні дзень свайго жыцця правёў бы ў ложку са сваёй жонкай. Дарэчы, яго жонка — Моніка Белучы.

**Купляюць — тут галоўнае слова. Нармальная рэклама, нармальныя законы рынку. Можна нават перафразаваць славутае — калі абвяшчаюць чарговы канец свету, шукай, каму гэта выгадна.**

А што яшчэ можна зрабіць? Папрасіць прабачэння ва ўсіх, каго пакрыўдзіў. Сказаць самыя галоўныя словы самым дарагім для вас людзям. Быць разам з гэтымі людзьмі. Гэтаму ж ніхто не вучыць. Усе вар'яцеюць, прадаюць бункеры і майкі з забаўнымі прынтамі (часам, трэба аддаць належнае, даволі іранічнымі) і раздаюць улёткі на цэнтральных плошчах сталіц свету з рэкамендацыямі, як уратавацца... Ніхто не прапагандуе канец свету як мерапрыемства, дзякуючы якому можна задумацца над сваім жыццём, прааналізаваць, што і дзеля чаго ты зрабіў, навошта ты жыў (і пакуль яшчэ жывеш) на гэтай зямлі і як ты ніколі больш жыць не будзеш, калі сапраўды ўратуешся...

Ёсць куды больш сур'ёзныя рэчы, чым істэрыя з нагоды канца свету. Насамрэч, апошнім часам мне сапраўды стала здавацца, што набліжаецца менавіта нейкі мой Асабісты Апакаліпсіс. Хоць я ніколі верыць не верыла ва ўсе гэтыя прадказанні. А тут мне стала здавацца, што ўсе факты Канца навідавоку. Для мяне асабіста. У дадатак, паддаўшыся ўсеагульнаму трэшу, у мяне сталі з'яўляцца прыкметы параноі, я пачала перабольшваць супадзенні. Напрыклад, адзначала, што бачу абвесткі пра згубленых катоў з падазронай рэгулярнасцю. Мне стала здавацца, што гэта знакі. Маўляў, нават каты і тыя некуды ўцякаюць ад ГЭТАГА ЎСЯГО. Я старалася ўзяць сябе ў рукі. Супакойвала. Прыпісвала ўсё высакоснаму году (яшчэ адна назойлівая ідэя чалавецтва, а-ха-ха-ха!). Пакуль адзін цудоўны чалавек не параіў мне пачытаць Біблію. Як мінімум Евангелле ад Мацвея. Як максімум Адкрыццё (Апакаліпсіс) Іаана Багаслова.

Я дастала з кніжнай паліцы Біблію ў перакладзе Васіля Сёмухі, некалі купленую ў псіха-лінгвістычным прыпадку. Бо ў прынцыпе, я ніколі не была набожным чалавекам, але мяне заўжды цягнула ў бок літаратурна-перакладчыцкі. Я стала чытаць Кнігу Кніг. Без усялякага пафасу скажу, што гэтае чытво супакойвае. Наогул супакойвае, а не толькі адносна канца свету. Чалавек настолькі слабы і нікчэмны, што яму не дадзена ведаць, што будзе не тое, што 21.12.2012, а нават тое што будзе заўтра. Усё гэта ведае толькі Бог. А канец свету, Апакаліпсіс, паводле Бібліі, — гэта Другое прышэсце Хрыста, якое, вядома, будзе суправаджацца рознымі катаклізмамі і цудамі. Але гэта не Канец, гэта Пачатак новага жыцця — без злосці і зайздрасці, без граху і распусты; без крывадушша і двудушнасці; у дабрыні і гармоніі. Баяцца гэтага біблейскага канца свету варта толькі тым, хто не пакаецца ў грахах сваіх... Метафарычна я разумею гэта як прафілактыку Бога супраць грэшнікаў, для ачышчэння свету ад нізкіх і двухаблічных людзей. Відаць, шмат сярод нас грэшнікаў. Але ніхто не ведае, калі іх колькасць дасягне такой крытычнай масы, што Бог не вытрывае...

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ**

■ Інфарм-укол

# НЕ РЫЗЫКУЕЦЕ СПІЦЦА?

**Алкагалізм — хранічнае захворванне, сістэматычнае ўжыванне спіртных напояў і ўстойлівая залежнасць ад іх. Алкаголікамі, вядома, не нараджаюцца. Гэтаму спрыяюць розныя фактары, кажа валеолаг 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Алена ГАРНІЦКАЯ.**

**Біялагічны.** У спадчыну перадаецца біялагічная схільнасць, на аснове якой можа развіцца хваравітая залежнасць. Лічыцца, што недзе каля 60 працэнтаў залежных ад розных псіхаактыўных рэчываў (алкаголю, наркотыкаў і г.д.) маюць блізкіх сваякоў, якія пакутавалі ад падобнай залежнасці.

**Сацыяльны.** Праблемы, звязаныя з алкаголем, цесна звязаны са звычаямі і ўяўленнем грамадства аб алкаголі, з сітуацыяй у сям'і, здольнай як павялічваць, так і змяншаць рызыку ўзнікнення залежнасці. Важную ролю адыгрываюць сацыяльная нестабільнасць, беспрацоўе, жыццёвыя стрэсы, духоўны і культурны «вакуум» і г.д.

**Псіхалагічны.** Гэта пэўны склад асобы (бездухоўнасць, адсутнасць сур'ёзных інтарэсаў і мэт у жыцці, павышаная ўнушальнасць). Паталагічныя рысы характару (схільнасць да хістанняў настрою, цяжкасці ва ўстанаўленні кантактаў, сарамлівасць, нізкая або завышаная самаацэнка, няўменне спраўляцца са сваімі пачуццямі і г.д.). Астэнія (фізічная і нервова-псіхічная слабасць арганізма). Істэрычныя расстройствы.

**Духоўны.** Стаўленне чалавека да самога сябе, іншых людзей, наваколля, што абумоўлівае якасць удзелу ў жыцці.

## Абарончага рвотнага рэфлексу... няма

**Прыкмета першая.** Наяўнасць паталагічнага жадання выпіць, жадання выпіваць у пэўным рэжыме. Імкненне абавязкова задаволіць гэтае жаданне. Здаровы чалавек з лёгкасцю адмаўляецца ад рэалізацыі такога жадання, калі абставіны патрабуюць гэтага. Хворы не можа адмовіцца ад выпіўкі пры любых абставінах, а калі не можа рэалізаваць гэта жаданне, то перажывае раздражненне, злосць і дэпрэсію.

**Прыкмета другая.** Рост талерантнасці да алкаголю, здольнасці перанесці тую ці іншую дозу. Здаровыя людзі звычайна здавальняюцца ўжываннем 100-150 мл моцнага алкаголю (за вечар), а падчас передазіроўкі перажываюць млоснасць і рвоту. Бо арганізм імкнецца вызваліцца ад атруты. Гэтая нармальная рэакцыя на алкаголь носіць назву «абарончы рвотны рэфлекс». Хворыя на алкагалізм здольныя ўжываць надта большыя дазіроўкі без абарончых рэфлексаў. Дазіроўка 400-500 мл гарэлкі за вечар павінна насцярожваць як навакольных, так і самога спажыўца алкаголю.

**Прыкмета трэцяя.** Страта кантролю над дозай. Здаровы чалавек у працэсе ўжывання адчувае пачуццё насычэння. Ён выпівае бутэльку піва ці келіх сухога віна і працягваць выпіўку жадання няма. Хворы на алкагалізм выпівае нейкую ключавую дозу (звычайна яна складае 100-150 мл гарэлкі), і ў яго развіваецца непераадольнае жаданне працягваць выпіўку далей. Кантроль над дозай страчаны, а ў выпадку працягу п'янства праз некалькі гадоў любая доза будзе выклікаць цяжкі запой. Пасля нейкага перыяду цвярозасці хворы пад уплывам пярвічнага паталагічнага жадання да алкаголю выпівае некаторую дозу спіртнога, страчвае кантроль над ужываннем, моцна напіваецца, раніцай адчувае сябе дрэнна (пахмельны, або абстынентны, сіндром), пахмяляецца, але зноў не кантралюе дозу, зноў моцна напіваецца. Цяжкі алкагольны эксцэс можа доўжыцца ад 2-3 дзён да некалькіх месяцаў.

**У біялагічным сэнсе алкагалізм з'яўляецца невылечным захворваннем. Гэта азначае, што не існуе ніякага медыцынскага сродку, які вярнуў бы хвораму здольнасць кантраляваць ужыванне алкаголю.** Хворы ў такім выпадку «асуджаны» або на далейшае пагаршэнне здароўя і сацыяльнага статусу, або на поўную цвярозасць.

**Лячэнне хворага на алкагалізм не падобнае на лячэнне хворага на пнеўманію і заключаецца ў тым, каб чалавек навучыўся жыць, наогул не ўжываючы алкаголь.**

Лячэнне хворага на алкагалізм не падобнае на лячэнне хворага на пнеўманію і заключаецца ў тым, каб чалавек навучыўся жыць, наогул не ўжываючы алкаголь.

Для паўнацэннага лячэння выкарыстоўваюцца лекавая тэрапія, псіхатэрапія, сацыяльная рэабілітацыя.

Лячэнне пачынаецца са спынення п'янства («купіраванне запою») і лячэння абстынентнага сіндрому. Такую дапамогу жыхары Мінска могуць атрымаць у Мінскім гарадскім наркалагічным дыспансэры.

Калі лячэнне ўскладняецца сутаргавым сіндромам або псіхозам, яно праводзіцца ў Рэспубліканскай клінічнай псіхіятрычнай бальніцы.

Спыненне ўжывання алкаголю з'яўляецца хоць і абавязковай, але не галоўнай мэтай лячэння. Усе хворыя пад уплывам жыццёвых абставін перыядычна «кідаюць піць» і нейкі час вядуць цвярозы лад жыцця. Праблема хворага не ў спыненні п'янства (хоць многія перажываюць гэтае спыненне хваравіта). Праблема хворага і мэта лячэння — у захоўванні і падтрымліванні цвярозасці, прычым такой, каб хворы не адчуваў сябе непаўнацэнным. Цвярозасць павінна мець якасную прывабнасць.

Пасля спынення ўжывання алкаголю ў дапамогу хвораму на алкагалізм павінны ўключацца псіхатэрапеўты, псіхолагі, а таксама спецыяльна падрыхтаваныя параспецыялісты — хворыя на алкагалізм з працяглым вопытам цвярозасці.

Абавязкова праводзіцца работа са сваякамі хворага, яго сям'ёй.

## Як прадухіліць алкагалізм?

З аднаго боку, гэта дасягаецца з дапамогай кантролю за вытворчасцю і ўжываннем алкаголю на розных стадыях — дзяржаўнай, макра- і мікрасацыяльнай, сямейнай, індывідуальнай. З другога боку — гэта ранняе выяўленне асоб, якія злоўжываюць алкаголем, і аказанне ім адпаведнай медыка-псіхалагічнай дапамогі. Выяўленне на самых ранніх этапах у падлеткавым і нават дзіцячым узросце схільных да алкаголю людзей. Можна арыентавацца пры гэтым на спадчыннасць і асаблівасці ўжывання алкаголю ў бацькоўскай сям'і.

Калі ў вашай сям'і ёсць праблема падобнага кшталту, шукайце дапамогі ў спецыялістаў.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

# АСТРАВЕЦКАЯ АЭС У ПОСТФУКУСІМСКІ ПЕРЫЯД



**Бяспечнаму развіццю атамнай энергетыкі ў постфукусімскі перыяд быў прысвечаны экспертны «круглы стол», які адбыўся ў Мінску на мінулым тыдні. Адной з важных мэт семінара з'яўлялася дэміфалагізацыя атамнай энергетыкі з улікам насцярожанага, а часам зусім негатыўнага стаўлення грамадства да гэтай сферы пасля аварыі на Фукусіме. Для Беларусі, якая сур'ёзна пацярпела ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, а цяпер збіраецца будаваць у Астраўцы сваю АЭС (БелАЭС), пытанні бяспечнага выкарыстання і развіцця атамнай энергетыкі з'яўляюцца звышактуальнымі.**

Першы міф, які быў развеяны на экспертным «круглым стале», датычыўся перспектыў развіцця атамнай энергетыкі ў свеце. Як ні дзіўна, але аварыя на Фукусіме не аказала істотнага ўплыву на планы яе развіцця, нягледзячы на ўжо традыцыйныя заявы аб згортванні праграм развіцця атамнай энергетыкі з боку палітыкаў усяго свету. Сёння ў свеце сумарная магутнасць атамных рэактараў складае 363 ГВт. Згодна з прагнозным сцэнарыем Расатама і МАГАТЭ да аварыі на АЭС Фукусіма, у 2030 годзе сумарная магутнасць рэактараў у свеце павінна была складаць 652 ГВт. Але пасля Фукусімы гэты прагнозны сцэнарый быў падкарэктаваны ў бок 588 ГВт у 2030 годзе. Пры гэтым адзіны рэгіён, дзе прагназуецца істотнае зніжэнне вызначанай магутнасці — гэта Японія.

**Як ні дзіўна, але аварыя на Фукусіме не аказала істотнага ўплыву на планы яе развіцця, нягледзячы на ўжо традыцыйныя заявы аб згортванні праграм развіцця атамнай энергетыкі з боку палітыкаў усяго свету.**

Значная частка часу была прысвечана аналізу падзей, якія адбыліся падчас аварыі на АЭС Фукусіма. Пасля японскай трагедыі ў сакавіку 2011 года ва ўсім свеце былі праведзены комплексныя праграмы стрэс-тэстаў, гэта значыць, аналіз бяспекі атамных аб'ектаў на спалучэнне тых фактараў, якія прывялі да аварыі на Фукусіме. Выбухі на энергаблоках адбыліся па прычыне спалучэння двух найважнейшых знешніх фактараў: поўная страта электразабеспячэння, на якую наклалася страта канцавога цеплапаглынальніка. Канцавым цеплапаглынальнікам на АЭС Фукусіма было мора. Сістэма, якая адводзіла рэшткавае цяпло ад актыўнай зоны рэактара ў мора, была пашкоджана з-за землятрусу. У выніку здольнасць аддаваць рэшткавае

**Трэба асабліва адзначыць, што пры праектаванні БелАЭС пад Астраўцом найважнейшыя «ўрокі Фукусімы» былі ўлічаны. Цікава, што яны былі запраектаваны яшчэ да аварыі.**

цяпло канцавому цеплапаглынальніку была страчана. У гэтай сітуацыі адбыўся перагрэў паліва ў актыўнай зоне рэактара і басейне з адпрацаваным палівам, і яно расплавілася. Радыеактыўныя рэчывы выйшлі з-пад абалонкі цеплавыдзяляючых элементаў, потым выйшлі на прастору ўнутры АЭС. Запусцілася пара-цырконіевая рэакцыя з вылучэннем вадароду, які пачаў назапашвацца пад купалам будынка АЭС, і ўсё гэта выбухнула, радыеактыўныя рэчывы трапілі ў навакольнае асяроддзе. Адбылося тое, што ва ўсіх сучасных праектах не павінна адбывацца. Галоўны прынцып праектавання сучасных АЭС заключаецца ў тым, каб пры самай складанай аварыі радыеактыўны выкід у навакольнае асяроддзе быў выключаны. Галоўны прынцып праектавання АЭС трэцяга пакалення — нават пры самай цяжкай аварыі такія станцыі не забруджваюць навакольнае асяроддзе.

Найважнейшых урокаў, пададзеных аварыяй на Фукусіме, тры.

**Першы.** Фундаментальныя функцыі бяспекі павінны забяспечвацца нават у выпадку адключэння электраэнергіі і/або страты магчымасці выкарыстоўваць канцавы цеплапаглынальнік.

**Другі.** Актыўныя і пасіўныя сістэмы, якія забяспечваюць фундаментальныя функцыі бяспекі (кантраляванне радыеактыўнасці, адвод рэшткавага цяпла ў канцавы цеплапаглынальнік, лакалізацыя радыеактыўных матэрыялаў), павінны быць таксама абаронены ад усіх магчымых пагроз — натуральных і тэхнагенных.

**Трэці.** Змесціва рэактара павінна быць абаронена такім чынам, каб прадухіліць вялікія радыеактыўныя ўцечкі нават пасля расплаўлення актыўнай зоны.

Трэба асабліва адзначыць, што пры праектаванні БелАЭС пад Астраўцом, гэтыя найважнейшыя «ўрокі Фукусімы» былі ўлічаны. Цікава, што яны былі запраектаваны яшчэ да аварыі на Фукусіме. Звычайна Расатам чуў у свой бок шмат крытыкі за перагрузку сваіх праектаў АЭС сістэмамі бяспекі, асабліва пасіўнымі. Але пасля аварыі на Фукусіме такая перагрузка стала галоўнай канкурэнтнай перавагай на сусветным рынку атамных тэхналогій.

Іншай канкурэнтнай перавагай расійскіх праектаў АЭС з'яўляецца канцэпцыя адказнага пастаўшчыка, з якой пасля падзей на Фукусіме пагадзіўся ўвесь свет і, у прыватнасці, МАГАТЭ, як з адзіным бяспечным спосабам развіцця атамнай энергетыкі.

Адказны пастаўшчык не мае права пастаўляць толькі тэхналагічнае рашэнне. Адказны пастаўшчык атамных тэхналогій павінен дапамагчы стварыць сістэму падрыхтоўкі кадраў для АЭС, стварыць буйны рэгулятар — назіральны орган, які будзе кантраляваць усе этапы праектавання, будоўлі і функцыянавання АЭС, стварыць эфектыўнае прававое поле ў галіне атамнай энергетыкі, атрымліваць тэхналогіі, каб АЭС з пункту гледжання абслугоўвання і далейшай мадэрнізацыі была незалежнай ад знешняга пастаўшчыка, стварыць рабочыя месцы і ўмовы для развіцця прамысловасці пад праект пабудовы АЭС.

**Галоўны прынцып праектавання АЭС трэцяга пакалення — нават пры самай складанай аварыі такія станцыі не забруджваюць навакольнае асяроддзе.**

Такім чынам, калі не будзе ніякіх сюрпрызаў, пад Астраўцом ужо ў 2018 годзе ўзнікне сучасная БелАЭС (праект тыпу АЭС-2006, тып рэактара ВВЭР-1200/491, пакаленне III+, магутнасць 2,4 ГВт., галоўны падрадчык — расійская кампанія «Атамбудэкспарт», якая будзе адпавядаць найноўшым патрабаванням у сферы бяспекі і дасць імпульс для развіцця ў Беларусі новай галіны прамысловасці і навукі — ядзернай энергетыкі. Трэба памятаць, што традыцыі ядзернай энергетыкі ў Беларусі існуюць з савецкіх часоў. Яшчэ ў 1960-х гадах беларускія навукоўцы прадставілі свой праект легендарнай мабільнай АЭС «Памір-630Д» (на аўтамабільным шасі). У 1973 годзе ў Інстытуце ядзернай энергетыкі АН БССР было створана спецыяльнае канструктарскае бюро з доследнай вытворчасцю, якое пачало канструяванне і стэндавыя выпрабаванні вузлоў будучага рэактара. Генеральным канструктарам і галоўным ідэйным натхняльнікам праекта стаў Васіль Несцярэнка, член-карэспандэнт беларускай Нацыянальнай акадэміі навук. Але пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС праект паступова быў замарожаны і ў

**Сцэнар, згодна з якім, акрамя БелАЭС і Балтыйскай АЭС, у рэгіёне з'явяцца яшчэ АЭС у Польшчы і Літве, прадугледжвае гіперканцэнтрацыю электраэнергіі ў рэгіёне, што будзе адлюстроўвацца на яе кошце. Тады нізкі кошт электраэнергіі стане галоўнай эканамічнай канкурэнтнай перавагай рэгіёна.**

лютым 1988 года згодна з рашэннем Саўміна СССР і АН БССР зусім спыніў сваё існаванне.

Трэба таксама адзначыць, што сваім рашэннем пабудаваць на сваёй тэрыторыі АЭС Беларусь не выбіваецца з рэгіянальнага кантэксту. У бліжэйшыя гады Калінінградская вобласць, Польшча, Украіна і Літва плануюць абзавесціся новымі ўласнымі АЭС. Калі лёс АЭС у Літве і Польшчы яшчэ дакладна не вызначаны, то Балтыйская АЭС у Калінінградскай вобласці пачне функцыянаваць ужо ў 2016 годзе.

Гэта значыць, што ўжо зараз трэба задумвацца аб тым, як выкарыстоўваць электраэнергію, якая будзе выпрацоўвацца на БелАЭС. Ужо зараз можна прадбачыць канкурэнцыю паміж Балтыйскай і БелАЭС за рынкі збыту электраэнергіі ў Прыбалтыцы і Польшчы, калі планы пабудовы АЭС у Літве і Польшчы застануцца толькі планамі. З іншага боку, стварэнне агульнай для абедзвюх АЭС кіраўнічай кампаніі па збыце электраэнергіі з роўнымі долямі дазволіла б пазбегнуць гэтай канкурэнцыі.

Сцэнар, згодна з якім, акрамя БелАЭС і Балтыйскай АЭС у рэгіёне з'явяцца яшчэ АЭС у Польшчы і Літве, прадугледжвае гіперканцэнтрацыю электраэнергіі ў рэгіёне, што будзе адлюстроўвацца на яе кошце. Тады нізкі кошт электраэнергіі стане галоўнай эканамічнай канкурэнтнай перавагай рэгіёна.

Але незалежна ад пэўнага сцэнара развіцця ядзернай энергетыкі ў рэгіёне ў цэнтры парадку дня Беларусі павінна стаяць пытанне аб стварэнні сістэмы спажывання электраэнергіі — фарміраванні прамысловых кластараў вакол БелАЭС. Безумоўным прыярытэтам навуковых пошукаў павінна стаць стварэнне сумесна з замежнымі калегамі замкнёнага ядзернага паліўнага цыкла і яго прамысловае прымяненне, а таксама распрацоўка асобных тэхналогій прамысловага выкарыстання адпрацаванага паліва і ядзерных адходаў сваіх і замежных АЭС. У гэтым выпадку ядзерная энергетыка стане важным механізмам развіцця краіны.

**Арсеній СІВІЦКІ, палітычны аналітык.**

■ Гонар твой, Беларусь

Валянціна НАВІЦКАЯ:

# «Алег самастойным стаў у вышэйшым ваенным вучылішчы...»

## Інтэрв'ю з маці трэцяга беларускага касманаўта

**Кожнае дзіця, дзяўчынка і дзяўчына, хлопчык, падлетак, юнак у пэўны перыяд свайго жыцця падыходзіць да той нябачнай мяжы, за якой пачынаецца дарослaсць, сталенне. Калі трэба самому адказваць за ўласныя ўчынкі, прымаць рашэнні, будаваць жыццё. У многіх гэты складаны перыяд прыпадае на час заканчэння школы і пачатак студэнцтва. Недарэмна па традыцыі выпускнікі ўстаноў адукацыі вітаюць пасля школьнага балю менавіта першы дарослы світанак. І столькі мар і спадзяванняў звязана з гэтым дзействам... Якуюсьці магічную сілу мае і ўрачысты рытуал пасвячэння першакурснікаў у студэнты. Што ўжо казаць пра адарванасць-аддаленасць ад бацькоўскай хаты і неабходнасць самому дбаць у літаральным сэнсе пра хлеб свой штодзённы. А калі, па меркаваннях і назіраннях бацькоў, адчуў сябе дарослым наш касманаўт Алег Навіцкі? Цікаўлюся пра гэта ў яго мамы.**

**— Валянціна Эдуардаўна, а ці ўзнікала ў вашай сям'і пытанне, колькі класаў будзе заканчваць Алег — восем ці дзесяць?**

— Па шчырасці, ніколі і размовы такой не было. Усе разумелі, што яму толькі дома трэба атрымліваць сярэднюю адукацыю, а затым паступаць. Калі не атрымаецца ў вышэйшую навучальную ўстанову (тады ж конкурсы былі вялікія), дык у сярэднеспецыяльную. Але так лёс склаўся, што Алег па ўсіх параметрах падыходзіў для вучобы ў вышэйшым ваенным вучылішчы. Калі трэба

**Але ў якім бы вучылішчы Алег ні быў, усюды да яго як да беларуса было вельмі добрае стаўленне. І звалі пяшчотна — «бульбашонкам»!**

было ў старшых класах станавіцца на ўлік у райваенкамат і атрымліваць прыпіснoе пасведчанне, сын прайшоў раённую медкамісію. Абласную праходзіў у Мінску, сам паехаў. І толькі калі вярнуўся, сказаў: «Я годны для паступлення ў вышэйшае ваеннае вучылішча». Мы з мужам адказалі: «Ну, добра. Хочацца паступаць — едзь». І так атрымалася, што 23-га чэрвеня ў сына быў апошні выпускны экзамен, а дакументы ў Барысаглебскае вышэйшае ваеннае авіяцыйнае вучылішча прымалі 24-га толькі да 12.00. Ды яшчэ і выклік затрымаўся чамусьці.

І вось сеў Алег з татам у машыну — і паехалі. Дакументы падалі дзесьці ў 11.45. І ўсё, сын там застаўся. Тату толькі дазволілі падысці да КПП. Алег выйшаў, памахаў яму рукой... І колькі мой муж ехаў дахаты, столькі... плакаў. Маўляў, як гэта так — маё дзіця забралі і мне нічога не сказалі, не спыталіся!

**— Атрымліваецца, лёс вырашылі літаральна 15 хвілін...**

— Так. Вядома, тату цяжка было ехаць. Гэта ж вельмі далёка, за Варонеж яшчэ. Але паколькі ён вадзіцель-прафесіянал, дык усё і атрымалася.

**— А машына якая тады была ў вашай сям'і?**

— Ды простая — «жыгулі».

**— І Алег яе асвоіў?**

— Вядома. У яго добра атрымлівалася вадзіць машыну. Ужо калі малодшы брат Дзіма ўзняўся трохі, яны беглі да дзіцячай бібліятэкі, якая знаходзіцца на скрыжаванні нашай вуліцы з іншай, каб па чарзе, не ваяваўшы (сёння — Алег за рулём, заўтра — Дзіма), тату сустрэць і пад'ехаць. Іх, бывала, дахаты не загоніш, пакуль яны тату ні сустрэнуць! Навыперадкі беглі. А мужу вельмі хацелася і дачку Марыну навучыць вадзіць машыну. Толькі ў яе не было такога жадання...

**— Вы згадвалі, што Алег на першым-трэцім курсах часта дасылаў дахаты лісты...**

— Так. Першы курс — увогуле часта. Памятаю, як расказаў пра такую традыцыю. Калі першы вылет, курсанты павінны былі падараваць інструктару па пачку цыгарэт. Думаю: «Ну, усё! І мой сынок, мусіць, закурыць — за кампанію...» Але, мабыць, толькі з тыдзень папыхцелі па-хлапечы — і ўсё. Тата, вядома ж, курыў, але дужа пераконваў хлопцаў, каб яны хаця б не ўзяліся. Ён быў самакрытычны, казаў ім: «Я прывык да такой ступені, што адвыкнуць цяпер вельмі складана. Таму на сваім негатыве я вас і вучу...» Так што ні Алег, ні Дзіма не кураць.

Дарэчы, падчас вучобы ў ваенным вучылішчы Алег пунктуальным у стасунках быў заўсёды. Калі не напісаў, значыць, абавязкова патэлефануе. І я была ў курсе ўсіх яго спраў. Лёс пакідаў яго па вучылішчах. Паступаў у Барысаглебскае. А як Савецкі Саюз разваліўся, у Расіі пачаліся скарачэнні. Скарацілі Барысаглебскае вучылішча — Алег трапіў у Ейскае. А выпускаўся ўжо з Качынскага, дзе далі размеркаванне... у Барысаглебск! Але ў якім бы вучылішчы Алег ні быў, усюды да яго як да беларуса было вельмі добрае стаўленне. І звалі пяшчотна — «бульбашонкам» *(смяёмся)*! Да нас дахаты прыязджалі яго сябры — з Расіі, Украіны, з Далёкага Усходу... Раскідаў былых аднакурснікаў лёс па розных пунктах, але яны ўсё роўна сувязі падтрымліваюць. Такое моцнае сяброўства.

**— Валянціна Эдуардаўна, а як часта падчас вучобы ў Расіі Алег меў магчымасць прыязджаць дахаты?**

— Толькі два разы на год: на зімовыя і летнія канікулы.

**— І якія змены вы заўважылі ў сыне падчас першага прыезду?**

— Зазначу напачатку, што я ўвогуле хвалявалася, як ён прыедзе. Дзеці ж нашы дагэтуль па адным нікуды не ездзілі, а толькі ўсе разам, сям'ёй. У цырк іх вазілі, у лялечны тэатр... Даслалі мы Алегу грашовы перавод, а ён прыйшоў пазнавата, не паспеў



сын атрымаць грошы. Але яму дапамаглі і саслужыўцы, і проста знаёмыя. Так ён нечакана з'явіўся на парозе. І, як заўсёды, усмешка на ўсе 32 зубы: «Я ўжо дома!» І пачаў расказваць...

Узмужнеў, зразумела. А ўвогуле, узмужнелым мы яго бачылі, калі ездзілі на прысягу. Вельмі пахудзеў — у параўнанні з тым, якім паехаў з дому. Стромкі стаў, як кіпарыс *(смяёмся)*...

**Паехалі мы да Алега на выпуск у Моніна. І я там літаральна была ў шоку! Бо ў той вечар, дзе б мы ні шлі, усюды гучалі беларускія песні.**

**— А што вам запомнілася з таго ўрачыстага мерапрыемства?**

— Як мы Алега знайсці не маглі *(смяецца)*. Прыехалі, а там усе стаяць «каробачкамі». Я прайшла міма, паўглядалася — нідзе сваё дзіця не бачу! Гляджу, муж за мной ідзе — і таксама пацiскае плячыма. Алег жа стаіць, за намі назірае і ўсміхаецца. Усе ж стаяць па струнцы, з аўтаматамі. А пасля ён цішком руку падняў і памахаў, тут ужо бацька яго і ўбачыў. Дазволілі нам падысці з «тылу». Алег вышэйшы за мяне ростам. Я стала за ім і так усё мерапрыемства за руку і пратрымала, пакуль ім ні сказалі, што яны вольныя. Тады пайшлі ўсе разам у гасцініцу. Радасці колькі было — сына ўбачыць і паразмаўляць!

А тады курсанты сваімі сіламі рыхтавалі канцэрт. І вось стаяць іх чатыры рады, Алег — у самым апошнім. І так стараецца, спявае! Хоць у школе ён не дужа гэта любіў. А тут, калі я ўбачыла і пачула такое, дык расчулілася і расплакалася. Побач са мной сядзела жанчына, якая таксама прыехала да сына, але — трэцякурсніка. Яна мне сказала тады: «Вы плачце — не плачце, а ўсё роўна барысаглебскія дзяўчаты ім заваладаюць». І як прыгаварыла *(усміхаецца)*...

**— Валянціна Эдуардаўна, а калі вы адчулі, што сын ужо сапраўды дарослы? Вось дарослы — і ўсё!?**

— Ну, калі ён пачаў мне адказваць: «Мама, супакойся! *(смяецца)* Я ўсё вырашу сам...» І гэта ўжо з другога курса. Штаны нават маме не дазваляў прасаваць, хоць я як швачка раблю гэта прафесійна. Але сам дык сам...

**— А памятаеце, як падчас выпуску Алега там спявалі беларускія песні? Ён неяк мне расказваў...**

— Сапраўды, было такое. Паехалі мы да Алега на выпуск у Моніна, калі ён закончыў ваенную акадэмію. І я там літаральна была ў шоку! Бо ў той вечар, дзе б мы ні шлі, усюды гучалі беларускія песні. І на вечары іх спявалі. Я слоў усіх не ведаю, а яны: «Мама, падпявайце!» Я сядзела і радавалася, што да Алега, да нас такая павага там...

**— Значыць, Алег на самой справе ніколі не забываўся, што ён — беларус...**

— Вядома! Нават калі і жартам гаворыць. Вось Юля, жонка, спыталася ў яго падчас сеанса сувязі з МКС: «Ты па якім часе там жывеш?» І ён адказаў: «Вядома, па беларускім!»

**— Валянціна Эдуардаўна, а калі і як вы даведаліся, што падчас службы Алег трапіў у Чачню?**

— Ды пасля таго ўжо, як усё закончылася! Прыехаў ён у адпачынак і так, выпадкова сказаў,

**Вось Юля, жонка, спыталася ў яго падчас сеанса сувязі з МКС: «Ты па якім часе там жывеш?» І ён адказаў: «Вядома, па беларускім!»**

між іншым... Але з татам, я так разумею, на гэтую тэму яны размаўлялі, і шмат. Вечарамі праседжвалі на лаўцы ўдвух... І было відаць, што ўсе размовы — на эмоцыях. А калі падыду: «Ну, а мне што раскажаце?», сын адказваў: «Тое, што табе, мама, трэба ведаць, ты ведаеш...»

**— І якой была ваша рэакцыя, калі вы пачулі, што ён там быў?**

— Мне зрабілася вельмі страшна...

**— А калі даведаліся, што ён сабраўся ў атрад касманаўтаў?**

— Я адразу, вядома, несур'ёзна гэта ўспрыняла, бо напярэдадні была размова, каб ён паступаў у акадэмію імя Ю. Гагарына. Кажу: «Сынок, можа, даслужышся да генерала...» А ён: «Мама, у генералаў свае сыны ёсць. Ну, а мы — простыя людзі. Нам і такіх званняў дастаткова». Пасля мы яшчэ доўга і часта вялі размовы пра паступленне. А потым патэлефанавала нявестка і сказала, што Алег вырашыў-такі паступаць у акадэмію. Падаў дакументы, здаў іспыты. Потым паведаміў, што залічаны. А пра атрад касманаўтаў сказаў перад самым заканчэннем вучобы: «Можа, паспрабаваць?» І гэта было яго рашэнне. Адбор там вельмі строгі, з такой колькасці добраахвотных... Але ж Алег настойлівы вельмі. Памятаю, яшчэ ў школе вучыўся і надумаўся паступаць у лётнае вучылішча. І тут высвятляецца, што яму не хапае... двух сантыметраў да росту! Дык ён паміж электрычнымі апорамі прыладзіў турнік і вісеў на ім, выцягваўся. І атрымалася! Упарты быў хлопец... Спортам займаўся сістэматычна, ніколі яго не кідаў... Калі ж Алега прызначылі камандзірам экіпажу, тады і мы адчулі ўсю сур'ёзнасць таго, што адбываецца...

Гэтак жа, як, дарэчы, і я — падчас аднаго інтэрв'ю з Алегам у Чэрвені. Памятаю, напісала тады на заканчэнне, што спадзяюся прычакаць таго моманту, калі пра майго аднакласніка паведамяць у «Навінах» — зразумела, з якой нагоды. І ўсё ж, прызнаюся, тады гэта здавалася... крышачку нерэальным. Ды, па шчырасці, і цяпер часам здаецца. Таму і мару пра нашу сустрэчу налета з самым сапраўдным касманаўтам, гонарам Чэрвеншчыны і ўсёй Беларусі — Алегам Навіцкім!

**Гутарыла Святлана АДАМОВІЧ.**
**Фота з сямейнага альбома Валянціны НАВІЦКАЙ**

**Працяг. Пачатак у нумарах за 5 і 12 снежня.**

Уладзімір ВАСІЛЬЕЎ:

# «Калі чалавек памірае, у яго адразу становіцца шмат «сяброў»!»



**Уладзімір Віктаравіч Васільеў, народны артыст СССР, прафесар Расійскай акадэміі тэатральнага мастацтва, ганаровы прафесар Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ламаносава, балетмайстар, харэограф, тэатральны рэжысёр, акцёр, педагог, уладальнік прэміі імя Ніжынскага Парыжскай Акадэміі Танца «Лепшы танцоўшчык свету» і «носьбіт» іншых званняў і рэгалій, быў старшынёй журы сёлетняга конкурсу віцебскага юбілейнага XXV Міжнароднага фестывалю сучаснай харэаграфіі (IFMC). Гэты фестываль стаў першым і аж да 1997 года заставаўся адзіным форумам сучаснага танца на тэрыторыі былога СССР.**

Таму і не дзіўна, што сам Уладзімір Васільеў пагадзіўся ўзначаліць журы толькі на першы погляд «правінцыйнага конкурсу», аб якім ведаюць далёка за межамі нашай краіны. Нават не верыцца, калі размаўляеш з гэтым легендарным артыстам, што яму — энергічнаму, імпульсіўнаму, іранічнаму чалавеку — пайшоў ужо восьмы дзясятак (нарадзіўся 18 красавіка 1940 года ў Маскве — **Аўт.**).

**— Спачатку аб віцебскім фестывалі. Якімі крытэрыямі вы карысталіся пры ацэнцы творчых работ канкурсантаў?**

— Крытэрыі — само жыццё! Адкуль гэтыя крытэрыі бяруцца? Адзіны крытэрый — параўнальны аналіз. Чым больш ведаеш, тым больш высокую планку ставіш, ацэньваючы выступленні. Бывае, адкрываеш для сябе раней тое, што не бачыў: «У, гэта фантастычна!!! Як гэта здорава!» А потым бачыш другі, трэці калектыў... І думаеш: «Бадай, першы быў не вельмі». Тэхніка павінна быць, як і артыстызм. Без апошняга наогул не разумею мастацтва. У цэлым магу сказаць пра віцебскі конкурс так: ён вельмі высокага ўзроўню. У тым ліку былі паказаны некалькі нумароў, якія запалі мне ў душу і прымусілі мяне пахвалявацца. Амаль да слёз...

**— Пра харэаграфію часоў вашай маладосці крытыкі (і не толькі яны) гавораць, што гэта быў «залаты час». Вы згодны з гэтым?**

— Сапраўды, гавораць такое пра час маёй маладосці. Маўляў, вось былі тады артысты! А насамрэч гэты артыстызм быў звязаны якраз з тым, што існавала непарыўная сувязь са школай. У тэатр мы прыходзілі яшчэ дзецьмі. Памятаю, калі пачаў вучыцца ў 1949 годзе ў харэаграфічным вучылішчы, і літаральна тады два разы ў тыдзень былі спектаклі ў Вялікім тэатры або яго філіяле. У апошнім зараз знаходзіцца тэатр аперэты (з 1995-га па 2000 год У. Васільеў працаваў мастацкім кіраўніком—дырэктарам Вялікага тэатра. — **Аўт.**). І мы з дзіцячых гадоў назіралі, як жывуць на сцэне артысты старэйшага пакалення. І на кожны наш экзамен абавязкова прыходзілі з Вялікага тэатра артысты: і Лепяшынская, і Уланава. У нас у класе, дарэчы, адным падабалася першая, іншым — другая. І перад пачаткам заняткаў мае аднакласнікі на дошцы ў класе пісалі мелам «Уланава», а іх «канкурэнты», прыхільнікі Лепяшынскай, пісалі вялікімі літарамі яе прозвішча.

**— А вам тады хто больш падабаўся?**

— Вядома ж творчасць Лепяшынскай. Яна была адкрытай, «з агеньчыкам», з фантастычнай тэхнікай. І толькі потым, калі стаў трохі старэйшым, зразумеў, што мне ўсё больш пачынае падабацца Уланава. Таму што ў яе было значна больш творчых таямніц. Пры гэтым у мяне ніколі не было куміраў. Так, многае падабалася, але, каб «маліцца» на каго-небудзь, — такога не было. І яшчэ, калі вучыўся, нікога не хацелася паўтараць, бо мне заўсёды хацелася быць лепшым. Шчыра вам скажу.

**— А вы добра вучыліся?**

— Станок цярпець не мог. Было, на ўсё ішоў, каб спазніцца на заняткі каля станка. Вось скакаць мне падабалася.



Уладзімір Васільеў і Кацярына Максімава.

**— Уладзімір Віктаравіч, вам цяжка быць жывой легендай расійскага танца?**

— Мне гэта вельмі лёгка. Галоўнае, каб «легендам» не прыпісвалі тое, што яны ніколі не гаварылі.

**— А што вы ніколі не гаварылі? Што вам «прыпісваюць» з таго, чаго ніколі не было?**

— *(Смяецца.)* Ведаеце, калі чалавек сыходзіць з жыцця, адразу знаходзіцца вялікая колькасць людзей, якія, «аказваецца», былі з ім блізкія. І пачынаюць пра нябожчыка такое «выдаваць» — пра тое расказваць, чаго самі не бачылі.

**— А прыклады можна?**

— У нас прыкладаў гэтаму шмат. Памятаеце тэлевізійны праект «Сярэбраны шар»? Я Вульфа калі слухаў, складвалася ўражанне аб тым, што ён бачыў усіх і ўсё, і з усімі сябраваў. Як за мяжой, так і ў Расіі. Хаця гэта далёка не так... Ведаю гэта, бо быў сведкам многага з таго, пра што ён расказваў. А ён, складвалася ўражанне, ведаў як усё было на самой справе. А потым я падумаў: Бог з ім. Няхай расказвае тое, чаго не было, ці не зусім так было, галоўнае, каб упрыгожваў у лепшы бок, а не «развенчваў». Каб пра тое, што было цудоўным, не гаварыў, што гэта жудасна.

**— У савецкія гады многія артысты імкнуліся пераехаць працаваць за мяжу. У вас узнікала такое жаданне калі-небудзь?**

— У мяне і ў маёй жонкі Кацярыны (жонка Кацярына Максімава — таксама вядомая на ўвесь свет балерына, якая, на жаль, пайшла з жыцця — **Аўт.**) ніколі не было жадання пакінуць усё і пераехаць туды. Безумоўна, там плацілі ў разы больш, чым у СССР. Увесь свет адкрываўся перад артыстам, які ехаў за мяжу. Гэта было важна. І людзі, якім мала было краін сацыялістычнага лагера, пакідалі радзіму. Але такія вялікія майстры, як, напрыклад, Растраповіч... Яму было б мала ўсяго зямнога шара. Была б магчымасць, ён бы даваў канцэрты на нейкіх планетах за тысячы светлавых гадоў на адлегласці ад Зямлі. Я не магу шчыра сказаць, што мне хапала ўсяго на радзіме... Але ў мяне і ў Каці была адна «асаблівасць»: нас выпускалі за мяжу. А ў некаторых з танцоўшчыкаў, якія засталіся на Захадзе, у нейкі момант быў выбар: там ці тут? Я пра тых расказваю, каго перыядычна не выпускалі. Адзін раз прыціснулі да сценкі, загналі ў куток або сказалі: «Нешта вы маглі там сказаць такое, нешта зрабілі, не паедзеце, вы пакараны». Вось тады артысты і задумваліся. А я гаварыў сабе: «Ну як я магу? Нашы бярозкі, наша краіна такая прыгожая, нашы людзі такія добрыя. Куды ж я ад іх паеду? Мова тая ж, на якой мы думаем...» Але з часам я зразумеў, што трымалі нас людзі — сябры, без якіх мы проста не маглі. А ў тыя гады было так: або вы там, або тут! А ў нас з жонкай заўсёды была вялікая колькасць сяброў і ў драматычным мастацтве, і ў музычным.

**— Напэўна, калі б вас за мяжу не пускалі пастаянна, можа, і засталіся б там аднойчы?**

— Думаў і пра гэта. Магчыма, лепш было б і паехаць туды.

**— Што вам не падабалася падчас выступленняў?**

— Калі выконваў класічныя ролі (напрыклад, прынцаў), хацелася больш праўды і прастаты (паказвае, якія ёсць «стандартныя позы» і рухі падчас выканання класічных роляў. — **Аўт.**).

**— У расійскіх СМІ пісалі, што ў апошнія гады вы шмат малюеце. І вершы пішаце...**

— Без жывапісу я ўжо не магу. Я і ў Віцебску адну работу зрабіў, калі ноччу прыходзіў у атэль. Жывапіс зараз у маім жыцці займае большае месца ў параўнанні з харэаграфіяй і іншым. Ужо было каля дваццаці выстаў маіх твораў. У мяне вялікая колькасць работ. Нават падумваю знайсці памяшканне, каб іх можна было там трымаць (дарэчы, многія мастацтвазнаўцы высока ацэньваюць Васільева як мастака і лічаць, што і ў жывапісе ён стаў прафесіяналам. — **Аўт.**). Сам зрабіў эскізы дэкарацый для некалькіх спектакляў, якія і паставіў. Даўно хацеў зрабіць гэта, бо рэдка бачу, каб дэкарацыі былі добра змайстраваны...

Мяне пытаюць: а ці будзе яшчэ адзін зборнік вершаў? Паглядзім. А першы маленькі зборнічак вершаў быў надрукаваны дзякуючы маім сябрам.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

■ Факт

## 18 МІЛЬЁНАЎ ЗА КАЦЯНЯТ І ШЧАНЯТ

**За студзень—лістапад у Віцебскай вобласці ад грамадзян, якія займаюцца рэалізацыяй кацянят і шчанят (пры ўмове ўтрымання свойскай жывёлы), у бюджэт былі выплачаны падаткі на агульную суму 18 мільёнаў рублёў. Гэтым бізнэсам у Прыдзвінскім краі афіцыйна займаюцца больш за сто чалавек.**

Для параўнання, паводле інфармацыі Віцебскай абласной інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах, за гэты ж час ад тых жыхароў вобласці, якія ажыццяўлялі дзейнасць рэпетытара, было выплачана 98 млн рублёў. І ўсяго ў вобласці былі зарэгістраваны 217 рэпетытараў.

Паслугі па вырошчванні сельскагаспадарчай прадукцыі аказвалі 212 грамадзян (ад іх — падаткі на суму 17 млн рублёў). Музычнае абслугоўванне ўрачыстых мерапрыемстваў, паслугі тамады, фотаздымку ажыццяўляў 131 грамадзянін (97 млн рублёў).

Усяго ў Віцебскай вобласці за 11 месяцаў тыя, хто ажыццяўляе дзейнасць па так званым заяўным прынцыпе, выплацілі ў бюджэт 2,6 мільярда рублёў адзінага падатку. Большасць з гэтай сумы — 2,3 мільярда рублёў — паступіла ў бюджэт ад амаль 4 тысяч чалавек, якія гандлююць на рынках.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

# ПРА ТЫХ, КАГО НЕМАГЧЫМА НЕ ЛЮБІЦЬ



**Гэта значыць, зноў пра сабак. Пра чарговую з імі выстаўку-шоу. Больш за тое — пра «Кубак чэмпіёнаў — 2012», які прайшоў у сталічным выставачным цэнтры БелЭкспа. Галоўнымі ўдзельнікамі свята былі не проста хатнія ўлюбёнцы — сапраўдныя чэмпіёны, тытулаваныя на папярэдніх выстаўках сабакі самых розных парод.**

На першы погляд, гэта быў чэмпіянат па прыгажосці сярод малых і вялікіх барбосаў. Заколкі, брошкі, стрыжкі, завіўкі (ці не хімічныя?), шапачкі, банцікі і розная іншая аздоба на галовах удзельнікаў сведчылі толькі пра бязмежную любоў гаспадароў да сваіх гадаванцаў. Як бы гучна не называлася «тусоўка» чатырохногіх, адной з галоўных мэт мерапрыемства па-ранейшаму застаецца фарміраванне ў насельніцтва любові і беражлівага стаўлення да свойскіх жывёл, азнаямленне з правіламі догляду і кармлення. Адна справа завесці ў доме сябра, іншая — быць адказным за яго. Але мэта можа сягаць і вышэй, і шырэй: які гонар, калі твой сябар заваёўвае і атрымлівае тытул. І нават не столькі за прыгажосць, колькі за сваю не па-сабачы добрую кемлівасць.

Сапраўднай дэманстрацыяй кемлівасці і грацыі сабак сталі выступленні службовых сабак, спаборніцтвы па аджыліці, па фрызбі, флайболе і ўпершыню па фрыстайле — танцам з сабакамі. А касцюміраванае шоу для гэткіх модніц і моднікаў — гэта ўжо неад'емная частка кожнай выставы.





Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# САЛОДКІЯ ПАДАРУНКІ

**У Шуміліна адбудзецца шэсце Дзядоў Марозаў, Снягурак і іншых традыцыйных навагодніх персанажаў. Казачныя героі пройдуць ад будынка Дома культуры да гарадскога парку, упрыгажэннем якога стала галоўная ёлка раёна вышынёй пад 17 метраў.**

Там, як паабяцалі арганізатары будучага свята, падчас тэатралізаванага прадстаўлення ўсім ахвотным можна будзе за расказаны верш, выкананне навагодняй песні атрымаць ад Марозаў ці Снягурак салодкія падарункі. Падчас мерапрыемства будуць працаваць гандлёвыя рады. Мясцовыя артысты з тэатральнага калектыву Шумілінскага дома культуры, які мае званне народнага, у дзень каталіцкага Божага Нараджэння парадуюць прэм'ерай спектакля — казкі «Царэўна-жаба». А праз дзень адбудзецца традыцыйная раённая дабрачынная ёлка.

Да правядзення апошняга мерапрыемства актыўна рыхтуюцца і ў Бешанковічах. Арганізатарам гэтай акцыі, як і раней, стане Цэнтр дзяцей і моладзі пры падтрымцы раённага Дома культуры. На гэтае навагодняе прадстаўленне, якое адбудзецца 28 снежня ў рамках акцыі «Нашы дзеці», запрашаюць дзяцей з малазабяспечаных сем'яў, дзяцей-сірот і з абмежаванымі магчымасцямі, пераможцаў алімпіяд, дзятву з апякунскіх сем'яў. Для правядзення дабрачыннай акцыі райвыканкам выдаткаваў немалую суму — 20 мільёнаў рублёў. Большасць з якой (18 мільёнаў рублёў) запланавана патраціць для фарміравання салодкіх падарункаў. А астатнія грошы патрацяць на прызы і касцюмы для ўдзельнікаў святочнага мерапрыемства.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**Сардэчна віншуем супрацоўніцу газеты «Звязда» Алену ДЗЯДЗЮЛЮ з вялікай і важнай асабістай падзеяй — НАРАДЖЭННЕМ ДЗІЦЯЦІ! Зычым маме і немаўляці моцнага здароўя, надзейнага тылу, непахіснага дабрабыту і бязмежнага шчасця!**



*Звяздоўцы.*

## Гаспадароў грузу не знайшлі

Полацкія пагранічнікі і супрацоўнікі міліцыі ў Верхнядзвінскім раёне паблізу чыгуначнага палатна знайшлі 65 каробак з цыгарэтамі — 32,5 тысячы пачкаў. Як мяркуецца, тытунёвая прадукцыя прызначалася для перамяшчэння ў грузавых вагонах пад пластом вугалю ў Латвію. Цыгарэты канфіскаваны. Гаспадароў іх шукаюць.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ 18 января 2013 г. проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка | Целевое назначение | Инженерная инфраструктура * | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена земельного участка (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Горанский с/с, Вишневка | 623681302601000075 | 0,1500 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 3 124 266 | 31 000 000 | 6 200 000 |
| 2 | Горанский с/с, д. Дуличи | 623681304601000102 | 0,1014 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | | 3 712 238 | 16 000 000 | 3 200 000 |
| 3 | г. Заславль, ул. Нагорная, 2а | 623650100001004632 | 0,1000 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество, газ, водопровод | 3 894 995 | 226 000 000 | 45 200 000 |
| 4 | г. Заславль, ул. Нагорная, 4а | 623650100001004631 | 0,1038 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество, газ, водопровод | 3 894 995 | 235 000 000 | 47 000 000 |
| 5 | Колодищанский с/с, д. Липовая Колода | 623683403601000185 | 0,1671 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 3 300 000 | 33 000 000 | 6 600 000 |
| 6 | Колодищанский с/с, д. Липовая Колода, участок № 86А | 623683403601000188 | 0,1497 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 4 800 000 | 33 000 000 | 6 600 000 |
| 7 | Колодищанский с/с, д. Липовая Колода, участок № 97А | 623683403601000189 | 0,1497 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 4 800 000 | 33 000 000 | 6 600 000 |
| 8 | Колодищанский с/с, д. Липовая Колода, участок № 98А | 623683403601000190 | 0,1444 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 4 800 000 | 32 000 000 | 6 400 000 |
| 9 | Колодищанский с/с, п. Городище, ул. Молодежная, участок № 12 | 623683402101000469 | 0,1124 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество, газ | 4 800 000 | 81 000 000 | 16 200 000 |
| 10 | Колодищанский с/с, п. Городище, ул. Молодежная, участок № 14 | 623683402101000467 | 0,1122 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество, газ | 4 800 000 | 81 000 000 | 16 200 000 |
| 11 | Колодищанский с/с, п. Городище, ул. Молодежная, участок № 16 | 623683402101000468 | 0,1122 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество, газ | 4 800 000 | 81 000 000 | 16 200 000 |
| 12 | Крупицкий с/с, п. Аннополь | 623683900601000054 | 0,1429 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество, водопровод | 3 669 461 | 43 000 000 | 8 600 000 |
| 13 | Крупицкий с/с, д. Дубинки | 623683903101000051 | 0,1613 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество | 660 566 | 32 000 000 | 6 400 000 |
| 14 | Крупицкий с/с, д. Столбуновичи | 623683909101000128 | 0,1464 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество | 3 432 313 | 31 000 000 | 6 200 000 |
| 15 | Луговослободской с/с, д. Лебединец, участок № 2 | 623684108101000119 | 0,1499 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество, водопровод | 3 305 404 | 53 000 000 | 10 600 000 |
| 16 | Луговослободской с/с, д. Лебединец, участок № 3 | 623684108101000120 | 0,1490 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество, водопровод | 3 305 404 | 53 000 000 | 10 600 000 |
| 17 | Михановичский с/с, д. Березина, участок № 4 | 623684200601000033 | 0,1445 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество | 84 000 | 57 000 000 | 11 400 000 |
| 18 | Михановичский с/с, д. Березина, участок № 13 | 623684200601000038 | 0,1536 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество | 84 000 | 61 000 000 | 12 200 000 |
| 19 | Михановичский с/с, д. Кайково, ул. Животноводов, участок № 8 | 623684202601000262 | 0,1376 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество, газ, водопровод | 1 200 000 | 60 000 000 | 12 000 000 |
| 20 | Михановичский с/с, д. Кайково, участок № 1 | 623684202601000218 | 0,1533 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 300 000 | 67 000 000 | 13 400 000 |
| 21 | Михановичский с/с, д. Кайково, участок № 6 | 623684202601000233 | 0,1532 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 84 000 | 67 000 000 | 13 400 000 |
| 22 | Михановичский с/с, д. Кайково | 623684202601000268 | 0,1468 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество, газ, водопровод | 3 500 000 | 100 000 000 | 20 000 000 |
| 23 | Михановичский с/с, д. Плебанцы, участок № 3 | 623684205601000121 | 0,2414 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество, водопровод | 2 000 000 | 87 000 000 | 17 400 000 |
| 24 | Михановичский с/с, аг. Чуриловичи, участок № 21 | 623684206601000226 | 0,1529 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 105 000 | 86 000 000 | 17 200 000 |
| 25 | Роговский с/с, д. Рогово | 623685817101000083 | 0,1454 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество | 3 678 000 | 19 000 000 | 3 800 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **18.01.2013 г. в 10.00.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **14.01.2013 г. в 17.00.** Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе На Лоты 1–2 перечисляется на расчетный счет № 3641900000150 Горанского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052360, код платежа – 04901.

На Лоты 3–4 перечисляется на расчетный счет № 3641621200079 Заславского горисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600012999, код платежа – 04901.

На Лот 5–11 перечисляется на расчетный счет № 3641900000020 Колодищанского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052304, код платежа – 04901.

На Лоты 12–14 перечисляется на расчетный счет № 3641900000091 Крупицкого сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052399, код платежа – 04901.

На Лоты 15–16 перечисляется на расчетный счет № 3641900000075 Луговослободского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600219251, код платежа – 04901.

На Лоты 17–24 перечисляется на расчетный счет № 3641900000105 Михановичского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600303747, код платежа – 04901.

На Лот 25 перечисляется на расчетный счет № 3641900000059 Роговского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052358, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.
2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет с отметкой банка.
3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);
3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в частную собственность единственному участнику несостоявшегося аукциона, при его согласии, с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов).

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Местный исполнительный комитет не позднее 2 рабочих дней после внесения победителем аукциона платы за предмет аукциона, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения и выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выдает ему выписку из названного решения, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона.

** В разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, к которым возможно подключение в указанном населенном пункте.*

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| ЛОТ 1 | |
|---|---|
| **Наименование объекта** | **Краткая характеристика** |
| **Здание автостанции «Острино»** | Здание специализированное автомобильного транспорта инв. № 422/С-3776, литер Е1/к, 1977 г.п., общая площадь здания 313,4 кв.м, объем здания с подвалом 1485 м.куб., фундамент бетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытия ж/б плиты, крыша рулонная совмещенная, полы дощатые, цементные, отопление – чугунные радиаторы, электроснабжение – скрытая электропроводка. Сарай Литер 2, 1977 г.п., площадь застройки 62 кв.м, объем 186 м.куб., фундамент бетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытия – ж/б плиты, крыша рулонная совмещенная, полы бетонные, электроснабжение – скрытая электропроводка. Проезжая часть с дорожным бордюром – асфальтобетонное покрытие площадью 4595,4 кв.м, бетонный бордюр длиною 441,6 м. Пешеходная часть с тротуарным бордюром – тротуарная плитка(бетон) площадью 275,6 кв.м, бетонный бордюр длиною 206,6 м. Зеленые насаждения (28 ед.) |
| **Начальная цена продажи** | 21 631 646 (двадцать один миллион шестьсот тридцать одна тысяча шестьсот сорок шесть) белорусских рублей без учета НДС. |
| **Сумма задатка** | 1 081 582 (один миллион восемьдесят одна тысяча пятьсот восемьдесят два) белорусских рубля. |
| **Местонахождение объекта** | Гродненская обл., Щучинский р-н, г.п. Остринo, ул. Гродненская, 49 |
| **Земельный участок** | Кадастровый № 425856600002000070, общая площадь земельного участка – 0,7343 га, назначение – содержание и обслуживание зданий и строений автостанции |
| **Продавец** | Филиал «Автомобильный парк № 12 г. Щучин» ОАО «Гроднооблавтотранс» г. Щучин, ул. Советская, 41 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| **Условия аукциона** | Аукцион без условий |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225. |

**Аукцион состоится 29 декабря 2012 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209**

К участию в аукционе допускаются юридические лица,физические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон впроцессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – нотариально заверенная доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

**Информация о первом аукционе была размещена в газете «Звязда» от 01.08.2012 г. № 146 (27261).**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3 с 8.30 до 17.30.**

**Последний день приема заявлений – 28 декабря 2012 г. до 14.00.**

**Телефон для справок: 41 98 32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». Подробная информация: www.ino.by**

*На основании решения комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства при Мядельском райисполкоме, и письма инспекции Министерства по налогам и сборам Республики Беларусь по Мядельскому району,*
**объявление о проведении аукциона по продаже имущества, обращенного в доход государства, расположенного по адресу: г.п. Свирь, ул. Советская, 53 Мядельского р-на, назначенного на 16.01.2013 г. СЧИТАТЬ НЕДЕЙСТВИТЕЛЬНЫМ.**

УНП 600182305

**ОАО «ГОМЕЛЬОБЛРЕКЛАМА»**
**Филиал «Эксперт-Услуга»**
**(организатор аукциона)**
**ИЗВЕЩАЕТ, ЧТО СНЯТ ЛОТ № 3**
**Автомобиль MAZDA 6 2008 г.в., легковой хетчбек; МКП, (инв. № 45903997) гос. № 9907 ЕК-3 в хорошем состоянии, С АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ, которые состоятся 26 декабря 2012 г.**
Дополнительная информация по телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 74 17 34, 74 89 64 и на сайте gomeloblreklama.by

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ООО «Садал» (продавец)

### извещает о проведении 21 января 2013 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16

| № лота | Наименование, адрес объектов | Адрес объектов | Начальная цена продажи лота, с учетом НДС, бел. руб. | Задаток, с учетом НДС, бел. руб |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инвентарным номером 333/С-73582 (наименование – автостоянка) площадью 10459 м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 322383003101000277 площадью 2,0400 га | Гомельская область, Калинковичский район, Сыродский с/с, 9 | 293 604 000 | 14 680 200 |
| 2 | Емкость металлическая объемом 100 куб.м. | Гомельская область, Калинковичский район, д. Гулевичи | 65 160 000 | 3 258 000 |
| 3 | Емкость металлическая объемом 100 куб.м. | | 65 160 000 | 3 258 000 |

**Продавец:** Общество с ограниченной ответственностью «Садал», 247491, г. Речица, ул. Набережная, 110. Решением хозяйственного суда Гомельской области от 10.10.2011 в отношении ООО «Садал» открыто ликвидационное производство, тел. 8 (029) 173 06 72.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

1. Оплатить задаток на расчетный счет Продавца (должника) (Общество с ограниченной ответственностью «Садал») р/с 3012113760019 в ЦБУ № 324 ОАО «БПС-Сбербанк» в г. Мозыре, БИК 153001369, УНП 400083132 **по 17 января 2013 года в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: ул. Гагарина, 20, каб. 2-16, г. Гомель **по 17 января 2013 года в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения.**

Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются и по почте не принимаются.

К заявлению прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);

индивидуальным предпринимателем – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается продавцом в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре купли-продажи, и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы по изготовлению и предоставлению участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала аукциона в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с действующим гражданским законодательством Республики Беларусь, Методическими рекомендациями об особенностях оценки и продажи имущества должника, находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) № 144 от 29.11.2010.

**Дополнительная информация по телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 74 17 34, 74 89 64 и на сайте gomeloblreklama.by**

## ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ открытого акционерного общества «МОТОВЕЛО»

(г. Минск, проспект Партизанский, 8)
**СОСТОИТСЯ 26 декабря 2012 г. по адресу: г. Минск, проспект Партизанский, 8 В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ**

Орган, по решению которого созывается общее собрание акционеров: **Наблюдательный совет ОАО «МОТОВЕЛО».**

**Повестка дня:**

**1. Об увеличении уставного фонда ОАО «МОТОВЕЛО» путем увеличения номинальной стоимости простой (обыкновенной) акции ОАО «МОТОВЕЛО» за счет источников собственных средств ОАО «МОТОВЕЛО».**

**2. О внесении изменений и дополнений в устав ОАО «МОТОВЕЛО».**

Бюллетени для заочного голосования акционеры получают с 21 декабря по 22 декабря 2012 г. по адресу: г. Минск, проспект Партизанский, 8, юридический отдел ОАО «МОТОВЕЛО» с 9.00 до 17.00 (обеденный перерыв с 13.00 до 14.00) под роспись при предъявлении паспорта (для представителей акционеров — паспорта и доверенности).

Акционеры обязаны возвратить заполненные бюллетени для заочного голосования по указанному адресу не позднее 17.00 22 декабря 2012 г.

С проектом решений собрания, изменений и дополнений в устав ОАО «МОТОВЕЛО», формой и текстом бюллетеня для заочного голосования акционеры могут ознакомиться с 21 декабря по 22 декабря 2012 г. по адресу: г. Минск, проспект Партизанский, 8, юридический отдел ОАО «МОТОВЕЛО» с 9.00 до 17.00 (обеденный перерыв с 13.00 до 14.00).

Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, составлен на основании данных реестра владельцев акций ОАО «МОТОВЕЛО» по состоянию на 18 декабря 2012 г. УНП 190017558

## ИЗВЕЩЕНИЕ

**Государственное производственное объединение «МИНСКСТРОЙ» доводит до сведения дольщиков О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНЫЕ ДЕКЛАРАЦИИ о строительстве нежилых помещений объекта:**

УНП 100071325

«Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-3. Жилой дом № 21 по генплану со встроенно-пристроенными помещениями» в г. Минске. Административно-торговое помещение № 2. Ожидаемое окончание строительства нежилого помещения – 14 марта 2013 года;

«Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-4. Жилой дом № 1 по генплану со встроенными помещениями» в г. Минске. Административно-торговые помещения. Ожидаемое окончание строительства нежилых помещений – 14 марта 2013 года.

Дополнительные соглашения о переносе сроков окончания строительства будут заключаться в кабинете 105 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А.

*Генеральный директор Н.В. Милошевский*

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и стоимость** | **Лот № 1.** Изолированное помещение инв. № 200/D-135604, расположенное по адресу: г. Витебск, ул. Володарского, 96-1, общей площадью 269,9 $м^2$, 1978 года постройки. Объект продажи представляет собой первый этаж трехэтажного административного здания. В наличии есть все коммунальные сети: электроснабжение, теплоснабжение, водопровод, канализация. Имеется доступ автомобильного транспорта. **Начальная стоимость лота 264 800 000 рублей.** |
| **Собственник (владелец) имущества** | **ВКМУП «Заря» (г. Витебск, ул. Леонова, 24, УНП 300200317).** |
| **Наличие обременений** | **Отсутствуют** |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | **Хозяйственный суд Витебской области г. Витебск, ул. «Правды», 32 10 января 2013 в 11.00** |
| **Справочная информация** | Хозяйственный суд Витебской области 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 324 **http:// vitebsk.court.by** Судебный исполнитель Халков Дмитрий Вячеславович, тел./факс: 80212491342, 80291502410 Исполняющий обязанности старшего судебного исполнителя Зуев Михаил Евгеньевич, тел. 80212491343 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903002094 в 200 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 635, УНН 300007670 **не позднее 11.00 10.01.2013.** Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота. В соответствии со статьей 385 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

## РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИЕ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ СОБСТВЕННОСТИ ОАО «МАЛОРИТСКИЙ КОНСЕРВНО-ОВОЩЕСУШИЛЬНЫЙ КОМБИНАТ»

| Номер лота | ЛОТ № 1 | |
|---|---|---|
| **Наименование объекта** | Незавершенный строительством законсервированный цех плодоовощных консервов для детского питания (инв. № 103/U-9173), общ. пл. 5047 $м^2$, степень готовности 64%. Год начала строительства 1994. | |
| **Местонахождение объекта** | Брестская обл., г. Малорита, ул. Заводская, д. 9А | |
| **Продавец (Балансодержатель)** | ОАО «Малоритский консервно-овощесушильный комбинат» | |
| **Организатор торгов** | РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление | |
| **Начальная цена продажи, руб., без НДС** | 249 018 000 | |
| **Размер задатка, руб.** | 2 490 180 | |
| **Право на земельный участок** | 1,0702 га | после продажи объекта с аукционных торгов границы земельного участка будут уточняться путем выполнения комплекса топогеодезических работ |
| **Тип и характеристика объекта** | Фундамент сб. ж/бетонный (100% степ. готовности); стены и перегородки ж/б панели, кирпич (100% степ. готовности); перекрытия ж/б плиты (100% степ. готовности); кровля рулонная (100% степ. готовности); полы бетонные, проемы деревянные, металлические (50% степ. готовности) отделочные работы, внутренние сантех. и электротехн. устройства – отсутствуют | |
| **Условия продажи** | Без условий | |
| **Условия оплаты** | оплата производится в соответствии с заключенным договором купли-продажи | |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов | |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/сч 3012105618108 рубли РБ в Региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, код 153001369, УНН 102353509 | |

**Аукцион состоится 28 декабря 2012 г. в 12.00. по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325. РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:** ***г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329*** **в рабочие дни с 9.00 до 17.00.**

**Последний день приема заявлений – 27 декабря 2012 г. до 17.00.**

**Контактный тел.: 8 (0162) 23 94 25, 23 92 59, 21 88 81.**

■ На хвалях дапамогі

# ДЭЛЬФІНЫ ДОРАЦЬ НАДЗЕЮ

## і становяцца праваднікамі ў знешні свет для хворых дзяцей

**Калі ў снежні мінулага года ў сталіцы ўрачыста адкрываўся першы ў краіне дэльфінарый «Нэма», напэўна, мала хто мог прадбачыць, што ўсяго праз год і ў яго артыстаў, і ў яго работнікаў з'явіцца так многа прыхільнікаў і верных сяброў. Больш за тое, сваю першую гадавіну дэльфінарый «Нэма» вырашыў адзначыць разам з міжнародным дабрачынным грамадскім аб'яднаннем «Дзеці. Аўтызм. Бацькі». Год таму 25 беларускіх сем'яў, у якіх выхоўваюцца дзеці з аўтыстычнымі парушэннямі, вырашылі аб'яднацца ў грамадскую арганізацыю, каб сумесна вырашаць праблемы лячэння, навучання і сацыяльнай адаптацыі малых у грамадстве. Сёння гэта ўжо больш як 100 сем'яў з розных беларускіх гарадоў, а на форуме сайта autism.by зарэгістравана больш як 180 удзельнікаў.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— У сітуацыі поўнай адсутнасці спецыяльна падрыхтаваных да работы з дзецьмі-аўтыстамі псіхолагаў і педагогаў усяго за год нашай работы нам вельмі шмат чаго ўдалося дабіцца, — расказвае **старшыня Савета міжнароднага дабрачыннага грамадскага аб'яднання «Дзеці. Аўтызм. Бацькі» Таццяна ЯКАЎЛЕВА**. — Сёння рыхтуецца пілотны праект міжведамаснага ўзаемадзеяння для аказання дапамогі дзецям з аўтызмам. Размова ідзе пра міністэрствы адукацыі, аховы здароўя, працы і сацыяльнай абароны. Спецыфіка нашай праблемы заключаецца ў тым, што асобна кожнае ведамства не ў сілах дапамагчы нашым дзецям. А мы фактычна сталі паміж імі пасрэднікамі і ініцыятарамі прыняцця мноства вельмі важных рашэнняў і дакументаў. Так, у Міністэрстве аховы здароўя зараз рыхтуецца загад, паводле якога медыцынская дапамога будзе аказвацца нашым дзецям не ў паліклініцы, а на даму. З наступнага навучальнага года мы чакаем увядзення ў школьны штат новай адзінкі — педагога, які будзе суправаджаць дзіця ўвесь час яго знаходжання ў школе і дапамагаць раскрываць яго асаблівы свет — не «разумова адсталы», а свет асаблівых здольнасцяў.

> **«Згодна з сусветнай статыстыкай, кожнае сотае дзіця мае расстройствы аўтыстычнага спектра. А некаторыя замежныя спецыялісты настойваюць на тым, што ад такіх расстройстваў церпіць кожнае дзясятае дзіця»**

### «ЭПІДЭМІЯ» АЎТЫЗМУ

Чалавек — істота сацыяльная. Але не ўсе людзі прыходзяць у свет з генетычнай цягай да сабе падобных. У апошнія гады нараджаецца ўсё больш дзяцей, паталагічна замкнёных і не гатовых да кантактаў з навакольным светам.

Аўтызм — гэта расстройства, якое характарызуецца выражаным і ўсебаковым дэфіцытам сацыяльнага ўзаемадзеяння і стасункаў.

У беларускім банку даных асаблівых дзяцей знаходзяцца зараз 434 дзіцяці з аўтыстычнымі парушэннямі. Гэта 0,3% ад агульнай колькасці дзяцей.

— Але паглядзіце на тэндэнцыю: калі ў 2008 годзе ў Мінску на 10 000 дзяцей фіксаваліся 1,7 выпадкі аўтызму, то ў 2011 годзе — ужо 5,4 выпадкі. А сёння медыкі канстатуюць, што толькі па Мінску афіцыйна такі дыягназ маюць каля 600 дзяцей. І гэта , хутчэй за ўсё, толькі вяршыня айсберга. Згодна з сусветнай статыстыкай, кожнае сотае дзіця мае расстройствы аўтыстычнага спектра. А некаторыя замежныя спецыялісты настойваюць на тым, што ад такіх расстройстваў церпіць кожнае дзясятае дзіця, — падкрэслівае Таццяна Якаўлева. — Рост аўтызму ў свеце ўжо супастаўляюць па маштабах з эпідэміяй.

Навукоўцы заклапочаны тым, што сапраўдныя прычыны расстройства застаюцца невядомымі, а рэабілітацыйны працэс патрабуе істотных намаганняў. Увогуле карэкцыя аўцят лічыцца адной з самых складаных у свеце.

Пры аўтызме парушаецца здольнасць дзіцяці да сацыяльных навыкаў, кантактаў з іншымі дзецьмі і дарослымі, узнікаюць праблемы як у невербальнай камунікацыі, так і ў зносінах пры дапамозе маўлення. Пры гэтым інтэлект дзіцяці не церпіць, а ў некаторых выпадках можа быць нават намнога вышэйшы, чым у яго равеснікаў. Нярэдка людзі, якія церпяць ад аўтызму, могуць бліскуча праяўляць сабе ў творчасці, навуках і іншых відах чалавечай дзейнасці. Характэрнай асаблівасцю аўтызму з'яўляецца звышздольнасць чалавека канцэнтравацца на адной пэўнай ідэі, тэме ці мэце.

— Нашы дзеці вельмі дысгарманічна развітыя, таму для іх надзвычай актуальная праблема складання індывідуальных планаў навучання, — расказвае Ірына Класкоўская. — Для прыкладу, у адной з нашых сем'яў выхоўваецца хлопчык, які ўжо ў першым класе ведае табліцу множання, можа дзяліць лічбы з астаткам, узводзіць число ў ступень, але пры гэтым з-за негатоўнасці звычайнай школы да работы з такімі дзецьмі ён вымушаны займацца па праграме для дзяцей з цяжкасцямі ў навучанні, якая першапачаткова разлічана на дзяцей з лёгкай інтэлектуальнай недастатковасцю. Мы лічым, што ў яго павінна быць магчымасць пайсці ў вывучэнні матэматыкі наперад настолькі далёка, наколькі дазволяць яго здольнасці. Але без індывідуальнага плана навучання і развіцця зрабіць гэта, на жаль, немагчыма.

### ЧУЛЫЯ «КАДРЫ»

— У асобе супрацоўнікаў дэльфінарыя «Нэма» мы, бацькі дзяцей з аўтыстычнымі парушэннямі, паспелі набыць надзейных і важных сяброў, — кажа Таццяна Якаўлева. — Хлопцы і дзяўчаты, якія працуюць з нашымі дзецьмі, — гэта спецыялісты самага высокага ўзроўню. Але каб знайсці падыход да аўцят, мала мець спецыяльныя веды, трэба яшчэ і валодаць самымі лепшымі чалавечымі якасцямі. Чуласць — адна з самых важных якасцяў усіх супрацоўнікаў дэльфінарыя.

Хто б мог падумаць, што галоўным пастаўшчыком «кадраў» для аддзела дэльфінатэрапіі стане Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт? Сёння дэльфінатэрапеўтамі тут працуюць псіхолагі Дзмітрый Канюшэўскі і Аляксандра Шулякоўская, біёлаг-генетык Таццяна Рыжкевіч, а таксама выпускнік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры, інструктар па лячэбнай фізкультуры, масажыст Васіль Аўсяннікаў.

— Пры адборы на работу ў дэльфінарыі мы ўсе праходзілі вельмі строгі псіхалагічны адбор, — усміхаецца **кіраўнік аддзела дэльфінатэрапіі Аляксандра ШУЛЯКОЎСКАЯ.** — Прычым у першую чаргу нашы кандыдатуры павінны былі «прызнаць» і «зацвердзіць» дэльфіны. А сёння мы ўжо нават і не ўяўляем сваё жыццё без нашых сяброў, якія не перастаюць нас здзіўляць. Да кожнага дзіцяці дэльфіны шукаюць свой падыход. Яны вельмі асцярожна змяншаюць дыстанцыю і сочаць за дзіцем, каб яго не напужаць. Калі дзіця зусім малое, яны «скідваюць сваю хуткасць», але, калі перад імі, скажам, дванаццацігадовае дзіця, яны могуць яго «катаць» па басейне зусім на іншай хуткасці.

— Як толькі мы заходзім у басейн, адразу бачым, у каго з нашых гадаванцаў які настрой. Хто не можа дачакацца, калі з ім пачнеш гуляць, а хто па нейкай прычыне «сумуе». Вось і зараз пакуль мы з вамі тут размаўляем, яны ўсімі спосабамі спрабуюць прыцягнуць да сябе ўвагу, прапануюць гульню, — падтрымлівае калегу **Таццяна РЫЖКЕВІЧ**. — Калі ж дэльфін дазваляе пагладзіць свой хвост, значыць, ён цалкам давярае гэтаму чалавеку.

### І СВЯТА, І ПРАЦА

Дэльфіны надзвычай чулыя, яны па-сяброўску ставяцца да людзей, а іх экзатычная прыгажосць і гуллівасць не могуць не прыцягваць увагу. Упершыню думка, што стасункі з дэльфінамі могуць аказваць на людзей лячэбнае ўздзеянне, была выказана на мяжы 1950-1960-х гадоў. Цяпер дэльфінатэрапія з'яўляецца ўжо прызнаным ва ўсім свеце неспецыфічным метадам узмацнення ахоўных сіл арганізма і рэабілітацыі. Дэльфіны фактычна з'яўляюцца каталізатарам, які запускае механізмы тэрапеўтычнага працэсу.

Дэльфінатэрапія вучыць дзіця-аўтыста невербальным, тактыльным і эмацыянальным кантактам, пазбаўляе яго ад многіх страхаў. Уздзеянне на арганізм дзіцяці ўльтрагукамі рознай частаты, якія выпраменьвае санар дэльфіна, прыводзіць да выпрацоўкі эндарфінаў — гармонаў шчасця. Эндарфіны, у сваю чаргу, паляпшаюць стан дзіцяці, яго настрой, стымулююць мазгавую дзейнасць, працэсы мыслення і запамінання, павышаюць імунітэт. Пад уплывам сеансаў дэльфінатэрапіі паляпшаецца камунікацыя дзіцяці з навакольным светам. Яно можа вымавіць першыя словы (хоць некаторыя дзеці з аўтызмам не размаўляюць), што, у сваю чаргу, дапамагае перайсці да канструктыўных сацыяльных кантактаў за сценамі дэльфінарыя. На занятках з удзелам дэльфінолага замацоўваюцца пазітыўныя мадэлі паводзінаў і зносін, дзіця вучыцца самастойнасці і незалежнасці.

Для здаровых дзяцей заняткі з дэльфінамі — сапраўднае свята, але для аўцят — гэта яшчэ і праца, якая патрабуе ад іх намаганняў. Дзецям даюць магчымасць, перш чым спусціцца ў басейн, пагладзіць на памосце дэльфінаў, паліць іх вадой, пагуляць з імі ў мячык, памасажыраваць ім спінку. У вадзе дзеці плаваюць, трымаючыся за плаўнікі дэльфінаў, пад наглядам дэльфінатэрапеўта, які, між іншым, можа і «адпусціць іх у свабоднае плаванне», калі бачыць, што дзіця да гэтага падрыхтавана.

**ПАКАЗАННІ ДА ДЭЛЬФІНАТЭРАПІІ:**

- *дзіцячы аўтызм*
- *сіндром дэфіцыту ўвагі з гіперактыўнасцю*
- *разумовая адсталасць*
- *неўрозы*
- *паніжаная рэактыўнасць і схільнасць да саматычных пакут*
- *хранічная стомленасць у дарослых*
- *ДЦП*

Між іншым, дакрананне да скуры дэльфіна падчас пагладжвання ці выканання сумесных практыкаванняў таксама аказвае лячэбны эфект, паколькі скура дэльфіна мае вялікую колькасць біялагічна актыўных кропак і валодае пэўным электрамагнітным патэнцыялам. Кожны сеанс распрацоўваецца індывідуальна, з улікам асобасных і патэнцыяльных магчымасцяў дзіцяці, і можа доўжыцца да 25-30 хвілін. Напрыканцы заняткаў, як правіла, дзеці разам з дэльфінам малююць карціну...

За першы год работы курс дэльфінатэрапіі ў «Нэма» прайшлі каля 500 дзяцей. Дэльфінатэрапеўты канстатуюць, што для атрымання ўстойлівага тэрапеўтычнага эфекту патрабуюцца 10 сеансаў, але праз паўгода курс дэльфінатэрапіі пажадана паўтарыць. І вось тут ёсць адна акалічнасць, якая для многіх сем'яў становіцца непераадольнай перашкодай: кошт аднаго сеанса ў снежні і сакавіку складае 720 тысяч рублёў, у студзені і лютым — 640 тысяч, а ў летні час даходзіць да мільёна рублёў.

З нагоды дня нараджэння (і свайго, і сваіх сяброў) дэльфінарый зрабіў падарунак кожнай са ста сем'яў, што ўваходзяць у грамадскае аб'яднанне «Дзеці. Аўтызм. Бацькі» — прадаставіў кожнаму дзіцяці бясплатны сеанс дэльфінатэрапіі. Безумоўна, у перспектыве было б вельмі добра знайсці спонсара, які змог бы аплачваць сеансы дэльфінатэрапіі, каб такім чынам падтрымаць сем'і, якія ўсімі даступнымі ім спосабамі змагаюцца за адаптацыю сваіх дзяцей. Зараз рыхтуецца нацыянальны праект дапамогі людзям з аўтызмам з удзелам ЮНІСЕФ . Вядуцца работы над стварэннем кансультацыйна-дыягнастычнага цэнтра, дзе будзе сабрана мультыдысцыплінарная каманда спецыялістаў, і першага ў краіне рэсурснага цэнтра па праблемах аўтызму.

> **«Пры адборы на работу ў дэльфінарыі ўсе кандыдаты праходзілі вельмі строгі псіхалагічны адбор. Прычым у першую чаргу кандыдатуры павінны былі «прызнаць» і «зацвердзіць» дэльфіны»**

— У нас ёсць надзея, што чым больш грамадскасць будзе ведаць аб праблемах нашых асаблівых дзяцей, тым далей мы зможам прасунуцца ў іх вырашэнні, — падсумавала Таццяна Якаўлева.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

---

**Даты | Падзеі | Людзі**



**1920** год — рэўкамам Навагрудка было прынята рашэнне аб стварэнні ў горадзе музея класіка сусветнай літаратуры Адама Міцкевіча. Аднак праз два тыдні горад заняло польскае войска, і адкрыццё музея адклалася да 1938 года. Падчас вайны ён быў разбураны і адкрыўся зноў у 1955 годзе — да 100-годдзя з дня смерці Адама Міцкевіча. Тут зрабілі рэканструкцыю — са знойдзеных у варшаўскіх архівах фотаздымках перапланавалі пакой, зноўку адбудавалі флігель, свіран, альтанку. Цяпер у фондах музея налічваецца больш за 9 тысяч экспанатаў, у тым ліку настольны гадзіннік, акуляры і іншыя асабістыя рэчы паэта. У некалькіх раздзелах экспазіцыі прадстаўлены матэрыялы пра дзяцінства і юнацтва Міцкевіча, яго вучобу за мяжой і знаходжанне ў Расіі.

**1866** год — у Санкт-Пецярбургу з дазволу імператара Аляксандра II было створана Рускае тэлеграфнае агенцтва (РТА). Першае расійскае інфармагенцтва збірала і распаўсюджвала па тэлеграфе палітычную, фінансавую і камерцыйную інфармацыю. Яе спажыўцамі сталі газеты, свежасць навін у якіх (асабліва з-за мяжы) да таго была сумнiўнай. Найноўшы цуд тэхнікі — тэлеграф — паскорыў і распаўсюджванне рэкламы (менавіта пры Аляксандру II было дазволена прадаваць газеты з дапамогай разносчыкаў і публікаваць у іх камерцыйныя аб'явы). Але прыбытак ад РТА аказаўся меншы, чым чакалася. Агенцтва праіснавала да 1878 года. А ў 90-х гадах XIX стагоддзя намаганнямі міністра фінансаў Сяргея Вітэ быў створаны камерцыйны аддзел Санкт-Пецярбургскага інфармагенцтва, на які працавалі больш за 5 тысяч карэспандэнтаў. Яны пастаўлялі аператыўную інфармацыю з сусветных рынкаў, яна друкавалася толькі ў «Торгово-промышленной газете», якая выдавалася на грошы Мінфіна. Так Вітэ фактычна ўвёў дзяржаўную манаполію на фінансавую інфармацыю.

**1938** год — нарадзіўся Анатоль Маркавіч Галушка, беларускі вучоны ў галіне ліцейнай вытворчасці, вынаходнік СССР (1986). Аўтар навуковых прац па тэарэтычных асновах і тэхналогіі плаўкі алюмініевых сплаваў, метадах плаўкі адходаў вытворчасці. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

**Было сказана**

**Уладзімір МУЛЯВІН (1941—2003), музыкант, кампазітар:**

***«Кожны рытм, афарбаваны народнай першаасновай, заўжды будзе адпавядаць духу часу».***

---

■ Пераднавагодняе

### ПАДАРУНАК СА ЗНІЖКАЙ

**У Гомельскай вобласці стартуе сезон пераднавагодніх кірмашоў. У горадзе над Сожам продаж тавараў навагодняга асартыменту будзе ажыццяўляцца на плошчы Паўстання 22-23 і 29-30 снежня.**

Удзел у кірмашах прымуць не толькі гандлёвыя прадпрыемствы і арганізацыі горада, але і фермерскія гаспадаркі. Гараджанам прапануюць харчовыя і нехарчовыя спажывецкія тавары, навагоднія падарункі і сувеніры па зніжаных коштах — аб'екты гандлю рэгіёна зменшылі гандлёвыя надбаўкі на некаторыя віды прадукцыі напярэдадні новага года.

Аналагічныя кірмашы ў райцэнтрах Гомельшчыны пачнуцца 21 снежня. Яны будуць арганізаваны на плошчах гарадоў, пляцоўках ля буйных гандлёвых цэнтраў, тэрыторыях ля рынкаў і раённых дамоў культуры.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ — ДЗЕЦЯМ

**Упершыню ў Віцебскай вобласці напярэдадні Каляд і навагодняга свята стартуе дабрачынная акцыя «Прадпрымальнікі — дзецям».**

Арганізатарам акцыі выступіла прадпрыемства «Віцебскі абласны цэнтр маркетынгу». Паводле слоў яго дырэктара Ірыны Макаранкі, мэта акцыі — аказаць дапамогу тым, хто сапраўды ў ёй мае патрэбу. І прынцыповая «пазіцыя» пры правядзенні акцыі — гэта перадача падарункаў «з рук у рукі». Кожны можа прыняць удзел у акцыі — незалежна ад матэрыяльнага становішча свайго бізнэсу. Напрыклад, можна проста з'ездзіць разам з супрацоўнікамі прадпрыемства і пагутарыць з дзецьмі. У рамках акцыі будзе арганізаваны конкурс дзіцячага малюнка сярод выхаванцаў дзіцячых устаноў на тэму «Кім я хачу стаць?».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

---

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Шарманка. Асцід. Рампа. Арак. Адам. Гук. Мора. Елка. Сан. Вінт. Цымбалы. Бар. Ваза. Арол. Гора. Дантэс. Калеж. Прымак. «Лада». Акруга. Вата. Лаз. Статар. Лага. Камбуз. Перу. Шпак. Бандура.

**Па вертыкалі:** Моц. Доказ. Драма. Рад. Апал. Зурна. Сабо. Арык. Джала. Джаз. Штам. Нырка. Лямпа. Спам. Норка. Бек. Рупар. Гяур. Аул. Зуб. Док. Спас. Лава. Варыва. Ганчар. Мат. Золата. Валынка. Бал. Каралева.

---

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.25 | 16.48 | 7.23 |
| Віцебск — | 9.23 | 16.30 | 7.07 |
| Магілёў — | 9.15 | 16.38 | 7.23 |
| Гомель — | 9.03 | 16.43 | 7.40 |
| Гродна — | 9.39 | 17.05 | 7.26 |
| Брэст — | 9.31 | 17.14 | 7.43 |

**Месяц**

***Першая квадра 20 снежня. Месяц у сузор'і Рыб.***

**Імяніны**

***Пр.*** *МІКАЛАЯ ЦУДАТВОРЦЫ.* ***К.*** *Дар'і, Элеаноры, Габрыеля, Рыгора, Урбана.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ЗАЎТРА





### УСМІХНЕМСЯ

Я заўсёды станаўлюся на вагі з катом. Незалежна ад выніку, кот — «пражэрлівая скаціна», а я — «малайчына!»

**З тэлерэкламы:**

**«Ведаеце, учора я пайшла з сяброўкай у «Снежную Каралеву» і ўбачыла там такую ж куртку, якую нядаўна купіла ў буціку, але толькі ў два разы таннейшую, і вельмі знервавалася. А сёння мы з сяброўкай зайшлі на в'етнамскі рынак, і пасля гэтага я ледзь не павесілася».**

Жонка:

— Дарагі, я памыла твой пухавік. Цяпер у цябе ёсць цудоўная вятроўка!






ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by,

(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by



Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.



Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 26.325. Індэкс 63850. Зак. № 5796.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 18 снежня 2012 года.